МАРЦІН ЭГЛЕ
ЛЕНЭ МАЕР-СКУМАНЦ

ГУТАРКІ ПРА ВЕРУ



МЕНСК

ЛЕНЭ МАЕР-СКУМАНЦ *** МАРЦІН ЭГЛЕ

ГУТАРКІ ПРА ВЕРУ

БКГ

Пераклад з выданьня:
Martin Jäggle, Lene Mayer-Skumanz. Mit Kindern über den Glauben reden.
Innsbruck, Wien: Tyrolia-Verl., 1994.

Кніга выдадзена пры дапамозе
Herz–Jesu–Missionare, Salzburg.

ISBN 985-6340-01-4

© Tyrolia, Innsbruck, 1994
© БКГ, 1997

ЛЕНЭ МАЕР-СКУМАНЦ *** МАРЦІН ЭГЛЕ

ГУТАРКІ ПРА ВЕРУ

Пераклала з нямецкай Ірэна Пашкевіч

БКГ
Менск
1997

Зьмест

Рэлігійнае выхаваньне ў штодзённым жыцьці 5

Я абаронены – першасны і падставовы давер 9
– Якаб пераадольвае страх перад цемрай 12
– Якаб бачыць страшыдлу 15
– Якаб адчувае сябе зусім як дома 19
– Якаб хоча быць суцешаным 22
– Якаб складае малітву 26

Я цешуся – станоўчае ўспрыманьне жыцьця 30
– Якаб і вазон з клапоўнікам 32
– Свята прыгалубліваньня 37
– Якаб дапамагае Божачку 41
– Якаб мае кветку 45
– Якаб моліцца 49

Я люблю цябе – сацыяльныя пачуцьці 53
– Якаб робіць гэта задарма 55
– Якаб ня хоча быць прагным 59
– Якаб і брудная праца 64
– Якаб грае ролю сьвятога Марціна 69
– Якаб раўнуе 73
– Бубен для Божачкі 77

Я ўмею гэта рабіць – кампетэнтны вопыт 80
– Элізабэт адважваецца 83
– Якаб-міратворца 86
– Якаб можа далёка пайсьці 90
– Каці не паддаецца дрэсіроўцы 94
– Якаб набіраецца сьмеласьці 98

Заўтра я зноў пайду яго шукаць – Бог у нашым жыцьці .. 103
– Якаб чакае Божага Нараджэньня 106
– Звон 108
– Якаб шукае Божачку 111

Рэлігійнае выхаваньне ў штодзённым жыцьці

Раней рэлігійнае выхаваньне здавалася самай простай справай у сьвеце: дзіця расло і сталела разам з цьвёрда ўсталяванымі звычаямі. Ранішняя, вячэрняя малітва і малітвы за сталом вызначалі штодзённы расклад большасьці сялянскіх сем'яў, нядзельная служба ня ставілася пад пытаньне, і мноства царкоўных сьвятаў год за годам суправаджалі жыцьцё чалавека. На ўсе пытаньні дзяцей, як падавалася, меліся ясныя, бясспрэчныя адказы, якія абмяркоўваліся на ўроках рэлігіі і завучваліся напамяць.

Сёньня на штодзённы расклад сям'і больш не накладаюць свайго адбітку працоўны рытм і будні сялянскай сядзібы, якія раней зьяўляліся вызначальнымі для ўсіх хатніх. Разам з тым, члены сям'і ўсё меньш дзеляцца паміж сабою жыцьцёвым вопытам. Дзеці наогул аказаліся выключанымі з жыцьцёва важных сфераў, такіх як працоўны сьвет, грамадства і ня маюць аніякага ўяўленьня пра чалавечыя надзвычайныя сітуацыі, такія, як нараджэньне, цяжкая хвароба і сьмерць. Грамадская сітуацыя, умовы жыцьця і формы жыцьця вельмі грунтоўна зьмяніліся. Таму паўстае пытаньне, як, беручы пад увагу абставіны такога роду, можна перадаць веру далей.

Дыскусія па гэтым пытаньні прывяла да асэнсаваньня асноўных палажэньняў. Веру нельга перадаць наступнікам так, як добра наладаваны пляцак, які потым, напэўна, будзе ўспрымацца як цяжар, а не як ноша, поўная запасаў і ведаў. Вера – гэта нешта жывое, не схаванае само ў сабе. Яна заўсёды мае адбітак жыцьця і вопыту верніка.

Такім чынам, бацькі павінныя падштурхнуць сваё дзіця да ўспрыманьня веры. Яны могуць арганізаваць рэлігійнае выхаваньне дзяцей толькі як «запрашэньне да веры». Не

адмысловае навучаньне, а «вопыт пачуццяў сумеснага жыцьця» зьяўляецца вырашальным для развіцьця рэлігійнасьці дзіцяці. Рэлігійнае выхаваньне адбываецца напачатку ня там, дзе вядуцца размовы выключна пра Бога альбо Ісуса. Падставаю «запрашэньня да веры» зьяўляюцца будні, штодзённае сумеснае жыцьцё.

У гэтае штодзённае жыцьцё ўваходзяць ня толькі прачынаньне, сьнеданьне, адыход, сон, прыбіраньне кватэры, гульні, ды іншыя звычайныя жыцьцёвыя сітуацыі, але таксама незапланаваныя і нечаканыя здарэньні, якія вызначаюць штодзённае жыцьцё, як, напрыклад, канфлікт дзяцей, нечаканая ідэя дзіцяці, якая ня вельмі добра ўспрымаецца дарослымі, прыход гасьцей... У гэтых штодзённых сітуацыях і зьменлівых падзеях паўсядзённага жыцьця дзіця вучыцца жыць, вучыцца таму, што зьяўляецца слушным, а што – не. Дзіця бярэ ўдзел у жыцьці дарослых, а дарослыя дзеляцца з дзецьмі тым, што складае сутнасьць іхняга жыцьця. У сувязі з падзеямі штодзённага жыцьця, дзіця задае тады свае пытаньні, найважнейшае сярод якіх пытаньне: «Чаму?».

З дапамогаю бацькоў і настаўнікаў яно вызначае сваё сьветаўспрыманьне і акрэсьлівае свой сьветапогляд. Асноўныя палажэньні, якія вызначаюць адносіны да жыцьця, тое, пра што думаюць бацькі, на што спадзяюцца, чаго чакаюць ад будучыні, дзіця спасьцігае ў штодзённых зносінах. У апавяданьнях, адказах на дзіцячыя пытаньні бацькі даюць уяўленьне дзецям пра сваё жыцьцё і самі робяць выснову, якое значэньне мае Бог для дзіцяці, і як важна гэта самому Богу. І, трэба сказаць, дзіця мае права на тое, каб бацькі распавялі пра тое, што і хто стварае сутнасьць іхняга жыцьця.

Многія з бацькоў не прызвычаеныя расказваць пра тое, у што яны вераць. Яны самі павінны спачатку гэтаму навучыцца. І тут выяўляецца значэньне маленькіх групаў і суполак, у якіх дарослыя разам абмяркоўваюць жыцьцёвыя

пытаньні, пытаньні веры і нават разам займаюцца арганізацыяй жыцьця на падставах веры. Выхавальнік не павінен ведаць адказы на ўсе дзіцячыя пытаньні, такія як, напрыклад: «Дзе жыве Бог?», на якія ён можа адказаць толькі: «Ня ведаю». Вырашальным зьяўляецца не закрытае пытанне, а распачатая пытаньнем дзіцяці размова, размова – што трэба было б пажадаць дзецям, дарослым, а таксама выхавальнікам – якая б не прыпынілася на працягу ўсяго жыцьця.

Пазіцыя выхавальнікаў абуджае ў дзіцяці таксама і спадзяваньні ў стасунку да Бога. Бацькі, якія строга кантралююць сваё дзіця і паўсюдна назіраюць за ім, даюць дзіцяці падставы ўяляць Бога як няспынную кантралюючую інстанцыю. Гэта адбываецца не аўтаматычна, але ёсьць сувязь паміж адносінамі выхавальнікаў і ўяўленьнем дзіцяці пра Бога. Таму бацькам ня трэба быць занадта патрабавальнымі, і яны павінныя чуйна ставіцца да таго, як адбіваюцца іхнія адносіны на дзецях. Шчыра кажучы, самі бацькі часам не адпавядаюць сваім уласным патрабаваньням. Ёсьць сітуацыі, калі яны даюць ня самы лепшы прыклад. Для дзяцей было б важна пачуць ад саміх дарослых, што пункт погляду бацькоў – гэта яшчэ ня мера ўсіх рэчаў, і што яны, бацькі, – гэта не беззаганныя сьвятыя.

Апошнім часам усё больш прызнаецца значэньне здольнасьцяў да самаканцэнтраваньня, медытацыі у фармаваньні сталай рэлігійнасьці. Бернхард Гром лічыць нават, што да пачатку размоваў з дзецьмі пра Бога, яны павінныя ўмець «паглыбляцца ў сябе». Здольнасьць да назапашваньня вопыту ўнутраных пачуцьцяў дае дзіцяці магчымасьць разумець гутаркі пра Бога ў суадносінах да свайго ўласнага жыцьцёвага вопыту. Тады Бог будзе не прадметам альбо звышчалавекам, які знаходзіцца невядома дзе, а будзе жыцьцёвай рэчаіснасьцю, з якой мы сыходзім, якая нас падтрымлівае, якою мы прасякнутыя.

Практыкаваньні на развіцьцё ўяўленьня («Што робіць мама ў іншым пакоі?»), практыкаваньні маўчаньня, практыкаваньні на ўспрыманьне адчуваньняў («Чуць гук вельмі-вельмі доўга») прызначаныя для развіцьця здольнасьці дзіцяці да самаканцэнтраваньня і стварэньня ўмоваў дзеля назапашваньня ўнутранага вопыту.

Штуршком для напісаньня мною гэтай кнігі быў дзіцячы тэлевізійны серыял «Якаб і Элізабэт» Аўстрыйскага Радыё, сцэнар да якога напісала Ленэ Маер-Скуманц. Вядомая дзіцячая аўтарка прадставіла ў маё карыстаньне 24 дыялогі, і на іхняй падставе я стварыў гэтую кнігу. Яна павінна стаць адказам на пытаньне, як можна пазнаёміць 4-7-гадовых дзяцей з рэлігійным тлумачэньнем сэнсу іхняга жыцьця, з асноўнымі каштоўнасьцямі хрысьціянства і стасункамі паміж людзьмі на падставах веры.

Асобныя дыялогі падштурхоўваюць да гульняў і размоваў. Яны прыдатныя, напрыклад, для гульні ў лялечны тэатр на пальцах, падчас якой выхавальніца дзіцячага садка ці настаўніца альбо мама агучыць дыялог. Напрыклад, паміж Якабам (лялька на правым указальным пальцы) з Каці (лялька на левым безыменным пальцы) і татам (лялька на левым вялікім пальцы) з Элізабэт (лялька на правым безыменным пальцы) – трэба толькі папярэдне адпаведна намаляваць твары лялек. Вядома, можна скарыстаць магнітафон (на які можна запісаць тэкст з разьмеркаванымі ролямі) ці проста распавесьці яго як звычайную гісторыю...

Таксама можна расказаць дзецям толькі пачатак дыялогаў і дазволіць, каб яны самі дагулялі іх да канца, памяняліся ролямі, уносілі зьмены ў зьмест і гэтак далей. Пры гэтым важна, каб размовы з дзецьмі вяліся ў духу веры!

Марцін Эгле
Martin Jdggle

Я абаронены
Першасны і падставовы давер

Найважнейшаю высноваю, якую атрымлівае дзіця, і наогул, умовай для таго, каб жыць, зьяўляецца выснова абароненасьці, магчымасьць давярацца і пакладацца на кагонебудзь. Напрыклад, выснова пра тое, што мама мяне вельмі любіць, што яна вельмі добра да мяне ставіцца. Гэты падставовы давер у адносінах да сьвету, жыцьця, бацькоў і сябе самога выбудоўваецца ўжо на першым годзе жыцьця. Дасьледваньні сьведчаць, што дзеці, у якіх гэты падставовы давер не разьвіваецца, хварэюць і могуць заўчасна памерці. Калі ж падставовы давер разьвіваецца ў недастатковай ступені, дык пачынаецца значная дэфармацыя асобы і паводзінаў дзіцяці, а пазьней дарослага. Падставовы давер будуецца і ўзмацняецца дзякуючы трываласьці адносінаў, у якіх расьце дзіця, дзякуючы таму, «што мяне прымаюць і мае дзеяньні ўхваляюць».

Важным сродкам узмацненьня вопыту таго «што мяне прымаюць» і пачуцьця ўласнай годнасьці зьяўляюцца гісторыі, перш за ўсё казкі. Пэўны час распавяданьне казак асуджалася, бо лічылася, што яны занадта жахлівыя. Між тым, вядома, што казкі драматызуюць толькі тое, што драматычна адбываецца ў саміх дзецях. Часта дзеці хочуць яшчэ раз пачуць тую ці іншую казку, нават калі яны ведаюць яе напамяць. Відавочна, што ў дадзеным выпадку менавіта гэтая казка перажываецца дзецьмі як найбольш карысная ў іхняй сітуацыі, і што з дапамогаю казкі яны могуць пераадолець крызісную сітуацыю панічнага страху і паверыць у тое, што самыя жахлівыя выпадкі маюць добры канец. Казкі даюць ім перакананьне ў тым, што страх, пачуцьцё небясьпекі, цемра – гэта яшчэ ня самая жахлівая рэч у жыцьці. З дапамогаю казкі яны могуць перанесьціся

ў цёмны лес і, узбагачаныя новымі пачуццямі, вярнуцца з вялікімі скарбамі.

Падставовы давер, вера ў тое, што «я магу спадзявацца», зьяўляецца вырашальнай умоваю для здольнасьці дзіцяці наладжваць стасункі з іншымі, любіць іншых людзей, вучыцца адрозьніваць слушныя паводзіны ад няслушных, што ў выніку зьяўляецца вырашальным для станаўленьня рэлігійнасьці дзяцей, а пазьней дарослых. Пры гэтым ня трэба атаясамліваць выснову абароненасьці з высновай «быць любімым у Бога». Выснову надзейнасьці бацькоў і сьвету патрэбна паглыбіць да даверу да Бога. Пры гэтым вырашальнай умовай зьяўляецца тое, што размовы пра Бога вядуцца не дзеля нейкіх крытычных сітуацый, якія адбыліся паміж дарослымі і дзецьмі. Рэлігійны педагог Бэрнхард Гром лічыць, што дзіця павінна пачуць пра абароненасьць разам з Богам спачатку выключна ў сувязі з яго станоўчым жыцьцёвым вопытам (я цешуся), з яго першымі імкненьнямі да самаадданасьці (я люблю цябе).

І толькі тады, калі дзеці зразумеюць, што чым больш мы, людзі, будзем станоўча адносіцца да іншых, тым больш надзейнымі стануць нашыя адносіны, і пачуцьцё абароненасьці, якое даецца Богам, будзе разумецца як стан, пачуцьцё таго, што «да мяне добра ставяцца», а ня толькі як пачуцьцё што «я абаронены».

Калі бацькі альбо выхавальнікі лічаць, што ўжо прыйшоў час пачаць размову пра абароненасьць разам з Богам, можна было б скарыстаць прыклад ці гульню, якія дапамагаюць уявіць сабе магчымасьці пераадоленьня страху ці крытычных сітуацый. Як прапаноўвае Бэрнхард Гром, бацькі альбо выхавальнікі ў межах размовы пра пережытыя пачуцьці страху, смутку, страты мужнасьці могуць абгрунтаваць сваю рэлігійна матываваную «мужнасьць насуперак усяму» у наступнай форме: «Я (выхавальнік) таксама часам

баяўся, што са мною здарыцца нешта кепскае (няўдача, страта, хвароба, сьмерць). Тады я падумаў, што я магу зрабіць супраць усяго гэтага і хто мне можа дапамагчы. Потым я прашу таксама Бога: «Дай мне мужнасьць, каб я мог змагацца з усіх сваіх сілаў, і дай мне таксама добрых людзей, якія мне дапамогуць, таму што Ты любіш мяне і тады, калі як ад чалавека ад мяне ня вельмі шмат што залежыць, і тады, калі мне дрэнна, нават калі я павінен памерці. Зрабі, каб я ніколі не забываў гэтага, калі я сумны і прыгнечаны.» У дзіцячай групе садка гэтыя словы можна было б сімвалічна паглыбіць, сказаць, «што Бог трымае нас заўсёды, мацней і надзейней, чым мы самі гэта маглі б зрабіць» і прапанаваць дзецям зрабіць наступнае: у цесным коле, пакласьці рукі на плечы суседзяў і паспрабаваць, ці лёгка можна ўпасьці. Тады можна было б сказаць: «Так, як мы надзейна трымалі адно другога, так хоча заўсёды трымаць нас Бог, і калі мы ў смутку, і нават тады, калі аднойчы мы будзем павінныя памерці.»

Якаб пераадольвае страх перад цемрай

(Якаб у дзіцячым пакоі, ён гуляе ў заапарк. Ужо вечар, гарыць лямпа. Тата заглядвае ў дзьверы.)

Якаб: (гуляе ў заапарк) уа, уа, уа, пачакай, пачакай, леў, зараз і ты таксама атрымаеш што-небудзь. Цяпер на чарзе мядзьведзі. Брумм, брумм, брумм.

Тата: Якаб, мама сказала, што праз пяць хвілінаў будзе згатаваная вячэра. Каўбаскі, засмажаныя ў грылі. Пачынай ужо прыбіраць свае рэчы.

Якаб: Я вартаўнік у заапарку. Трэба пакарміць усіх зьвяроў.

Тата: Тады пасьпяшайся, каб кожны што-небудзь атрымаў. А потым прыбяры. Гэта ж цэлы заапарк. Ты сам усё прыбярэш, ці табе дапамагчы?

Якаб: Я паскладаю толькі зьвяроў. Вальера хай стаіць.

Тата: Вальеру можаш пасунуць, каб ніхто на яе не наступіў. (Сьвятло гасьне, праз вакно прабіваецца толькі цьмяны водсьвет). А-ёй, замыканьне.

Якаб: Што здарылася!

Тата: Кароткае замыканьне. Зноў паўтараецца. Таму што мама заўсёды ўключае ўсе прыборы разам: грыль, і пральную машыну, і міксер, і гэтак далей. Чакай, зараз усё будзе ў парадку.
(Адыходзіць)

Якаб: Тата, застанься, застанься, калі ласка! Ён пакінуў мяне сядзець у цемры. Мама, мама! Яны ж ведаюць, што я не люблю сядзець у цемры. Мама-аааа!

Мама: (уваходзіць, бачны толькі яе невыразны абрыс) Хутка зноў будзе сьвятло, Якаб. Тата ужо пайшоў глядзець. – Ты спалохаўся, так?

Якаб: Не-так – хачу, каб зноў было сьвятло!

Мама: Я запаліла на кухні сьвечку. Хадзем да мяне на кухню.
Якаб: Не, я ня згодны. Я нічога ня бачу. Я падушу зьвяроў.
Мама: Што падушыш?
Якаб: Зьвяроў. Тут на падлозе паўсюль мае ільвы, мядзьведзі і тыгры.
Мама: Тады пралезь да мяне па канапе, я падам табе руку.
Якаб: Ай, я трапіў у нешта жахлівае, у нешта склізкае.
Мама: Напэўна, у яблычныя лупіны, якія ты паўсюль раскідаеш?
Якаб: Не-так – я ня ведаю. Няхай тата пасьпяшаецца. Я заўсёды так баюся ў цемры.
Мама: Я ведаю, Якаб, таму я адразу і прыйшла. Але цяпер ты можаш не баяцца, цяпер я з табою.
Якаб: Падыйдзі бліжэй.
Мама: Вось, трымай маю руку. Так. А цяпер скокні як найдалей, як можаш. Вось бачыш. (Яна абдымае яго і сядае разам з ім на край канапы) Ты усё яшчэ баішся?
Якаб: Я ня бачу дзе што...
Мама: Паспрабуй дакрануцца пальцамі.
Якаб: (дакранаецца) Гэта твае валасы.
Мама: Мм.
Якаб: А гэта твой твар. Нос, шчокі, рот. Цяпер я магу цябе пацалаваць. Вось. А гэта твае пацеркі.
Мама: Асьцярожна з пацеркамі, Якаб.
Якаб: Твая сукенка шамаціць. Дзіўна, я ніколі ня чуў, як яна шамаціць.
Мама: У цемры ўсе настаўляюць вушы.
Якаб: А гэта што? Тут, на канапе?
Мама: Гэта? Дай мне памацаць. Напэўна, гэта флейта Элізабэт.
Якаб: Так, яна таксама ўсё паўсюль раскідае. А гэта што?
Мама: Шамаціць, так? Што б гэта магло быць?

Якаб: Дзёньнік Элізабэт. Я пазнаў яго па загнутых старонках.

Мама: Вось, а цяпер хадзем да дзьвярэй, толькі пару крокаў, хадзем!

(Яны ідуць, зноў запальваецца лямпа, Якаб трымаецца за маму і абдымае яе)

Якаб: Аааааа!

Тата: (уваходзіць у дзьверы) Усё зноў у парадку! Што, Якаб, было страшна ў цемры? Ты вытрымаў?

Якаб: Так, таму... таму што мама была са мною.

Якаб пераадольвае страх перад цемрай

Усе дзеці чаго-небудзь баяцца, але, напэўна, больш за ўсё – цемры. У цемры яны застаюцца сам на сам з сабою, усё здаецца пагрозьліва-небясьпечным і зусім іншым. Нікога няма побач. Як жахліва павінна быць дзяўчынцы ці хлопчыку, калі ён нават ня мае права баяцца, «таму што ён павінен быць мужчынам», «таму што ён павінен вытрымаць», «таму што гэта ня так ужо і жахліва». Ён застаецца тады адзін, зусім адзін са сваім жахам. У гэтым выпадку ён ня можа пераадолець свой страх, а павінен толькі выцясьняць яго, ня думаць пра яго і, такім чынам, пазбаўляецца шанцаў стаць сталейшым, што дае кожная пераадоленая сітуацыя страху.

Якаб таксама баіцца, таму што ўсё раптам у адну хвіліну пачынае выклікаць страх, як, напрыклад, звычайныя яблычныя лупіны, якія пераўтвараюцца ў нешта жахлівае. У рэшце рэшт, Якаб вытрымаў, «таму што мама была побач са мною». Блізкасьць значнага для дзяцяці чалавека дапамагае яму пераадолець свой страх. Цемра не здаецца тады такой небясьпечнай. Пры гэтым мама магла б таксама расказаць пра сваю ўласную няўпэўненасьць, пра тое, як яна сама

спрабавала пераадолець свае страхі. Тую ж самую функцыю вельмі часта выконваюць брат альбо сястра. У «падабенстве» іх сітуацый часам нават больш магчымасьцяў разам перажыць сітуацыю страху і дапамагчы яе пераадолець, даць пачуцьцё абароненасьці і бясьпекі.

Цемра, якая перажываецца ў прысутнасьці чалавека, які дае дзіцяці пачуцьцё абароненасьці і бясьпекі, можа даць зусім новыя ўражаньні і дапамагчы такім чынам вытрымаць і выстаяць, ня гледзячы ні на што. У цемры ўсё ня толькі здаецца небясьпечна іншым, але таксама аказваецца нечакана іншым, не такім як у звычайным жыцьці.

У цемры Якаб адкрывае для сябе шмат таго, чаго раней ня чуў і не заўважаў. «У цемры ўсе настаўляюць вушы». У цемры яму таксама дапамагаюць пальцы – адно адчуць, іншае знайсьці. Дзякуючы пачуцьцю абароненасьці і бясьпекі і блізкасьці маці, Якаб можа пераадолець страх і паглядзець цемры ў вочы.

У сувязі з гэтым, варта нагадаць гісторыю вучняў Хрыста ў буру, калі яны апынуліся ў цемры, пасярод высокіх хваляў, і калі яны разбудзілі Хрыста, які спаў. І ўрэшце праз пачуцьцё жывой сувязі яны даведаліся: Бог побач з імі. І страх, і бура сьцішыліся.

Якаб бачыць страшыдлу

(Дзіцячы пакой. Вечар, каля ложка Элізабэт гарыць маленькая лампа. Яна чытае кнігу. Якаб скурчыўся і ляжыць на сваім ложку.)

Якаб: (з боязьзю ў голасе) Гэй, Элізабэт!
Элізабэт: Не перашкаджай, як раз самы цікавы момант.
Якаб: Але я так баюся.
Элізабэт: Што здарылася?

Якаб: Я баюся. Там за шторaю стаіць страшыдла.

Элізабэт: Дзе? Адчапіся, Якаб!

Якаб: Яна увесь час выглядае з-за зборак шторaў.

Элізабэт: Я нічога ня бачу.

Якаб: Радуйся, што нічога ня бачыш. Яна мае два доўгіх языкі. Адным ліжа направа, другім налева. У-ууууу!

Элізабэт: Гэта ты ўсё выдумаў.

Якаб: Але яна такая жахлівая, гэтая страшыдла. Яна раз-пораз паглядае на мяне. І мамы і таты няма.

Элізабэт: Яны толькі на хвілінку адыйшліся да пана Хубера пакаштаваць ягоны яблычны штрудэль*. Яшчэ ж зусім ня позна. Але калі ты хочаш, можаш распрануцца і класьціся спаць. Я сяду ў гасьцёўні, калі табе перашкаджае сьвятло.

Якаб: Уа-ааа, але ты не пакінеш мяне аднаго з гэтай страшыдлай – цяпер яна пачынае расьці, мне здаецца – яна становіцца ўсё большай і большай!

Элізабэт: У гэтым пакоі зусім няма месца, каб магла зьмясьціцца вялікая страшыдла.

Якаб: Я не разумею... як Божачка дазваляе... што на сьвеце ёсьць такія страшыдлы...

Элізабэт: Калі ты выдумляеш сабе страшыдлу, дык ты сам вінаваты. Прыдумай што-небудзь лепшае.

Якаб: Не магу, бо тут страшыдла.

Элізабэт: Тады выдумай сабе яшчэ большую страшыдлу, яна павінна праглынуць першую.

Якаб: Ты думаеш? Уа-ааа, другая страшыдла яшчэ больш жахлівая за першую. Яна шморгае носам. Ты ня чуеш?

Элізабэт: Не!

---

* яблычны пірог

Якаб: Цешся, што ты гэтага ня чуеш. Цяпер яна мяне ўчуяла, гэтая страшыдла. Цяпер яна глядзіць сюды. Уа-ааа!

Элізабэт: Яна зьнюхала першую страшыдлу і зьела яе. Праўда?

Якаб: Так, але яна ўсё яшчэ галодная.

Элізабэт: Прыдумай сабе трэцюю страшыдлу, яна павінна зьесьці другую.

Якаб: Яна павінна была б быць большай за наш дом, з такою пашчаю. Хто зьесць такую вялікую страшыдлу? Уа-аа, Элізабэт, я баюся.

Элізабэт: Хадзі сюды да мяне, Якаб, хадзі да мяне.(Якаб ідзе і туліцца да яе)

Элізабэт: Дзе яна стаіць цяпер, гэтая другая страшыдла?

Якаб: Там, у куце.

Элізабэт: Глядзі, цяпер мы наварожым, каб яна зьнікла.

Якаб: Куды?

Элізабэт: У маленькую-маленькую хатку сьлімака, такую ракавінку, якая ёсьць у нашым садку:

Гэй ты, глыба,
зрабіся меньшай за сьлімака,
Якаб цябе выдумаў,
ён цябе перадумаў!

Якаб: Як? Ах – яе ўжо няма!

Элізабэт: Вось бачыш.

Якаб: Яна цяпер у хатцы сьлімака?

Элізабэт: Мабыць так.

Якаб: А страшыдла, якая жыве ў хатцы сьлімака, гэта ўжо вясёлая страшыдла. Я павінен расказаць пра гэта заўтра Каці. А што яна есьць, такая маленькая страшыдла?

Элізабэт: Яна зьлізвае салодкі сок з кветачак канюшыны.

Якаб: Спадзяюся, што яна знойдзе яго. (Курчыцца каля Элізабэт і засынае).

Элізабэт: Вось яшчэ, цяпер ён сьпіць на маім ложку. (Яна гладзіць яго, потым гасіць сьвятло)

Якаб бачыць страшыдлу

Страх – гэта неабходная зьява ў працэсе сталасьці. Калі дзіця вельмі баіцца, дык тады і прыходзяць страшыдлы. Можа гэта толькі цень ад сьвятла ў вельмі цёмным пакоі. Як моцна могуць зьмяняцца рэчы ў цемры, ведаюць і дарослыя, калі ідуць праз цёмны лес. Магчыма, страшыдлы – гэта рэшткі дня, таго, што недзе было ўбачана ці пачута. Цяпер усё гэта тут побач. Такое сапраўднае і такое жахлівае. Дзіцячая фантазія дапамагае Якабу дамаляваць гэта яшчэ больш выразна. Ён адчувае сябе разам са сваім страхам усімі пакінутым і самотным.

Элізабэт магла б падштурхнуць бацькоў да «гульні ў зьнішчэньне страшыдлы», ці самі бацькі маглі б расказаць Якабу гісторыю пра зьнішчэньне страшыдлы. Тым самым яны б не адмаўляліся паверыць усім ягоным страхам, а дапамаглі б яму набрацца мужнасьці пераадолець іх. Менавіта пры апавяданьні выдуманай гісторыі і падчас гульні спадае напружаньне, якое ахоплівае дзяцей. Яны могуць зноў перавесьці дух, глыбока ўздыхнуць і заснуць, адчуваючы сябе пазбаўленымі ўсіх страхаў.

Пра тое, як моцна скіраваны наш тэхнічны і спажывецка-цывілізаваны сьвет на ўсё відочнае і рэальна-адчувальнае, на тое, што можна праверыць і, гэта значыць, толькі на павярхоўнае, наяўна-асэнсавальнае, і як моцна ўсё гэта забівае фантазію людзей, сьведчыць ашаламляльны для многіх посьпех фантастычных гісторый. Голад на фантазію ўвесь час ўзрастае. Пра гэта сьведчыць водгук на «Бяскон-

цыя гісторыі» Міхаэля Эндэ. Фантазія можа стаць «трэцім вокам», адначасовым «праніклівым позіркам», які бачыць больш, бачыць усярэдзіне. Яна дапамагае ўсьвядоміць, што ўсё павярхоўнае, яўнае і бачнае – гэта яшчэ ня ўся рэчаіснасьць. Яна можа быць таксама дапамогай ва ўспрыманьні звышнатуральнай, духоўнай рэчаіснасьці Бога. Але сам па сабе Бог не павінен быць прадметам фантазій, дзіця павіннае натхняцца да развагаў, і гэта значыць: да ўстанаўленьня асабістых кантактаў з Богам.

Якаб адчувае сябе зусім як дома

(Каля дому. Бацька сядзіць на лаве з газетай. З саду чуецца грукат малатка. Тата некалькі разоў уздрыгвае.)

Тата: Немагчыма знайсьці сапраўдны спакой, калі прыходзіш дамоў.

Голас Якаба: Тата, хадзі сюды, патрымай мне гэта, калі ласка!

Тата: (уздыхаючы, ідзе налева. Відаць, як Якаб працуе над вялікай будаю для сабакі.)

Якаб: Як табе падабаецца мая сабачая буда?

Тата: (Трымае дах, Якаб б'е малатком.) Божа мой, мы што зьбіраемся завесьці бернардынскага сабаку?

Якаб: Не, не, наогул аніякага сабакі. Гэта толькі візітная буда для Флёкі, калі ён будзе прыходзіць разам з Каці ў госьці. Для таго, каб ён адчуваў сябе як дома.

Тата: Тады я супакоены.

Якаб: Больш таго, гэтая буда дастаткова вялікая, каб Каці і я маглі сядзець там усярэдзіне, калі ідзе дождж. Ці калі мы маем сакрэты. І наогул.

Тата: Так, так.

Якаб: Каці ахвотна прыходзіць да нас і добра адчувае сябе

ў нас. Ёй амаль што лепей, чым у сваіх бацькоў, таму што яны часта сварацца.

Тата: Няўжо?

Якаб: Каці кажа, што адчувае сябе ў нас лепей чым дома, у нас утульней. Каці можа прыходзіць да нас калі захоча, праўда?

Тата: Мне ўсё роўна, калі яна захоча – і калі яе бацькі дазваляюць.

Якаб: Цікава, у мяне больш месцаў, дзе я адчуваю сябе як дома, чым у Каці. Я падлічыў: у нашым доме, у садзе, у бабулі, у гэтай будзе і ў Каці. Часам нават у лесе, калі я ведаю, што вы недзе паблізу. А ты, дзе ты адчуваеш сябе як дома?

Тата: Гм. Хучэй за ўсе там, дзе мама. Так. Паўсюль там, дзе мама.

Якаб: Усё роўна дзе?

Тата: Там, дзе маме падабаецца, дзе ёй добра, там і мне падабаецца, і я адчуваю сябе як дома. Таму што мы любім адно другога.

Якаб: А што рабіць тым, каму няма каго любіць? Дзе яны адчуваюць сябе як дома?

Тата: Гм. Ня ведаю.

Якаб: З Божачкам, так? Ён жа ўсіх любіць аднолькава.

Тата: Разам з Божачкам, так, там кожны павінен адчуваць сябе як дома.

Якаб: Тады, тады ў іх таксама нехта ёсьць.

Тата: Аднак Божачка не павінен быць для нас супакаеннем, каб мы не клапаціліся пра іншых, хто нідзе не адчувае сябе як дома. Наадварот. Бог хоча, каб мы дапамагалі ўсім людзям, каб яны адчувалі сябе на зямлі хоць трохі як дома. Але (уздых) яшчэ трэба шмат чаго зрабіць, калі мы прыйдзем да таго, што кожны будзе мець такі куточак.

Якаб: Так, для Флёкі і для Каці ў нас ёсьць прыгожы куточак для візітаў. (Тата адыходзіць. Зьлева падыходзіць Каці з Флёкі.)

Каці: Прывітаньне, Якаб! Апоўдні я ўвесь час чую, як ты грукаеш малатком.

Флёкі: Брэх! (Уваходзіць у буду)

Якаб: Флёкі, ты такі разумны сабака!

Каці: Так, буда добрая. І такая вялікая. Аж занадта вялікая для ***аднаго*** Флёкі.

Якаб: Мне здаецца, хапае месца для нас траіх. (Яны залазяць усярэдзіну)

Якаб: Флёкі, як ты сябе тут адчуваеш?

Флёкі: Брэх!

Якаб: А ты, Каці?

Каці: Добра. Як дома. Лепей чым дома. Вельмі-вельмі добра.

Якаб: Я ведаю чаму!

Каці: Ну і чаму ж?

Якаб: Таму што я цябе люблю. (Яна глядзіць на яго)

Якаб адчувае сябе зусім як дома

«Тут я прыняты, тут у мяне ёсьць сваё месца, тут я магу жыць і ствараць сваё жыцьцё, тут я адчуваю сябе абароненым, тут мяне ўхваляюць, тут маё месца». Гэта той асноватворны вопыт, які дазваляе дзіцяці адчуваць сябе як дома. Вопыт адчуваньня сябе як дома трымаецца на вопыце надзейных, стабільных адносінаў. Якаб адчувае сябе як дома не таму, што баіцца сьвету, не таму, што кватэра абстаўлена так утульна. Ня першаснае паняцьце жыльля («сабачая буда»), а асабістыя адносіны («Таму што я цябе люблю») зьяўляюцца вызначальнымі для вопыту адчуваньня сябе «як-дома». Разам з тым не павінна недаацэньвацца значэнь-

не добраўпарадкаваньня жыльля, якое адпавядае асаблівасьцям дзяцей, жыльля, якое можа перайначвацца дзецьмі. Якаб будуе сабачую буду, і праз гэта дэманструе, як пачуцьцё адчуваньня сябе як дома падштурхоўвае і заахвочвае да ўладкаваньня сьвету. Падставовы давер і пачуцьцё ўласнай годнасьці адначасова зьяўляюцца той глебай, на якой разьвіваецца ўсё найлепшае. Адчуваньне сябе «як дома», пачуцьцё таго, што цябе прыймаюць – усё гэта дае сям'я і шчырасьць, адкрытасьць міжасабовых адносінаў.

Размовы пра Бога, аднак, не павінны стаць падменай гэтых пачуцьцяў міжчалавечай абароненасьці і бясьпекі. Размовы пра Бога, сумесна з якім мы ўсе адчуваем сябе абароненымі, могуць узмацніць нашую веру і заахвоціць нас да прыязных адносінаў з іншымі.

Бацькі павінны пачынаць гаварыць пра абароненасьць разам з Богам толькі тады, калі дзіця мае пэўны вопыт унутраных перажываньняў. Інакш існуе небясьпека, што дзіця атаясамлівае цялесную бясьпеку з пачуцьцём абароненасьці: «Са мною нічога ня здарыцца».

Размовы пра абароненасьць разам з Богам павінны весьціся ў сямейнай атмасферы, якая дае дзіцяці цяпло сямейнага кута, і падмацоўвацца адносінамі бацькоў, якія даюць дзіцяці ўпэўненасьць, што яно «можа ім даверыцца». Кожнае дзіця павінна атрымліваць увагу бацькоў не дзякуючы пэўным посьпехам і якасьцям – яно атрымлівае ўвагу дзеля яго самога, і таму ніколі не павінна баяцца за яе.

Якаб хоча быць сущешаным

(Дзіцячы пакой. Мама складае бялізну альбо сьцеле ложак. Уваходзіць Якаб і прытуляецца да яе.)

Мама: Так, дзіцятка, што яшчэ?

Якаб: Мама.

Мама: (падбадзёрвае) Што, Якаб?

Якаб: Я бачыў у кнізе па рэлігіі Элізабэт – я бачыў такі сумны малюнак – Божай Маці.

Мама: Што ж было на тым сумным малюнку?

Якаб: Марыя – яна плача і так (паказвае) трымае рукі перад тварам.

Мама: Ты ведаеш, чаму Марыя была такая сумная?

Якаб: З-за Ісуса.

Мама: Яна бедавала па сваім сыне Ісусе, які памёр на крыжы.

Якаб: І яе ніхто не суцешыў?

Мама: Верагодней за ўсё яе суцешыў сам Ісус, калі Ён устаў з грабніцы.

Якаб: А да гэтага?

Мама: Да гэтага яе суцяшаў Ян, гэта быў сябар Ісуса.

Якаб: Ён добра суцяшаў Марыю?

Мама: Я ня ведаю, ва ўсялякім выпадку, Марыя была не адна ў сваім вялікім горы.

Якаб: Трэба суцяшаць усіх, хто смуткуе, праўда?

Мама: Так, Ісус таксама хоча, каб усе так рабілі. Трэба суцяшаць засмучаных людзей, з вясёлымі людзьмі трэба радавацца. (Яна гладзіць Якаба) Ты больш ня хочаш працаваць над сваім караблікам? Сёньня такі прыдатны для гэтага дзень.

(Сад. Якаб займаецца сваім чоўнам. Каці каля плоту, разам з Флёкі.)

Каці: Прывітаньне, Якаб!

Якаб: (Уздымае вочы) Я якраз пра цябе падумаў. Хочаш мне зноў дапамагчы?

Каці: Сёньня не, Якаб. Сёньня я занадта смутная.

Якаб: Смутная? Чаму ж гэта?

Каці: Ах, Якаб!

Якаб: Хадзі сюды, сядай у наш карабель.

Каці: Але я павінна хутка зноў ісьці. (Флёкі прыціскаецца да яе)

Якаб: Паглядзі, як Флёкі цябе любіць. Ён адчувае, што ты сумуеш.

Каці: (Сядае ў човен) Гэта ўсё з-за Зузі. Уяві сабе, яны пераязджаюць, вельмі далёка, у іншы горад. Ужо хутка. Таму я сумую.

Якаб: Аж, Божачка. Твая сяброўка. Мне здаецца, я таксама сумаваў бы.

Каці: У дзіцячым садку мы мяняліся нашымі падвячоркамі. Зузі ела мае морквачкі, а я яе ліптаўэрскія хлябцы з перцам.

Якаб: Гм.

Каці: Калі мы гулялі ў лялькі, дык яна заўсёды была татам. Цяпер у мяне нікога ня будзе, з кім можна было б гуляць, калі Зузі зьедзе.

Якаб: Слухай, Каці, я таксама мог бы быць татам тваім лялькам...

Каці: Ты так лічыш?

Якаб: І мяняцца з табою падвячоркамі.

Каці: Калі б я ўжо ўмела пісаць – я ўмею пакуль што пісаць толькі «Каці» – я б пісала Зузі кожны дзень лісты.

Якаб: Ты можаш таксама запісаць ліст на стужку, ты ведаеш – на магнітафон. Элізабэт заўсёды пасылае сваім сяброўкам лісты на касеце. Яна табе абавязкова пакажа, што і як рабіць. Тады ты проста раскажаш Зузі, што ты рабіла, чым займалася: «Прывітаньне, Зузі, сёньня я была ў Якаба, і ўяві сабе, ягоны карабель ужо гатовы, і мы паплылі на ім у мора, і перекуліліся, і Флёкі павінен быў усіх нас ратаваць.»

Каці: (хіхікае) Кінь, Зузі ніколі нам не паверыць!

Якаб: У яе ёсьць магнітафон?

Каці: Ня ведаю. Слухай, я абавязкова павінна ў яе пра гэта спытаць. Такія лісты ёй напэўна спадабаліся б. (Выходзіць з чоўна) Я пайду і адразу яе спытаю. Які ты міленькі, Якаб. Флёкі, хадзем!

Флёкі: Брэх! (Абодва адыходзяць)

Якаб: (адзін, прыхіліўся да чоўна) Здаецца, Каці я добра суцешыў. А хто цяпер будзе са мною гуляць? Магла б хаця Флёкі мне пакінуць. Добра, што я цяпер ужо зусім ня сумны. Нікога няма побач, хто б мяне суцешыў. Не, не, я зусім не сумую, толькі трошкі самотны. Калі б не было мамы ці таты, ці Элізабэт, ці Каці, хто б мяне суцешыў? Напэўна, мяне б суцешыў вецер: «Уууууу – сказаў бы вецер, – не сумуй» – ці птушка, ці дрэва, можа быць... (Энэргічна) Калі я буду па-сапраўднаму сумаваць, так, Божачка, ты пашлеш мне каго-небудзь, хто мяне суцешыць?! Ты не пакінеш мяне аднаго?! Дамовіліся! Глядзі, я на цябе спадзяюся!

Якаб хоча быць суцешаным

Людзі вельмі часта адчуваюць сябе бездапаможнымі, калі бачаць іншых людзей у смутку альбо ў горы. Тады не хапае агульнапрынятых пустых ветлівых фразаў. Не хапае словаў, не хапае сьлёз. Чалавек, які сумуе, застаецца адзін у сваім смутку і горы. Часта робяцца бездапаможныя спробы выказаць суцяшэньне: «Не бяры так блізка да сэрца», «Пройдзе», «Нічога ня зьменіш», «Трэба ўсё перажыць.» Ці будзе суцяшэньнем прапанова не ўспрымаць сур'ёзна пакуты, вось так адразу кінуць гараваць?

У Якаба можна было б павучыцца таму, як трэба суцяшаць іншых людзей. «Тады я таксама буду смуткаваць». Ён

смуткуе разам. Смутак, выкліканы стратай сяброўкі, гэта можна зразумець. У сваім спачуваньні Якаб падае ідэі, прапановы, як дапамагчы Каці пераадолець шкадаваньне страты сяброўкі. Ён прапаноўвае сябе на замену. Гэта ня вельмі дапамагае, і толькі думка пра лісты на касеце зноў абуджае ў Каці яе жыцьцёвы аптымізм. Страта сяброўкі не азначала адмову ад усялякага роду зносінаў.

«Мне здаецца, я добра суцешыў Каці!» Але хто суцешыць Якаба? Сцэна вельмі паказальная ў тым плане, якой тактоўнай і ўзважанай у адносінах да пакутаў і гора павінна быць спасылка на Бога. Размовы пра Бога не заменяць чалавечай увагі. Чалавечая ўвага і спачуваньне можа стаць пунктам спазнаньня Бога. «Яго мне паслаў Бог!» Для дзіцяці быць суцешаным азначае мець каго-небудзь, з кім можна выплакацца, з кім можна пагуляць. Таму было б ня слушна сказаць дзіцяці: «Бог цябе суцешыць.» Быць суцешаным Богам і быць абароненым разам з Богам – гэта штосьці іншае, чым тое, што атрымлівае дзіця ад бацькоў і сяброў. «Тады пашлі мне каго-небудзь, хто мяне суцешыць.» У гэтай малітве-просьбе Якаб даверліва зьвяртаецца да Бога не таму, што той замяняе сабою чалавечыя намаганьні, а таму, што Ён наладжвае адносіны паміж людзьмі. Тых, хто побач з пакутуючым і смуткуючым, мы называем Божымі пасланцамі.

Якаб складае малітву

(У саде каля дома. Якаб на арэлях. Гэтую сцэну граць стрыманей, за ўсе іншыя.)

Якаб: (Гойдаецца, мармыча пра сябе.) Я тут. Ты тут. Мы абодва тут. (Ён саскоквае з арэляў і скача на адной назе.) Я тут! Ты тут. Мы абодва тут. Гм! (Ён сядае

каля сцяны дома, спрабуе сядзець ціха.) І калі я зусім нічога не раблю, і калі я сяджу зусім ціха... Я тут. Ты тут. Мы абодва тут. (Задаволена) Усё слушна. (Ідзе зноў гушкацца.) Я тут, ты тут.

Тата: (Прыходзіць з працы) А, гэта ты, Якаб.

Якаб: (Не сумеўшыся) Прывітаньне. Божачка! Я тут, ты тут, мы абодва тут.

Тата: Гэта новая лічылка?

Якаб: Не, гэта нешта зусім іншае. Гэта малітва, якую я толькі што склаў.

Тата: Малітва?

Якаб: Ведаеш, малітвы ў дзіцячым садку для мяне занадта нудныя. Заўсёды тыя ж самыя. Некаторыя падыходзяць толькі да ежы ці толькі калі прачынаешся раніцай. Я склаў малітву, якая падыходзіць заўсёды. Сказаць табе?

Тата: (Прыхіляецца да сьцяны) Давай, раскажы, калі ласка, яе.

Якаб: (Гушкаецца, але з пэўнай урачыстасьцю)

Божачка!
Я тут.
Ты тут.
Мы абодва тут.

Тата: Гэта гучыць трошкі незвычайна для мяне.

Якаб: Божачка! Калі я гэта кажу, Божачка сабе думае: ага, Якаб кліча мяне. Я павінен прыслухацца да яго. Я тут. Зразумела, так? Ты тут. Божачка, кажа мама, заўсёды тут, паўсюль.

Тата: Мама, вядома, мае рацыю.

Якаб: Так, калі я тут і Божачка тут, тады мы абодва разам тут. Гэта ж добра, праўда? І гэта паўсюль падыходзіць. Калі гуляеш, калі ясі, калі б'еш у бубен, калі разглядаеш малюнкі ў кнізе, паўсюль. Я ўжо спрабаваў.

Тата: Калі так глядзець, дык ты маеш рацыю, сыне.

Якаб: Калі табе падабаецца мая малітва, ты можаш ўзяць яе сабе. Я табе дару.

Тата: (Зьбянтэжана) О, гэта – гм – дзякую.

Якаб: Мы можам разам адмаўляць гэтую малітву. Кожны з нас, дзе б ня быў. Як ты лічыш, яна падыходзіць да службовай працы?

Тата: Гм – так – чаму ж, уласна, і не.

Якаб: А ў аўтобусе?

Тата: Так.

Якаб: Слухай, тата, я табе нешта скажу: паспрабуй адмовіць маю малітву раніцай, паўсюль, і скажы мне вечарам, ці яна падыходзіла.

Тата: Добра, калі ты гэтага хочаш. Я – я паспрабую.

Якаб: Ты яшчэ памятаеш радкі?

Тата: Божачка, я тут, ты тут, мы абодва тут!

(Якаб задаволена гушкаецца.)

Якаб складае малітву

У некаторых колах зноў узмацняюцца галасы пра неабходнасьць існаваньня цьвёрда ўстаноўленага малітоўніка для дзяцей. «Нельга позна пачынаць гэтую справу.» Відавочна, што ў пераломны час патрэба ў зацьверджаных формах і фармулёўках асабліва вялікая. Але калі ж дзіця спачатку вучыць зфармуляваныя малітвы, дык яно прызвычайваецца да малітвы як да вымаўленьня напамяць большай часткаю чужых словаў. Калі дзіця спачатку вучыцца самапаглыбленьню, самазасяроджанасьці, сабранасьці, вучыцца апавядаць пра сябе і прыносіць усё, што яго хвалюе, з дапамогаю бацькоў да Бога, тады яно спазнае, што маліцца – гэта значыць: адказваць на пачуцьці, быць пакліканым Богам па імені, быць любімым Богам.

Якаб кажа: «Я тут» і ведае, што ён нешта значыць. Гісторыя маленькага Я-гэта-я (Міра Лобэ) апавядае пра адно зьверанятка, якое, няўпэўненае ў тым, хто яно такое, пытаецца ва ўсіх зьвяроў, каб нарэшце даведацца: я гэта я. Я адзіны ў сваім родзе. Я не адбітак, копія каго-небудзь іншага. Я маю права быць самім сабою. Гэты шлях Якаб ужо прайшоў. Псіхолагі сказалі б, што ён пабудаваў пачуцьцё ўласнай годнасьці.

Якаб расказвае сваю малітву ня сам для сябе, а зьвяртаецца да асяроддзя. Ён адказвае на заклік Бога словамі: «Пане, я тут». Якаб прадчувае, пазнае блізкасьць Бога ва ўсім сьвеце, ва ўсім жыцьці. Бог знаходзіцца для яго не па той бок сьвету, не за зоркамі, Бог – гэта ня той, хто ўсё бачыць, ведае і можа. Бог – гэта той, хто падтрымлівае яго, і таму ён кажа: «Ты тут».

Разам з гэтым Якаб успрымае Бога не як супярэчнасьць уласнаму я, не як таго, хто яго прыгнятае, хоча прымусіць стаць на калені і перамагчы. Бог падтрымлівае яго, Бог зьвернуты да чалавека, а чалавек скіраваны на Бога.

Якаб напоўнены пачуцьцём гэтай сувязі: «Мы абодва тут». Такая простая малітва і такое падставовае пачуцьцё, якое ў ёй выяўляецца. Якаб, дзіця, можа павучыць нас маліцца. Дзеля таго, каб у малітве знаходзіў сваё выяўленьне жыцьцёвы вопыт дзіцяці, для таго, каб размовы пра Бога ўспрымаліся дзецьмі асэнсавана, дзіця павінна натхняцца да цішыні і медытацыі. Бэрнхард Гром рэкамендаваў практыкаваньні па цішыні і засяроджанаму ўспрыманьню рэчаіснасьці (сядзець разьняволена і з заплюшчанымі вачыма слухаць, ці што-небудзь адчуваць), практыкаваньні на ўяўленьне (разьняволіцца, заплюшчыць вочы і «бачыць» праз сьцены альбо дзьверы, што робяць ці пра што думаюць бацькі), ці таксама практыкаваньні на веданьне свайго цела (дыханьне, цяпло і г.д.). Падчас усіх важных размоваў, так-

сама падчас малітвы, бацькі і дзеці павінны спачатку засяродзіцца. Потым дзіця можа быць праведзена да малітвы, якую яно расказвае, карыстаючыся ўласнымі словамі і сыходзячы з адкрытых яму асноўных паняццяў падзякі, даверу і агульнай любові. Папярэдне сфармуляваныя (з улікам дзіцячага ўзросту) элементы малітвы, якія прапануюцца бацькамі дзецям, могуць разьвіць і пашырыць ягоныя здольнасьці да выказваньня ўласных пачуццяў.

Я цешуся
Станоўчае ўспрыманьне жыцьця

Рэлігійнае выхаваньне заўсёды было сродкам падаўленьня, прыгнёту, яно было скіраванае супраць дзіцяці і ягоных патрэбаў і за сваю мэту мела прыстасаваньне, функцыянаваньне і пэўную рэлігійную практыку. Гэта хавалася за вобразам Хрыста, які патрабаваў выкананьня большай колькасьці правілаў, чым тыя людзі, якія называлі сябе няверникамі.

Склалася ўражаньне, нібыта рэлігійнае выхаваньне хоча выцягнуць той жыцьцёвы нерв, нібыта яно стрымлівае сілу і радасьць жыцьця. Дагэтуль рэлігійнае выхаваньне ўспрымалася як абмежавальнае, а не як вызваляльнае, як прыгнятальнае, а не як натхняльнае, як застрашальнае, а не як узмацняльнае давер да іншых людзей.

Адольф Экслер лічыць, што прыдатнасьць кожнага аспекта рэлігійнага выхаваньня можа быць вымерана па тым, «у якой ступені яно садзейнічае самаўсьведамленьню чалавека, у якім ён выходзіць па-за межы сябе самога».

Аднойчы цёплай летняй ноччу я начаваў з маім чатырохгадовым сынком на гары пад адкрытым небам. Сярод ночы ён прачынаецца, бачыць над сабою начное неба і

кажа: «Колькі зораў!» Відавочна, што дзеці маюць здольнасьці ўспрымаць прыроду з надзвычай асаблівай сілаю і быць уражанымі ёю. Кожны ведае заразьлівае захапленьне першым сьнегам. Прагулка з дзецьмі па дунайскіх лугах каля Вены, калі ў сакавіку расьцьвітае шмат пралесак, дазваляе спазнаць, што такое радасьць жыцьця.

У сямейнай атмасферы, якая садзейнічае развіццю падставовага даверу і пачуцьця ўласнай годнасьці, вырастае таксама радасьць жыцьця і станоўчае ўспрыманьне жыцьця. І толькі ў ёй павінны адбывацца першыя выразныя размовы пра Бога. Перадумоваю для гэтага зьяўляецца тое, што дзіця ўжо ўмее засяроджвацца і мае вопыт унутраных пачуцьцяў, на падставе якіх яно павінна разумець гэтыя размовы.

Сыходзячы з гэтага тэзісу радасьці жыцьця і станоўчага ўспрыманьня жыцьця, трэба чакаць, што будуць хучэй закладзены падставы сталай рэлігійнасьці, якая будзе перажывацца як узбагачальная, жыцьцепаглыбляльная, натхняльная да самааддачы.

Бэрнхард Гром: «Дзіця павінна першы раз пачуць размовы пра Бога і шанаваньне Бога там, дзе яно навучылася адкрываць, цешыцца і захапляцца кавалачкам сьвету, дзе яно набіраецца вопыту і кажа: «Гэта прыгожа, гэта цудоўна!» Гаворачы словамі Бэрнхарда Грома, станоўчае ўспрыманьне жыцьця – гэта здольнасьць захапляцца прыгажосьцю прыроды, здольнасьць ўсталяваньня кантактаў з іншымі людзьмі. Бацькі ці выхавальнікі таксама могуць дадаць: «Тым, што ты маеш (што мы можам гэта рабіць), мы абавязаныя Найдабрэйшаму і Найвялікшаму. Таксама і тым, што ў нас ёсьць бацькі (выхавальнікі), нашыя бабулі і дзядулі, увесь сьвет – мы абавязаныя Яму. Ён дорыць нам гэта, каб мы радаваліся і прыносілі радасьць іншым. Той, хто хоча, можа цяпер схіліцца перад Ім і падзякаваць. (Цішыня і паў-

за, потым:) Дзякую, вялікі Божа, дзякую, добры Ойча, дзякую за ... (прыгожыя кветкі, маю маму, бабулю і г.д.) – дзякую за ўсё прыгожае. Дзякую за мае вочы, якія могуць бачыць (мае рукі і г.д.) – дзякую за тое, што я жыву і за тое, што Ты такі добры.»

Гэтыя думкі дзеці могуць урэшце выказаць у фарбах, рухах і ў музыцы. У іншых абставінах, магчыма, можна было б працягнуць: «Дзякую за тое, што я жыву. Калі я калінебудзь буду сумаваць, я таксама хачу думаць пра прыгожае. Зрабі мяне мужным і стойкім, калі мне будзе дрэнна. Дзякую.» Тым самым малітва-хвала і малітва-падзяка стануць першым і вызначальным вопытам малітвы. Толькі маючы такую базу, дзіця можна падвесьці да малітвы-просьбы.

Якаб і вазон з клапоўнікам

(На падворку. Лаўка пад вакном. Вакно адчынена, на падваконьніку стаіць размаляваны вазон з зямлёю і насеньнем. Элізабэт з палівачкаю працуе ў садзе.)

Якаб: (Зьяўляецца ў вакне, разглядае вазон) Гм! Яшчэ нічога! (Выхіляецца з вакна да Элізабэт) Элізабэт! (Больш настойліва, таму што яна не адразу рэагуе) Элізабэт! Хадзі сюды на хвілінку, калі ласка!
(Элізабэт заглядае ў вакно) Як ты думаеш, яму тут добра стаяць?

Элізабэт: Твайму вазону з клапоўнікам? Так, Якаб. Тут яму хапае сонца.

Якаб: Але з ім нічога ня робіцца. Я гляджу і гляджу, але з ім нічога не адбываецца. Я пасеяў поўную жменю насеньня клапоўніка, але ніводнае ня хоча вылазіць.

Элізабэт: Яшчэ вылезе, Якаб. Дай насеньню час. Ты думаеш, што яно хутчэй прарасьце, калі ты на яго ўвесь час пазіраеш?

Якаб: Але я так чакаю, што яно нарэшце прарасьце. Да Вялікадня яно павінна быць во-оось такой вышыні. Яно ўжо павінна пачынаць прарастаць, так? Інакш яно ніколі ня будзе такім высокім. Ведаеш, гэты вазон павінен стаць сапраўдным зялёным клапіным гняздом. Зялёнае клапінае гняздо з чырвоным яйкам усярэдзіне. Я тады падару яго Каці. Гэта добры падарунак, праўда, Элізабэт?

Элізабэт: Вядома.

Якаб: Ды я яшчэ сам размаляваў вазон ... Гэта прыгожы вазон, праўда, Элізабэт?

Элізабэт: Прыгожы вазон, Каці будзе рада. (Адыходзіць ад вакна і ідзе ў сад)

Якаб: (Адзін на вакне са сваім вазонам з клапоўнікам) Насеньне клапоўніка, ты чуеш! Варушыся, кажу табе! Я-хачу-каб-ты-варушылася! Элізабэт!

Элізабэт: Та-ак.

Якаб: Хадзі сюды, калі ласка, на хвілінку з палівачкаю. Я думаю, што насеньню патрэбна больш вады. (Элізабэт падыходзіць і паліваe) Хопіць! Хопіць! Так, насеньне, цяпер мне здаецца, ты маеш усё, што табе патрэбна: сонца. І ваду. І добрую зямлю. Цяпер бяз хітрыкаў! Калі ласка, варушыся! Ты, глупае насеньне, варушыся нарэшце, інакш (грукоча кулаком па падваконьніку)

Элізабэт: Кінь, Якаб, твае праклёны не дапамогуць.

Якаб: (сьціхае) І праўда. Я паспрабую штосьці іншае (зьнікае з вакна).

Элізабэт: Зноў ён нешта сабе прыдумаў!

Якаб: (выходзіць і зьвяртаецца да Элізабэт) Ведаеш,

што я прыдумаў? Гэта так проста, я павінен быў і раней здагадацца. Я папрашу Божачку, каб Ён загадаў насеньню хутчэй прарастаць!

Элізабэт: Кінь, Якаб!

Якаб: Не, не перашкаджай мне цяпер! Божачка, ты можаш зрабіць, каб насеньне хутчэй прарастала? Ты ўсё можаш зрабіць! Ці ня так? Калі ласка, зрабі, каб насеньне прарастала! Калі ласка! Таму што я так гэтага чакаю... Чаго ты сьмяешся, Элізабэт?

Элізабэт: Таму што ты падаешся мне такім сьмешным. (Сядае разам з ім) Паслухай, Якаб! Божачка ня будзе загадваць насеньню па твайму жаданьню хутчэй прарасьці! Божачка зрабіў насеньне такім чынам, што яму патрэбны яго пэўны час, каб вырасьці. Ты павінен набрацца цярплівасьці.

Якаб: (Незадаволена бурчыць) Я не хачу набірацца ніякай цярплівасьці.

Элізабэт: Але з усім, што расьце, трэба мець цярпеньне. Вось, напрыклад, з нарцысамі. З коцікамі вярбы. З кустом, з кожным дрэвам. Кожнаму патрэбны свой час. Табе таксама патрэбны свой час, каб вырасьці.

Якаб: Мне? О, я расту вельмі хутка. Ты ведаеш. Спытайся ў мамы. Учора мы куплялі мне туфлі, таму што мае ногі зноў вырасьлі. (Ускоквае, тупае нагамі) Насеньне, варушыся! Насеньне, варушыся! Ты, з тваім цярпеньнем! Вельмі цяжка мець цярпеньне.

Элізабэт: Так, сапраўды. Я сама гэта адчуваю.

Якаб: Так?

Элізабэт: Таму што мне менавіта цяпер з табою патрэбна столькі цярпеньня.

Якаб: Са мною? Чаму ж гэта?

Элізабэт: Таму што мне дзейнічае на нервы, як ты тут скачаш і сварышся з насеньнем. Мне трэба набрацца цярпеньня і чакаць, пакуль ты зноў станеш лагодным Якабам.

Якаб: (Спачатку незадаволена, потым задумліва) Мгм! Ты ўсё яшчэ чакаеш?

Якаб: (Сядае разам з ёю) Ведаеш, што я скажу Каці? Гэта для цябе, Каці, скажу я. Гэты вазон з клапоўнікам толькі для цябе адной. Я пасеяў насенне і паліваў, і наглядаў, як яно расьце. Цяпер яно так вырасла, большае за твой палец. Яйка таксама табе, скажу я. Таму што ты мая сяброўка. (Узьняў галаву ўгору і кажа насеньню) Насеньне, добра, хай так і будзе – я больш не сварусь. Я толькі хачу наглядаць час ад часу. (Устае, становіцца на лаўку) Элізабэт, глянь! Карычневае зернетка трэснула, я гэтага спачатку зусім не заўважыў! Бачна штосьці маленькае, беленькае!

Элізабэт: (Таксама глядзіць) Першы парастак!

Якаб: (Узрушана) Заўтра ён будзе ўжо трошкі большым! Я рады. Сапраўды, як я рады. Дай толькі час, парастачак! Толькі не сьпяшайся! Я ахвотна буду назіраць, як ты расьцеш.

Якаб і вазон з клапоўнікам

У нашай гісторыі мы даем прыклад тыповага нецярпеньня, якое часам праяўляюць дзеці. «Варушыся, кажу табе!» – Якаб ня можа і проста няздольны чакаць. Са сваім неспакоем і няўрымсьлівасьцю ён далёкі ад разуменьня законаў прыроды, у якой усё мае свой час. Першыя бачныя зьмены, першае трэснутае зернетка клапоўніка захапляюць Якаба. Цяпер ён можа пачакаць і кажа свайму зернетку: «Толькі не сьпя-

шайся. Я буду ахвотна назіраць, як ты расьцеш.» Цяпер час росту – гэта час радасьці для яго. Ён спазнаў прыроду як захапляльны і хвалюючы «сьвет-які-нечым-стане». На будучыню ён будзе сьвядомей ставіцца да зьменаў у прыродзе, таму што цяпер разумее, што сьвет мае сваю будучыню, ён зьмяняецца, ён – гэта «сьвет-які-нечым-стане».

Што датычыцца ўдзелу Божачкі ў гэтай гісторыі, дык Якабу здаецца, што Божачка ўсё можа, Яго трэба толькі адпаведным чынам папрасіць, і Ён скажа сваё апошняе слова. Але Элізабэт дае Якабу падставы перагледзець свае ўяўленьні і чаканьні: «...ты мне падаешся такім сьмешным.» Яна ня кажа яму: «Гэта глупства. У цябе няслушнае ўяўленьне пра Бога». Наадварот, яна прымушае яго задумацца. Яна падштурхоўвае яго не заставацца са сваімі закасьцянелымі поглядамі і ведае, што трывалую аднабаковасьць успрыманьня Бога нельга перамагчы, калі аб'явіць яе адно толькі няслушнай і недапушчальнай – толькі прапанова новых, дзейсных стымулаў дазваляе ісьці далей.

За абедам, калі разьлівалі суп, нашая шасьцігадовая дзяўчынка сказала: «Ах, пра гэта нам казала нашая настаўніца рэлігіі: Бог – апалоўнік! (Ням. der Schupfer – 1. творца; 2. апалоўнік)» Гэты выпадак дакладна сьведчыць пра тое, як мала паняцьцяў дзеці ўкладаюць у слова «der Schopfer». Калі дзецям апавядаюць пра тое, што Бог стварыў сьвет, дык, магчыма, яны будуць уяўляць сабе Бога як волата-майстру і будуць пытацца: «Як жа Ён гэта ўсё зрабіў? Горы і азёры, мора і рыбаў?» Калі адкрываць дзецям навакольны сьвет як Божы падарунак, калі радасьць жыцьця паглыбляецца да шанаваньня таго, хто гэта ўсё нам падараваў, тады дзеці, напэўна, спытаюць: «Чаму Ён дорыць нам усё гэта?» і зразумеюць, як моцна любіць нас Бог. Адказ на падарунак, які прыносіць радасьць, заўсёды просты – «дзякую». Нашая падзяка, словы якой ідуць ад шчырага сэрца,

павінна ляжаць на пачатку кожнае малітвы. І тады гэта будзе самай урадлівай глебай для станаўленьня рэлігійнасьці.

Сьвята прыгалубліваньня

(Дзіцячы пакой. Якаб сядзіць у роздуме на зэдліку. Элізабэт гуляе ці майструе. У вялікай вазе на падлозе стаяць вербачкі.

Якаб: Прыгожая ўчора была працэсія з букетамі вербачак.

Элізабэт: Так.

Якаб: А якое сьвята мы сёньня сьвяткуем?

Элізабэт: Сёньня?

Якаб: Так, які сёньня дзень?

Элізабэт: Сёньня панядзелак. Самы звычайны панядзелак. Калі не лічыць, што сёньня ў мяне няма заняткаў...

Якаб: Але што мы сёньня сьвяткуем?

Элізабэт: Нічога!

Якаб: Так, добра. Ні імяніны, ні дзень нараджэньня, ні дзень сьвятога Мікалая, зусім нічога?

Элізабэт: Але, Якаб, праз пару дзён Вялікдзень, гэта вялікае сьвята!

Якаб: Праз колькі дзён?

Элізабэт: Яшчэ пяць разоў паспаць!

Якаб: Яшчэ так доўга! Але я хачу, каб ужо сёньня было сьвята.

Элізабэт: Ты, напэўна, хочаш кожны дзень што-небудзь сьвяткаваць.

Якаб: Дзень бяз сьвята – ты толькі ўяві сабе гэта! Мы маглі б адсьвяткаваць сёньня хаця б маленькае сьвята. Элізабэт, падумай!

Элізабэт: Што я магу зрабіць, калі сёньня няма ніякага сьвята!

Якаб: (Зьдзіўлена) Вельмі проста: мы сабе яго прыдумаем. (Задумваецца) Можа сьвята-размалюй-браму-дома? Кожны возьме бляшанку з фарбаю і намалюе тварык Каспэрля* на браме свайго дома. Самы прыгожы малюнак атрымае прыз.

Элізабэт: І хто павінен сьвяткаваць гэтае сьвята?

Якаб: Усе людзі на нашай вуліцы.

Элізабэт: Яны робяць нешта падобнае на масьленіцу.

Якаб: Але яны ня ведаюць, што гэта сьвята.

Элізабэт: Тады прыдумай што-небудзь іншае!

Якаб: Сьвята-на-лепшы-бабулін-пірог! Кожная бабуля з гэтай вуліцы сьпячэ пірог, дзеці адусюль прыйдуць пакаштаваць. Бабулі, якая сьпячэ лепшы пірог, будзе дазволена пайсьці на шпацыр з сабакам Каці!

Элізабэт: Але тады трэба, каб усе бабулі былі згоднымі, і, акрамя таго, такое сьвята трэба грунтоўна падрыхтаваць.

Якаб: Я ведаю! Сьвята без падрыхтоўкі!

Элізабэт: Так?

Якаб: Сьвята прыгалубліваньня!

Элізабэт: Сьвята прыгалубліваньня?

Якаб: Сьвята прыгалубліваньня! Я хуценька скажу маме з татам, што сёньня сьвята прыгалубліваньня. Калі яно пачнецца, я цябе паклічу!

(У садзе вісіць бялізна, якую тата і мама толькі што разьвесілі.)

Якаб: (Падлятае да бацькоў) Татачка, мамачка, вы ўжо ведаеце? Сёньня сьвята прыгалубліваньня!

Тата: Падчас працы – аніякіх сьвятаў!

* Каспэрль – маленькі сьмешны чалавечак, герой дзіцячых апавяданьняў.

Якаб: Як гэта ніякіх? Гэта ж сьвята прыгалубліваньня! (Цягне маму, а потым і тату на лаву) Татачка, ты гладзіш мяне, а я гладжу маму.

Тата: Ага, а хто пагладзіць мяне?

Мама: (Сядае паміж татам і Якабам – калі месца замала, дык бацькі сядзяць на лаве, а Якаб паміж імі на зямлі) Добра, што ў мяне дзьве рукі. (Гладзіць Якаба і казыча за вухам тату)

Якаб: Элізабэт! Элізабэт! Хутчэй! Мы ўжо сьвяткуем!

Элізабэт: (Выглядае з вакна) Іду! (Прымошчваецца разам з Якабам)

Якаб: Праўда, гэта цудоўнае сьвята?

Мама: Яго можна сьвяткаваць у любы час!

Тата: І ніякіх выдаткаў!

Элізабэт: Але яго нельга сьвяткаваць заўсёды! Калі мама, напрыклад, гатуе і яе рукі ў цесьце ад клёцак, яна ня можа ўдзельнічаць у сьвяце прыгалубліваньня!

Тата: (Жартоўна-пяшчотным тонам) Гэта для вашай мамы не праблема.

Мама: Нават так?

Тата: Калі мама ня можа песьціць рукамі, тады яна песьціць позіркам. Праўда? Вось яна якая, вашая мама!

Элізабэт: Можна песьціць таксама і позіркам?

Тата: І словамі таксама. Калі казаць нешта прыемнае.

Мама: Можна песьціць таксама і думкамі. Напрыклад, калі тата на працы, я павінна песьціць яго думкамі, так?

Элізабэт: І я таксама магу – песьціць думкамі?

Мама: Зразумела! Гэта можа кожны! Трэба толькі трошкі папрактыкавацца!

Якаб: (Кладзе рукі на калені, аглядаецца і спрабуе папрактыкавацца) Прывітаньне, дрэўца! Прыві-

таньне, бабуля! Прывітаньне, Флёкі! Бачыце, я ўжо практыкуюся... Прывітаньне, караблік!

Сьвята прыгалубліваньня

«Жыць сёньняшнім днём і жыць з усёй паўнатою». Гэтага прагнуць і могуць толькі дзеці. «Жыць усёй паўнатою пачуццяў, і з людзьмі, з якімі ім добра». Радасьць жыцьця знаходзіць сваё адпаведнае выяўленьне ў святкаваньні сьвятаў. Калі іх сьвяткуюць разам – яны вельмі ўзбагачаюць людзей. Сьвяты – гэта нешта тыпова чалавечае, што адрозьнівае нас ад зьвяроў. Ці можа ёсьць такі зьвер, які задзьмувае сьвечкі на сьвяточным торце? Калі так, дык тады гэта ўжо павінна стаць задачай выхаваньня – прышчапляць гэтыя асаблівыя чалавечыя здольнасьці і якасьці.

Трэба сьвяткаваць сьвяты, калі яны надыходзяць. І, акрамя гэтага, скарыстоўваць кожную магчымасьць для сьвятаў. Я вельмі выразна згадваю выпадак у нашым доме. Мы жылі тады ў старым будынку з высокімі столямі. Аднойчы вечарам алей на патэльні запалаў яркім полымем. Мама прынесла гітару, выключыла сьвятло, і мы сьпявалі песьні пры гэтым вогнішчы, пакуль полымя ня згасла. Для сьвята патрэбна толькі бачыць добрыя прычыны і мець заразьлівую радасьць жыцьця, якая перадаецца іншым.

Разам са сваёю ідэяй («сьвята прыгалубліваньня») Якаб інтуітыўна адчуў, *што* зьяўляецца сутнасьцю сьвятаў – менавіта адносіны паміж людзьмі, якія ў дадзеным выпадку паглыбляюцца і пашыраюцца. Станоўчы вопыт радасьці, які так ярка праяўляецца падчас сьвяткаваньня «сьвята прыгалубліваньня», зьяўляецца важным асьпектам рэлігійнага выхаваньня.

Добрае веданьне сваіх цялесных адчуваньняў, узбагачальныя цялесныя кантакты зьяўляюцца неабходнай асно-

ваю культуры пяшчоты дарослага. У гэтым плане сэксуальнае выхаваньне ня ставіць за сваёю мэту падаўленьне сэксуальнасьці, але і не зьбіраецца здабываць яе для сэксу як спорту – яно трактуе сэксуальнасьць як зьяву, якая ўзбагачае нашыя пачуцьці і нясе радасьць у нашае жыцьцё.

Ня мець ні да чаго ніякай ахвоты, бяздумна, бязрадасна існаваць, рабіць штосьці пад прымусам, ня можа быць прызначэньнем чалавека. Ёсьць таксама эгаістычныя і бязбожныя мізэрна-нікчэмныя формы радасьці, але Якаб выказвае чалавечую, боскую радасьць, радасьць жыцьця, якая зьбліжае, узбагачае, дае падставу да станоўчага ўспрыманьня сьвету. Такія сітуацыі – гэта тая магчымасьць, дзякуючы якой бацькі самі могуць падштурхнуць дзяцей падзякаваць Богу за жыцьцё, за радасьць, за гэты сьвет і за добрую ідэю адзначэньня сьвята. Богу, які ўсё гэта падарыў нам.

Сцэна сьвята прыгалубліваньня можа падштурхнуць дзяцей да ўспрыманьня ўнутраных працэсаў і ўнутраных пачуцьцяў: «Можна песьціць таксама і думкамі». Тым самым дзіця запрашаецца перайсьці ад сьвету прадметаў да глыбокага разуменьня ўзаемаадносінаў і рэчаіснасьці. Дзіця здолее зрабіць гэта тым лепей, чым большы яно мае вопыт засяроджваньня і ўяўленьня сябе ў сітуацыях ці на месцы іншых людзей, якіх няма побач у гэты момант.

Якаб дапамагае Божачку

(Якаб у садзе разам з садовым начыньнем, палівачкаю, кошыкам. Магчыма ён толькі што дапамагаў маме. Але цяпер ён заўважыў на дрэве маленькую птушку, якая сьпявае з усіх сваіх сілаў.)

Якаб: (Не паварочваючы галавы, шэпча) Мама, ты чуеш?
Мама: (Стаіць на некаторай адлегласьці) Птушачку? Так.

Якаб: Яе грудка проста дрыжыць ад гучных сьпеваў. Гэта так хораша выглядае. (Асьцярожна адыходзіць назад, не адводзячы ад птушкі вачэй) Каб ёй толькі не перашкодзіць. Можа яна захоча жыць у нашым садзе. Можа ёй у нас спадабаецца. (Зьвяртаецца да мамы) У нашым садзе жыве шмат зьвяроў. Асабліва матылёў.

Мама: Сёлета ў нас шмат паўліных вочак. І ведаеш, чаму? Таму што я не скасіла крапіву. А вусені паўліных вочак жывуць на крапіве.

Якаб: І дзядоўнікавыя матылькі ў нас таксама ёсьць. На кожным кусьце дзядоўніку.

Мама: Так, таму што я таксама пакінула пару кустоў дзядоўніку. Большасьць людзй вырывае дзядоўнік, бо гэта пустазельле. Але я люблю дзядоўнік. Ён такі прыгожы. Вось той, напрыклад. Толькі паглядзі на яго.

Якаб: (Каля дзядоўніку) Чаму ты думаеш, што ён прыгожы – гэта ж пустазельле?

Мама: Ах, людзі ўсё называюць пустазельлем, што яны ня могуць скарыстаць. Калі б дзядоўнік і дзядоўнікавыя матылькі маглі разумець, што мы называем дзядоўнік пустазельлем, дык яны б вельмі абурыліся.

Якаб: Мне падабаецца дзядоўнік.

Мама: Калі ты зблізку паглядзіш на кветкі і лісьце, тады ты заўважыш, якія яны цудоўныя. Часам я сабе думаю: Божачка, напэўна, вельмі радаваўся з усяго гэтага, калі Ён усё зрабіў. Інакш яно не было б такім прыгожым.

Якаб: Але тыя два дрэвы каля калодзежа ня вельмі прыгожыя. Іх лісьце зморшчылася, усё ў плямах. Божачка іх прыдумаў ня вельмі прыгожымі.

Мама: Але Божачка не вінаваты ў тым, што гэтае лісьце ня вельмі прыгожае. Яно не вытрымлівае нашага гарад-

скога паветра. І калі ўзімку дарогі пасыпаюць соллю – яно проста хварэе і памірае. Шматлікія расьліны і зьвяры павінныя памерці, таму што людзі зусім мала пра іх дбаюць.

Якаб: Магчыма, людзі не прыглядаюцца і ня бачаць, якія прыгожыя навокал кветкі і матылі.

Мама: Магчыма.

Якаб: Калі я стану дарослым, я намалюю плакаты і напішу на іх: «Увага! Гэтае дрэва Божачка прыдумаў прыгожым. Калі ласка, не пашкодзіць!» Я павешу такі плакат на кожным дрэве.

Мама: А ці варта?

Якаб: Тады калі я вырасту, я пасаджу на кожнай пустой дзялянцы кветкі і кусты.

Мама: Табе ня трэба чакаць, пакуль ты вырасьцеш. Ты можаш пачынаць з нашага сада.

Якаб: (Аглядаецца навокал) Наш сад і так прыгожы. Але шэрая сьцяна ад вуліцы выглядае нуднавата. Можна я там пачаплю вазон з кветкаю?

Мама: Я ня супраць – калі ты будзеш клапаціцца пра яго і рэгулярна яго паліваць.

(Якаб перад сьцяною, на якой вісіць маленькі вазон. Над ім Якаб намаляваў жоўтае сонейка. Ён яшчэ трымае ў далоні пэндзаль. Каля ног стаіць бляшанка з фарбаю.)

Якаб: (Зьвяртаючыся да мамы, якая крытычна разглядае ягоную працу) Вось, калі цяпер побач будуць праходзіць людзі, дык яны падумаюць: што гэта там сьвеціць? Яны ўважліва прыгледзяцца і скажуць: ах, якая прыгожая кветка – гэта яе Божачка прыдумаў прыгожай. Праўда, так будуць казаць?

Мама: Спадзяюся, Якаб, спадзяюся.

Якаб дапамагае Божачку

Часам здаецца, што чалавек нашай еўрапейскай цывілізацыі ня ведае ніякай літасьці да прыроды. Імклівае зьмяншэньне плошчы лясоў, пашырэньне пустыняў, наступальная эрозія глебы, узрастальнае забруджваньне паветра, атручваньне глебы, забруджваньне вады маюць вельмі высокую ступень небясьпекі. Ці мае прырода яшчэ будучыню? І якую?

Сур'ёзнасьць сітуацыі падкрэсьліваецца тым, што нават палітыкамі прыймаюцца і абмяркоўваюцца меры супраць разбурэньня навакольнага асяроддзя. Але нават калі будуць прынятыя спробы з дапамогаю законаў узгадніць чалавечыя ўчынкі і іх наступствы з прыродаю і яе патрэбамі, гэтага таксама будзе недастаткова. Важным зьяўляецца і асабістае разуменьне велічы і самабытнасьці прыроды. Вадзе не патрэбны чалавек – але чалавек без вады ня можа жыць. Заклік да апанаваньня Зямлёй відавочна быў зразуметы як свабода дзеяньняў, як заклік да безагляднай эксплуатацыі прыроды. Кожны цудоўна дагледжаны англійскі газон, землеўпарадкаваньне, кожная монакультура, кожны асушаны луг зьяўляецца парушэньнем чульлівай экалагічнай сістэмы прыроды. Вельмі хутка да пустазельля адносіцца усё, што супярэчыць нейкім пастаўленым мэтам. Так зьнікаюць ня толькі лекавыя зёлкі, прыгожыя кветкі і наогул разнастайнасьць расьліннага сьвету, але таксама і зьвяры, якія пэўным чынам зьвязаныя з гэтымі расьлінамі. І ўсе яны зьнікаюць часта проста незаўважанымі.

Той, хто ідзе да прыроды з адкрытым сэрцам, адчувае і ўбірае ў сябе яе пахі, гукі і колеры, заўсёды будзе захапляцца ёю і будзе ўдзячны за гэты перададзены яму Богам падарунак. Ён будзе клапаціцца пра тое, каб гэты падарунак

захаваўся. «Прыгажосьць твора ўсхваляе свайго творцу» – памятаючы пра гэта, чалавек клапоціцца пра прыроду і, магчыма, узгадвае біблейскае апавяданьне, у якім Бог перадаў чалавеку сад Эдэм з наказам даглядаць яго і захоўваць.

Бацькі могуць падштурхнуць сваіх дзяцей да гэтага, адкрыць ім вочы на цуды прыроды і абудзіць у іх пачуцьцё адказнасьці за яе. Мама апавядае Якабу пра рэчавыя сувязі і тым самым дае падставы для дзеяньняў. Якаб не вагаецца ні хвіліны. Ён ведае, што ён нешта можа зрабіць. Пад узьдзеяньнем новых пачуцьцяў, ён падае знак надзеі – вазон на шэрай сьцяне з намаляваным на ёй сонцам. Бацькі са сваімі дзецьмі павінныя падумаць, што яшчэ можна зрабіць для аховы навакольнага асяроддзя і як можна заахвоціць да гэтага іншых...

Якаб спадзяецца, што ягоны знак надзеі будзе заўважаны іншымі, і што ўсе гэтыя людзі зноў навучацца цешыцца прыгажосьцю прыроды і ўслаўляць за гэта Бога.

Якаб мае кветку

(Каля дому. На лаўцы сохнуць чатыры маленькія вазачкі, зробленыя з палавінак чырвоных яечных шкарлупінаў і коркаў. Побач бляшанка фарбаў і шклянка з прамытым пэндзлем. Элізабэт разглядае свае творы, тата стаіць з пляцаком, гатовы рушыць у дарогу, мама толькі што прымусіла Якаба надзець шапку. Дзеці апранутыя ў кофты ці курткі.)

Мама: (Зьвяртаецца да Якаба) Ты паслухаеш мяне і ня здымеш шапку.

Якаб: Ня трэба мне ніякай шапкі, бо страшэнна горача.

Мама: У лесе холадна, і дзьме вецер...

Якаб: Заўсёды, калі ты лічыш, што дзьме вецер, я павінен апранаць гэтую страшэнна цёплую шапку.

Тата: Дык вось што атрымліваецца, паважанае спадарства. Я сьпецыяльна бяру адгул, каб пайсьці з вамі ў лес, а мы цяпер ня можам выйсьці з-за нейкай шапкі!

Якаб: Добра, я ня буду здымаць шапку...

Элізабэт: (Да мамы) Мама, калі ласка, калі гэтыя вазачкі высахнуць, пастаў іх да мяне – каб з імі нічога ня здарылася.

Мама: Добра, Элізабэт, пастаўлю.

Элізабэт: Калі паставіць у іх мох і коцікі, будзе вельмі прыгожа, праўда?

Мама: Так, а цяпер рухайце нарэшце.

Тата: (Да мамы) А ты адпачнеш і дазволіш сабе адзін спакойны дзень.

Мама: Так, я трохі папрацую ў садзе.

Якаб: Але толькі калі апранеш шапку...

Тата: Гм! Якаб! (Яны адыходзяць)

Мама: (Махае ўслед рукою) І не спазьніцеся на аўтобус – і не забудзьце зьесці канапкі... і яблыкі... і будзьце разумныя... і – (трохі расчаравана) – пайшлі!

(Лясная паляна. Тата нясе пляцак, дзьве дзіцячыя курткі і дзьве шапкі. Элізабэт трымае маленькі букецік кветак і вербачак альбо галінак арэшніку.)

Элізабэт: У мяне ўжо дастаткова кветак на гэтыя маленькія вазачкі.

Якаб: Я таксама так лічу.

Элізабэт: Ты лепш памаўчы, у цябе ніводнай кветкі!

Якаб: Я хачу знайсьці асаблівую кветку!

Элізабэт: Вось як – і як яна павінна выглядаць?

Якаб: Я яшчэ ня ведаю. Гэта павінна быць асаблівая кветка. (Робіць яшчэ некалькі крокаў)

Элізабэт: Тата, патрымай, калі ласка, мае кветкі. Я пашу-

каю яшчэ трохі моху.

Тата: (Трымае шапкі, курткі і кветкі) Хітранькія, я павінен насіць за вамі ўсе вашыя рэчы, так?

Якаб: Вось нешта ясьнее! Тут паміж камянёў. (Ён бачыць жоўтую кветку падбелу)

Якаб: Тата, хадзі сюды, калі ласка! Я знайшоў жоўтую кветку. Што гэта за кветка?

Тата: (Скідае пляцак, падыходзіць бліжэй) Гэта падбел.

Якаб: Падбел! Элізабэт, хадзі хутчэй, я знайшоў незвычайную кветку!

Элізабэт: Праўда? Дзе?

Якаб: Тут!

Элізабэт: Ды кінь ты, гэта падбел! І гэта незвычайная кветка! Ён расьце на кожным сьметніку! За нашай школай, дзе будуецца новая вуліца, ён расьце нават на камяністым схіле! (Ідзе назад)

Якаб: (Да таты) Гэта праўда?

Тата: Падбел цьвіце паўсюль, дзе іншыя кветкі зусім ня хочуць расьці. На сьмецьці, і асыпках, і паміж камянёў. Ён адважны, гэты падбел, праўда?

Якаб: Ён адважны... У гэтым ёсьць нешта асаблівае, калі нехта вось так адважваецца, праўда?

Тата: Ты маеш рацыю, Якаб, гэта нешта асаблівае. (Ён ідзе назад да пляцака. Якаб застаецца з кветкаю)

Якаб: Ты такі прыгожанькі, жоўценькі, мой падбел. Ты мне падабаешся. Я вазьму цябе з сабою дамоў. (Матылёк сядае на падбел) Гэй ты, гэта мая кветка! Хаця добра, трохі адпачыць табе дазваляецца! Але ня доўга, нам трэба ісьці на аўтобус. Пашукай сабе іншую кветку! (Азіраецца) Ты тут толькі адна, кветачка? Але вось яшчэ! (Матылёк паляцеў далей) Напэўна, цяжка вось так цьвісьці паміж камянёў? Ведаеш што, я выкапаю цябе разам

з карэньчыкамі... ці можа не? Ты мог бы цьвісьці далей у нашым садзе разам з цюльпанамі і нарцысамі! Гм! Але яны ўсе большыя за цябе... Ці можа мне трэба вакол цябе зрабіць загародку з каменьчыкаў, каб кожны бачыў, што ты асаблівая кветка... А калі я пакіну цябе тут – калі я пакіну цябе далей цьвісьці тут – ты ўсё роўна будзеш маёй асаблівай кветкай. Ты мая кветка! (Паварочваецца да таты) Тата – калі ласка, вырві мне аркушык з твайго нататніка і напішы мне нешта, добра?

Тата: (Седзячы на пляцаку) Што я павінен напісаць?

Якаб: Я скажу табе на вуха...

Элізабэт: Вось, цяпер у мяне ёсьць і мох для маіх вазачак з яечных шкарлупак. Як прыгожа будзе на велікодным стале, і якім прыгожым будзе Вялікдзень! Якаб! Ты ўсё яшчэ ня маеш аніякай кветкі?

Якаб: Паглядзі вунь туды!

Элізабэт: (Перад кветкай, вакол якой пабудавана моцная агароджа з камянёў і побач утыркнутая палка з цыдулкаю). Што тут напісана? (Чытае) «Гэта асаблівая кветка. Яна адважная. І яна належыць Якабу.»

Якаб мае кветку

Здавалася б, каштоўнасьць кветкі павінна вызначацца яе коштам. Дарагія кветкі больш каштоўныя за танныя. Кветкі, якія растуць паўсюль і асабліва кветкі пустазельля ўвогуле нічога ня вартыя. Так, здавалася б, можна было б акрэсліць агульнапрынятыя меркі. Але кожны ведае, што адна ружа можа быць ня вартая іншай. Каштоўнасьць кветкі канчаткова вызначаецца тым, хто яе падарыў, пра што можа расказаць гэтая кветка, для чаго яна прызначалася, што яна

азначае. Сапраўдны кошт кветкі вызначаецца не грашовымі адзінкамі, а паўсталымі сувязямі, якія яна перадае.

Магчыма, у тым імкненьні не зьбіраць аднолькавыя кветкі (што і робіць Элізабэт) ёсьць пэўнае суперніцтва паміж братам і сястрою. Ці можа Якаб думае ня так мэтанакіравана. Ён толькі пачынае адкрываць сьвет вясновых першацьветаў. І вось ягоная ўвага скіроўваецца на непрыкметную кветачку, якая зіхаціць жоўценькім колерам. Якаб у захапленьні ад адкрыцьця гэтай кветкі. Для Элізабэт гэтая кветка мала што значыць, яна для яе занадта звычайная. Сястры не хапае таго замілаваньня, якое адчувае брат. Тата дапамагае Якабу ўрэшце вызначыць асаблівасьць ягонай кветкі: «Яна адважная». Якаб зрабіў гэтую кветку сваёю. Якаб «прыручыў» яе, кажучы словамі «Маленькага Прынца» (Антуан дэ Сэнт-Экзюпэры). Ён зрабіў яе вельмі блізкай сабе. Яе, якая расьце там, дзе больш нічога не расьце, яе, якая зьяўляецца для яго сімвалам мужнасьці.

Тым самым рыхтуецца глеба да пазьнейшага разуменьня боскіх таямніцаў. Тата адкрывае Якабу шматграннасьць сьвету. Для Якаба кветка становіцца нечым дасканалым, дзякуючы паўсталым адносінам да яе і дзякуючы таму, пра што расказвае яму кветка. І толькі той, для каго маюць сэнс і становяцца сімвалам рэчы гэтага сьвету, можа зразумець сімвалы (lat. Sacramentum) хлеба і віна.

Якаб моліцца

(У дзіцячым пакоі. Элізабэт, у начной кашульцы, ужо ў ложку і чытае кніжку. Якаб, яшчэ апрануты, стаіць ля вакна і глядзіць на вуліцу. Гарыць маленькая лямпа. Мама падбівае пасьцель Якаба.)

Мама: Якаб, кладзіся ў ложак!

Якаб: (Не рэагуе)

Мама: У Якаба сёньня зноў дзень роздуму. (Падыходзіць да яго, зьлёгку датыкаецца да яго плячэй) Так, дзіцятка, што будзем рабіць? Распранемся і ў ложак? Потым я яшчэ падыйду да вас, і мы памолімся, так, Якаб?

Якаб: Я хачу яшчэ раз хуценька прабегчы праз сад.

Мама: Цяпер, увечары?

Якаб: Так.

Мама: Што ж, добра, ідзі (Якаб адыходзіць).

(Якаб выходзіць з дому, трохі аглядаецца і сыходзіць па лесьвіцы. Вечар.)

Якаб: Мм, вось дык і паветра. (Падыходзіць бліжэй да кветак, нюхае) Яны цяпер так моцна пахнуць. Нашмат мацней, чым у дзень. Гм, гэтая ўжо зусім закрылася. Засынай, кветачка. (Каля кветкі ў выглядзе кубачка) Ты такая прыгожая кветка. Амаль што самая прыгожая ў нашым садзе. Увесь сад прыгожы. Ты так усё прыгожа зрабіў, Божачка – і кветкі, і кусты, і дрэвы. І зоркі. І аблокі. (Падыходзіць да кустоў) Парэчкі яшчэ кіслыя. Трэба яшчэ каб дасьпелі. Але клубніцы, (робіць некалькі крокаў і прымошчваецца каля градкі з клубніцамі) клубніцы сьпелыя. Мм, і салодкія. (Есьць) Клубніцы ты зрабіў хіба што лепшымі за ўсё. Дзякую за клубніцы.

Голас мамы: Якаб, Якаб! Ужо позна.

Якаб: Я ўжо іду.

(Пакой. Якаб у ложку. Мама сядзіць каля яго і гладзіць па галаве. Элізабэт ужо сьпіць.)

Мама: Якаб, давай яшчэ памолімся.

Якаб: Я ўжо памаліўся. Там, у садзе.
Мама: Ты памаліўся ў садзе?
Якаб: Так. Усё такое прыгожае. Я падзякаваў Богу за ўсё.
Мама: Мгм. Тады засынай, Якаб, спакойнай ночы.

(Яна гасіць сьвятло)

Якаб моліцца

Вячэрняя малітва, з якою найбольш знаёмыя дзеці, як зазвычай, сфармуляваная ў словах альбо ў вершаваных радках. Звычайна, у ёй на першым плане прысутнічае просьба пра абарону – абарону, якую бацькі просяць самім сабе, абарону, якую, як баяцца бацькі, яны ня здолеюць самі даць сваім дзецям. Гэтая туга па абароненасьці ўзрастае асабліва вечарам, калі становяцца заўважнымі прыкметы страху, які застаўся ў чалавека ад старыжытных часоў (жаданьне заснуць, забыцца).

Такі ж самы першародны страх бацькі бачаць у сваіх дзецях і робяць аднабаковы націск на вячэрнюю малітву-просьбу. У дзень у чалавека больш шанцаў, ён лічыць сябе больш магутным, ён не адчувае сябе пакінутым на волю лёсу і бездапаможным, як у цемры. Такім чынам, пэўная практыка вячэрняй малітвы садзейнічае разьвіцьцю рэлігійнасьці, саманакіраванай і якая адпавядае ўласным пажаданьням. Вызначальным пры гэтым зьяўляецца ня вопыт адчуваньня абароненасьці і бясьпекі ў Богу, а жаданьне быць абароненым Ім. Як сьведчыць Паўль Цуленэр у сваім дасьледваньні, у Аўстрыі рэлігія перш-наперш разглядаецца як «сьвяты шчыт для абароны маленькага асяродку жыцьця», гэта значыць сям'і. Абмежаваная толькі прыватнай сферай, рэлігія ў Аўстрыі ня вызначыла сваіх адносінаў да штодзённага жыцьця і навакольнага сьвету.

Якаб усёй душой успрымае вечар, напоўнены водарам і сьвежасьцю саду. Ён адкрывае для сябе новы неспазнаны сьвет і дзякуе Богу за Ягоны падарунак – сад. Яго прыязныя адносіны да сьвету паглыбляюцца да ўхваленьня ўсяго, што зрабіў Божачка, і ён выказвае гэтае ўхваленьне ў малітве-падзяцы.

Малітва непасрэдна ў самім жыцьці. Вячэрняя малітва, пасьля таго, як зьбяруцца разам бацькі і дзеці, павінна ўключаць у даверлівы дыялог з Богам падзеі, радасьці і нягоды мінулага дня. Гэта вядзе да сьвядомага ўспрыманьня жыцьця, дае магчымасьць выказаць свае пачуцьці, падзяліцца вопытам і дапамагае дзіцяці адчуць блізкасьць Бога. Разам з падзякай, хвалой і скаргай просьба таксама мае сваё месца ў вячэрняй малітве – просьба пра моц і мужнасьць, пра сапраўдны дух, пра сапраўднае разуменьне сябе самога ды іншых людзей. Такая форма вячэрняй малітвы дапамагае стварэньню сталай рэлігійнасьці, рэлігійнасьці, якая будзе здольная да самааддачы, разважлівасьці і будзе адкрыта да дыялогу з іншымі людзьмі.

Якаб вядзе размову з Богам. На жаль, у вялікіх гарадах ня ўсе дзеці маюць магчымасьць перад сном зрабіць такі вольны «ўздых душой» і выказаць набеглыя пачуцьці падзякі ў дыялогу з Богам. Каб садзейнічаць разьвіцьцю сталай рэлігійнасьці, трэба паспрабаваць знайсьці ў гэтым, часам ня вельмі вясёлым і разнастайным, а хутчэй шэрым, штодзённым жыцьці тыя «прыпынкі», якія дазваляюць выказаць шчырую, сыходзячую ад самога сэрца падзяку Богу.

Я люблю цябе
Сацыяльныя пачуцьці

Часам прыходзіцца толькі дзіву даваццa, як настойліва (і пры гэтым дзеля самых лепшых намераў) бацькі прышчапляюць сваім дзецям станоўчыя сацыяльныя нормы паводзінаў, інакш кажучы, любоў да сваіх бліжніх на практыцы. Усе іх намаганьні дыктуюцца існуючай неабходнасьцю зьмены формаў сёньняшніх адносінаў паміж людзьмі. Патрабаваньні любові да нашых бліжніх пры гэтым падмацоўваюцца аўтарытэтам і спасылкамі на Бога, які наказаў нам любіць сваіх бліжніх і які, адпаведна, кантралюе выкананьне Сваёй запаведзі.

Але самае галоўнае, што трэба падкрэсьліць, дзеці паводзяць сябе ў адпаведнасьці з тымі чаканьнямі, якія ўскладаюць на іх дарослыя. І робяць гэта часам з ахвотай, часам дзеля пахвалы з боку дарослых альбо баючыся пакараньня. У апошнім выпадку добрыя адносіны з людзьмі атрымліваюцца не ад выніку такіх самых добрых пачуцьцяў да іх, а зьяўляюцца дакладным выкананьнем прадпісаньняў дарослых, і тады здаецца, што сам Пан Бог сочыць за іх выкананьнем, узнагароджвае альбо карае, калі яны парушаюцца. Гэта ня толькі ідзе насуперак усяму працэсу станаўленьня дзяцей як людзей, але і разбурае веру ў Бога, які любіць усіх аднолькава без аніякіх заўвагаў і выклікае ў адказ любоў людзей. Вельмі важна, калі дарослыя распачнуць свае размовы пра Бога ў той атмасферы, якая будзе спрыяць узьнікненьню такіх пачуцьцяў, як любоў да блізкіх, спачуваньне іх нягодам і радасьцям. Ажыцьцяўленьню такіх добрых намераў будзе садзейнічаць усё, што дорыць радасьць ад зносінаў, сумоўя з людзьмі. Вядома, размова не ідзе пра тое, каб цалкам адмовіцца ад уласнага «я» і рас-

пусьціцца ў іншых. Не, дзеці павінны вучыцца выказваць свае думкі і меркаваньні і абараняць іх. Усе гэтыя камунікацыйныя здольнасьці разьвіваюцца праз уменьне слухаць, быць уважлівым да людзей. І толькі потым можна падштурхоўваць дзяцей выказваць свае сімпатыі і любоў да бліжніх. Але ня варта патрабаваць немагчымага: калі для вашага дзіцяці пацалунак зьяўляецца найвышэйшай ступеньню павагі альбо сімпатыі, то ня трэба прымушаць іх рабіць гэтак з усімі іншымі людзьмі. Трэба імкнуцца, каб у дзяцей паступова сфармаваліся наступныя правілы:

– кантакты з іншымі людзьмі нас духоўна ўзбагачаюць;

– вельмі важна прыносіць людзям радасьць;

– жыць з іншымі нашмат прыгажэй, чым жыць аднаму.

І толькі тыды мае сэнс гаварыць пра Бога.

Бернхард Гром робіць сваё ўласнае тлумачэньне гэтых словаў: калі мы ўважліва ставімся да іншага чалавека, захоўваем ягоныя правы, калі рыхтуем яму радасьць альбо дапамагаем яму, калі гэта яму патрэбна, тады мы прыносім радасьць ня толькі таму, дзеля кага мы гэта ўсё робім, але таксама і таму, хто падараваў нам жыцьцё і гэты сьвет. Ён нясе дабро іншым людзям праз нас. Бог-Айцец хоча быць Айцом усім людзям і ад усяго сэрца жадае, каб мы клапаціліся ня толькі пра свой дабрабыт, але і пра іншых людзей, каб мы ставіліся адно да другога як сапраўдныя браты і сёстры, а не як ворагі (нават калі нам прыходзіцца абараняцца ад іх) ці як гаспадары і слугі. Ён дае нам дзеля гэтага сваю моц і радасьць, калі мы прыносім радасьць іншым. Хто жадае, можа ўжо цяпер схіліцца перад Ім і ціха сказаць: «Дзякую, Ойча, за ўсё; зрабі мяне гэткім жа справядлівым і добрым, як Ты сам.»

Бернхард Гром упэўнены, што гэтыя словы могуць стаць дэкларацыяй братэрства паміж людзьмі, якія жывуць паводле боскіх запаведзяў і жывога насьледваньня Ісуса.

Якаб робіць гэта задарма

(У садзе. Тата рамантуе вадзяное кола. Якаб дапамагае.)

Якаб: Калі мы заўтра паедзем да бабулі ў сад, дык я адразу змагу выпрабаваць маё вадзяное кола. Яно сапраўды будзе зноў працаваць?

Тата: Чаму ж не ? Цяпер я ўсё выправіў.

Якаб: Рудзі з семнаццатага дому ня сам зрабіў сваё вадзяное кола, а купіў у краме. Але яно ня лепшае за маё.

Тата: (Грукоча малатком) Выдатнае кола.

Якаб: Рудзі ідзе ў краму і купляе сабе рэчы. У яго заўсёды хапае кішэнных грошаў. Заўсёды атрымлівае грошы... Калі для мамы ідзе ў краму ці яшчэ што.

Тата: Ах, вось як? Тады ён атрымлівае грошы?

Якаб: Ці за тое, што вынясе вядро са сьмецьцем... Ня шмат, але ўсё ж такі набіраецца, як кажа Рудзі.

Тата: Так-так.

Якаб: Рудзі атрымлівае грошы таксама ад бабулі ці ад свайго таты. Але Зузі атрымлівае грошы толькі ад мамы. Патаемна. Калі яна добра папрактыкуецца на флейце, напрыклад, ці калі яна пагуляе са сваёй маленькай кузінай... Ведаеш, яна такая маленькая і надакучлівая, гэтая кузіна, і калі яна прыходзіць у госьці, дык мама Зузі заўсёды радуецца, калі Зузі дае свае цацкі, гуляе з маленькай.

Тата: І за гэта Зузі атрымлівае грошы...

Якаб: Так. У Тоні трохі інакш. Ён атрымлівае ад таты грошы за тое, што мые машыну. За гэта ён купляе лізуны. Заўсёды, калі мы зьбіраемся ў групе па-

доўжанага дня, у яго ёсьць лізуны. У Герхарда ніколі іх няма, але Тоні дае яму свае.

Тата: Гэта вельмі добра з боку Тоні.

Якаб: Так, але за гэта Герхард павінен дапамагаць яму пры майстраваньні. Тоні такі нязграбны да выразаньня і маляваньня, ты ведаеш.

Тата: Гэта значыць, ён плоціць Герхарду лізунамі.

Якаб: Прыблізна так. Я таксама б хацеў, каб Герхард дапамагаў мне ляпіць з пластыліну, але ён спытаў: «Што ты мне дасі за гэта?» І ў мяне нічога не было!

Тата: Гм!

Якаб: Але можа быць так, што калі я дапамагу маме ў садзе, яна дасьць мне што-небудзь за гэта. Каб я таксама мог купіць сабе лізуноў.

Тата: Якаб, мне гэта не падабаецца.

Якаб: Што табе не падабаецца?

Тата: Што ты хочаш што-небудзь атрымаць за тое, што ты дапаможаш маме.

Якаб: Але іншыя дзеці...

Тата: Пакінь іншых дзяцей. Не, мне гэта не падабаецца, што нехта толькі тады нешта робіць, калі ён за гэта што-небудзь атрымае.

Якаб: Але ў класе Элізабэт робяць гэтаксама! Яны бяруць не лізунамі, а маркамі, з машынкамі, зьвярамі...

Тата: Ды няўжо?

Якаб: Так, сапраўды. Мне Элізабэт гэта расказвала – даць сьпісаць, падказаць – марка.

Тата: (Разглядае гатовае вадзяное кола)

Якаб: Гатова?

Тата: Так!

Якаб: Дзякую!

Тата: Хвілінку! 20 лізуноў.

Якаб: Што?!

Тата: Ці ты думаеш, што я зрабіў тваё вадзяное кола задарма?

Якаб: (З жахам) Але – але, тата.

Тата: Дык вось, ты бачыш.

Якаб: Ты гэта сур'ёзна наконт лізуноў?

Тата: Не, гэта быў жарт. Я зрабіў гэта табе задарма, таму што ты мой Якаб, і таму што я цябе люблю. І таму што шмат чаго на сьвеце нельга купіць альбо абмяняць. Самыя найлепшыя рэчы атрымліваюць задарма. Іх атрымліваюць як падарунак.

Якаб: Што, напрыклад?

Тата: Ты ня можаш купіць нашую паездку да бабулі. Ці калі хто-небудзь з нас мае ахвоту пагуляць з табою ў «блыху». Ці тое, што Каці цябе любіць. Ці тое, што яна заўсёды дае табе свайго Флёкі. Ці, нельга купіць, каб цябе палюбілі. Вось так. А цяпер я пайду да пана Хубера, ён паабяцаў, што дасьць сваю касілку. Скажы маме, што я ў пана Хубера.

Якаб: Ён дасьць табе яе таксама задарма?

Тата: Вядома, задарма. (Адыходзіць)

Элізабэт: (Зьяўляецца ў вакне) Якаб, у мяне няма больш балончыкаў з атрамантам. Слухай, ты ня змог бы хуценька зьбегаць у канцтавары? Прынесьці скрынку балончыкаў? Я табе дам марку...

Якаб: Ня трэба мне ніякай маркі.

Элізабэт: А што ты хочаш?

Якаб: Увогуле нічога. Я зраблю гэта задарма.

Якаб робіць гэта задарма

У грамадстве шмат што залежыць ад пытаньня «Што мне гэта дасьць?» «Як я магу павялічыць мой уплыў, маю ўласнасьць, мае спажывецкія магчымасьці?» Грамадскія адносіны вызначаюцца «магчымасьцю мець», «патрэбаю мець усё больш», і меркаю іх значэньня зьяўляюцца грошы – грашовыя адзінкі, па якіх вымяраецца значэньне грамадскіх адносінаў. Пры гэтым грошы маюць ня толькі практычнае значэньне, але таксама ўнушальнае ўзьдзеяньне. Шмат хто гатовы за іх зрабіць усё. Узнагароду за паслугу і адносіны да сябе мы бачым скрозь і паўсюль. Ужо ня радасьць ад магчымасьці чытаньня і пісьма ўзнагароджвае намаганьні і выдаткі, а зорачкі, маркі і таму падобнае.

Калі наш 5-гадовы хлопчык павінен быў першы раз пайсьці да зубнога доктара, мая жонка мела спакусу купіць яму што-небудзь як кампенсацыю за візіт да доктара. Яна не зрабіла гэтага і таму цешылася. А наш хлопчык ганарыўся тым, што вытрымаў, калі яму лячылі зубы. Ён ня здолеў бы так радавацца, калі б чакаў узнагароды. Візіт бабулі, каштоўнасьць якога вымяраецца грашовымі паперкамі, перашкаджае ўстанаўленьню асабістых адносінаў паміж унукам і бабуляй. Чым мацней вызначаюцца штодзённыя адносіны зьнішчальным пытаньнем «Што мне з гэтага будзе?», тым больш няздольным робіцца дзіця да ўсталяваньня адносінаў і жаданьня культываваць іх дзеля іх саміх. Аплата маленькіх штодзённых паслугаў толькі павялічвае жаданьне мець як мага больш у прыватнай і асабістай сферы жыцьця.

Калі дзіця, выконваючы свае сямейныя абавязкі, выстаўляе за іх рахунак, мела б сэнс спытаць, якія прычыны маюцца да гэтага. Ці памер кішэнных грошай павінен павя-

лічвацца разам з узростам? Што перажывае дзіця ў сям'і? Ці павінна яно купляць па-за межамі сям'і адносіны да сябе і сваё становішча?

На першы погляд можа падацца, што ўсе гэтыя пытаньні ня маюць аніякага рэлігійнага значэньня. Яны, як быццам бы, трапляюць у разрад чыста сьвецкіх справаў. Але калі ўдумацца, паўстае зусім іншая карціна. Штодзённыя адносіны, якія вызначаюцца пытаньнем: «Што я з гэтага буду мець, што я за гэта атрымаю?» дапускаюць адпаведныя спадзяваньні ў адносінах да Бога. Тым самым разьвіваецца саманакіраваная, у адпаведнасьці з пажаданьнямі, рэлігійнасьць. Ані ў якім выпадку нельга даваць дзецям уяўленьне пра Бога, як пра таго, хто ідзе насустрач усім нашым пажаданьням і знаходзіцца ў нашым распараджэньні проста за «дзякуй».

Тое, што складае жыцьцё, узбагачае, тое што дае жыць і стварае будучыню, нельга купіць. Той, хто дае дзецям гэта зразумець, адкрывае перад імі дарогу да Бога, Айца Ісуса.

Якаб ня хоча быць прагным

(Апоўдні. Якаб перад домам майструе свой човен. Расчыняецца вакно і паказваецца Элізабэт.)

Элізабэт: Якаб? Як добра, што ты тут. Я хачу табе нешта паказаць. (На момант зьнікае, Якаб падыходзіць да вакна)

Якаб: Што?

Элізабэт: (Зноў зьяўляецца ў вакне са сваёю скарбонкай і трасе яе)

Якаб: Гэта тая скарбонка, у якую ты пачала зьбіраць грошы з масьленіцы?

Элізабэт: Так. Ты толькі паслухай.

Якаб: Напэўна, шмат шылінгаў.

Элізабэт: Я ўсё-усё капіла, што мне давалі на шакаладкі і марожанае. У нашым класе ўсе зьбіраюць грошы, бо заўтра мы высыплем іх у адзін ворах і пашлем іх дзецям Індыі.

Якаб: Чаму менавіта ім?

Элізабэт: Таму што ў Індыі жыве шмат дзяцей, якім не хапае на ежу і вопратку.

Якаб: Ведаеш, там у маёй блакітнай куртцы павінен быць шылінг – можаш яго таксама дакласьці.

Элізабэт: Дзякую, ты такі добры, Якаб. Наш настаўнік па рэлігіі кажа, што Божачка хоча, каб усе людзі, яго дзеці, дзяліліся паміж сабою. Як браты і сёстры.

Якаб: (Зацікаўлена) Як браты і сёстры?

Элізабэт: Усе людзі – Божыя дзеці, таму так і кажуць, разумееш?

Якаб: Добра. І што, напрыклад, могуць падзяліць паміж сабою брат і сястра?

Элізабэт: Ды ўсё магчымае.

Якаб: Напрыклад, шакалад?

Элізабэт: Напрыклад.

Якаб: Але, на жаль, у цябе няма шакаладу, таму што ты ўсе грошы паклала ў скарбонку...

Элізабэт: Гм – мне здаецца, я прыхавала плітку шакаладу, якую мне дала бабуля...

Якаб: (Цешыцца) Так, ты магла б яе падзяліць са мною... таму што мы брат і сястра...

Элізабэт: (Кароткі ўздых) Добра, я падзялюся з табою (зьнікае з вакна).

Якаб: (Крычыць усьлед) Божачка таксама хоча, каб усе дзяліліся, праўда...?

Элізабэт: (Зноў зьяўляецца ў вакне, працягвае палову плітки шакаладу)

Якаб: Дзякую! А што яшчэ можна было б падзяліць адзін з адным?

Элізабэт: Яблык, кавалачак пірага.

Якаб: Твой лялечны куточак таксама?

Элізабэт: Мой лялечны куточак?! Не, яго нельга слушна падзяліць... (робіць у сабе патрэбнае душэўнае намаганьне) Але я магу табе дазволіць пагуляць з маім лялечным куточкам: што нельга падзяліць, тым можна даць пакарыстацца, праўда?

Якаб: Ага, ага! Напрыклад, каляровыя алоўкі... ты ня можаш іх падзяліць паасобна, ты павінна даць мне імі пакарыстацца...

Элізабэт: Так.

Якаб: Ведаеш, мне падабаецца ўсё дзяліць – я зайду да цябе (хутка ўбягае ў дом)

(Дзіцячы пакой. Мама прасуе бялізну альбо займаецца нечым іншым. Элізабэт трымае школьны ранец. На стале стаіць скарбонка.)

Якаб: (Хутка ўбягае) Кнігу таксама нельга падзяліць – яе таксама трэба даць – ты дасі мне кнігу пра маленькага індзейца?

Элізабэт: Так, бяры.

Якаб: Калі ты мне яе дасі, ты пачытаеш мне што-небудзь з яе?

Мама: Якаб, я ўвесь час цябе слухаю – увесь час чую, як ты кажаш, што Элізабэт павінна з табою дзяліцца і што-небудзь табе даваць. Я лічу, што гэта нясслушна. Ты таксама павінен дзяліцца сваімі рэчамі з ёю. Ты ж ня хочаш быць прагным...

Якаб: Не, я не хачу быць прагным... (Думае) Што б ты хацела, Элізабэт? У мяне ёсьць жуйка, я толькі раз яе лізнуў. Хочаш?

Элізабэт: Не, дзякуй, напраўду не хачу.

Якаб: Ведаю. Я дам табе майго дажджавога чарвяка – разам са шклянкаю з зямлёю, дзе ён жыве. Ты можаш паставіць яе каля свайго ложка і ўвесь час назіраць, што робіць чарвяк, хочаш?

Элізабэт: Не, дзякуй! Я не хачу ніякай шклянкі каля майго ложка, каб назіраць, што робіць чарвяк!

Якаб: Дык а што тады? Я ведаю яшчэ нешта. Я мог бы расказаць табе гісторыю пра каляровага сабаку, якую ты мне чытала ўчора.

Элізабэт: Не, Якаб, гэтую гісторыю я ведаю амаль што напамяць.

Якаб: (Зьвяртаецца да мамы) Што я ні прапаную, яна адказвае – не.

Мама: Можа ты знойдзеш каго-небудзь іншага, каму ты здолееш што-небудзь прапанаваць?

Якаб: Іншага?

Элізабэт: (Хоча ад яго адчапіцца) Так, гэта добрая прапанова.

Якаб: Гм, гм. Я ўжо ведаю, хто гэта... (Выходзіць, чуваць, як ён набірае нумар тэлефона і праз адчыненыя дзверы відаць яго з трубкай у руцэ; ён звоніць Каці) 32 42 15... Алё! Гэта Якаб! Можна пагаварыць з Каці? Гэта ты, Каці, прывітаньне! Хутчэй выходзь! У мяне нешта ёсьць для цябе... У мяне ёсьць чалавек, які будзе чытаць табе кнігі і даваць рознакаляровыя алоўкі і дзяліцца з табою шакаладам... Так, я дам табе сваю сястру!

Якаб ня хоча быць прагным

Мы жывем у грамадстве, у якім стала немагчымым быць усім задаволеным, праводзіць мяжу паміж тым, што маеш

і патрэбаю мець яшчэ больш. Падзяліцца – уласна кажучы, гучыць, як нешта незразумелае. Пры гэтым, звычайна, адбываецца так, што той, хто «па-сапраўднаму» ня можа нічым падзяліцца, ніколі ня мае нічога даволі. Але калі б усе людзі дзяліліся, ўсім бы хапала.

Гэтая гісторыя паміж Якабам і Элізабэт прадстаўляе нам здольнасьць чалавека дзяліцца і аддаваць што-небудзь іншым як вельмі важную з усіх здольнасьцяў чалавека. Але спачатку Якаб даведваецца пра тое, як слушна трэба гэта рабіць. Дзяліцца – гэта ня значыць выконваць усе прадпісаныя дарослымі ўказаньні, гэта нешта важнае, дзеля чаго можа падаваць зручныя прапановы, якім чынам можна правесьці «падзел», каб гэта было карысным для абодвух бакоў, у нашым выпадку для Якаба і Элізабэт.

Пры гэтым мама выказвае свае чаканьні ў адносінах да Якаба: «Якаб, ты ж ня хочаш быць прагным?» Але яна не дае дзіцяці ніякіх настаўленьняў. Гутарка вызначаецца ня страхам перад пакараньнем ці жаданьнем заслужыць пахвалу за чаканыя пэўныя дзеяньні, а лёгкай, цёплай, спрыяльнай атмасферай. Мама дае штуршок да таго, каб гутарка на гэтую тэму не абарвалася, і ў той самы час, яна ніякім чынам не вызначае таго, што і як павінна адбыцца. Якаб не падаўляецца патрабаваньнямі мамы, а ў значнай ступені падштурхоўваецца імі да далейшых дзеяньняў. Мама ні ў якім выпадку не спрабуе зьдзейсьніць свае спадзяваньні ў адносінах да Якаба з дапамогаю націску, сілы. Вывучэньне шырока распаўсюджанай практыкі, тыпаў сацыяльных адносінаў, сьведчыць пра тое, што дзецям трэба падаваць нейкую ідэю, а ўжо яе распрацоўкай яны будуць займацца самі. Чым мацнейшым будзе ціск на дзяцей, тым больш вузка будуць успрымацца ўказаньні бацькоў. Зрэшты, гэта можа паспрыяць толькі большаму страху з боку дзіцяці. Гісторыя Якаба і Элізабэт паказвае таксама, што здоль-

насьць «падзяліцца з беднымі» толькі тады мае сэнс, калі мы гатовы падзяліць жыццё з людзьмі, якія нас акаляюць. Гатоўнасьць зрабіць што-небудзь для іншага чалавека бярэ свой пачатак у першапачатковай сферы, у сферы сям'і. Уся мараль нашай гісторыі заключаецца ў тым, што я дзялюся ня толькі прадметамі, але і адносінамі: «Я дам табе сваю сястру !» У дадзеным выпадку Бог паўстае перад намі не як асоба, якая аддае загады, пагражае, усё бачыць і кантралюе, перад якой я адчуваю сябе маленькім. Не, Бог паўстае перад намі як той, хто спрыяе ўстанаўленьню брацкіх адносінаў паміж людзьмі, садзейнічае і стварае для іх аснову, якая дазваляе людзям дзяліцца адзін з адным.

Якаб і брудная праца

(Дзіцячы пакой, амаль што вечар. На палічцы стаіць малюнак, Якаб стаіць перад ім і зьдзіўлена разглядае яго.)

Якаб: Што гэта! Дзіўна! Гм!

Тата: (У шапцы, паліто і з папкаю ў руцэ зьяўляецца ў дзьвярах) Прывітаньне, Якаб. Ты ня ведаеш, дзе мама?

Якаб: Яны з Элізабэт пайшлі на сьвяткаваньне Вялікага Чацьвярга ці як там. (Цалуе тату ў знак прывітаньня) Добры дзень, тата. Добра, што ты прыйшоў. Мне трэба ў цябе нешта спытаць.

Тата: Хвілінку. Я толькі здыму паліто і потым падыйду да цябе. (Адыходзіць, дзьверы застаюцца адчыненымі, Якаб зноў перад паліцаю)

Якаб: (Зьвяртаецца да таты) Паглядзі на гэты малюнак, што намалявала Элізабэт. Я нічога не магу зразумець у гэтым малюнку. Напэўна, бабуля што-небудзь зразумее. Яна атрымае малюнак у падарунак на Вялікдзень.

Тата: (Уваходзіць з газетаю, падыходзіць да Якаба, глядзіць на малюнак) Гэта, відавочна, малюнак Ісуса і яго сяброў. Вось гэты з барадою – гэта Ісус.

Якаб: Добра. Але чаму Ён трымае насоўку ў адной руцэ і коўш з вадою ў другой?

Тата: Ах так. Элізабэт намалявала, як Ісус перад апошняй вячэрай абмыў ногі сваім сябрам.

Якаб: А што яны самі не маглі памыць сабе ногі? Я ўжо даўно ўмею гэта рабіць. І шыю таксама.

Тата: (Усаджваецца як найлепей) Ведаеш, Якаб, раней людзі насілі сандалі, ня мелі ніякіх шкарпэтак і абутку, як мы. Калі яны ішлі па пыльнай вуліцы, дык ногі рабіліся бруднымі. Дык вось, калі сябры Ісуса прыйшлі на вячэру, іх ногі былі ўсе ў пыле. Тады гасьцям, перад тым як сесьці за стол, мылі ногі. Гэта рабілі слугі. Але Ісус не лічыў, што гэта было нявартым Ягонай годнасьці.

Якаб: Сёньня яшчэ ёсьць такая праца, якую выконваюць толькі слугі?

Тата: Ва ўсе часы была такая праца, якую не любілі рабіць, так бы мовіць, брудная праца.

Якаб: У нас таксама?

Тата: У кожнай сям'і.

Якаб: Што, напрыклад?

Тата: Гм, напрыклад, выносіць сьмецьце.

Якаб: Ідэя! Я таксама зраблю сёньня якую-небудзь брудную працу. Я вынесу сьмецьце. (Выходзіць, дзьверы застаюцца адчыненымі. Чуваць, як Якаб сьпявае) Сёньня я зраблю якую-небудзь брудную працу! (Уваходзіць зноў) Татачка, але вядро ад сьмецьця ўжо пустое! Ты яго выносіў?

Тата: Не.

Якаб: Можа мама?

Тата: Магчыма.

Якаб: Тата, а мыццьё посуду таксама брудная праца?

Тата: Гм, я ня ведаю.

Якаб: Калі каструлі такія тлустыя і з прыгаркамі?

Тата: Напэўна.

Якаб: Добра, тады я іду мыць посуд. (Выходзіць, чуваць, як ён сьпявае) Сёньня я зраблю якую-небудзь брудную працу!

(Зноў уваходзіць) Вой! Аніводнай бруднай каструлі! Няма чаго мыць! (Прымошчваецца каля таты) Слухай, у нас няма ніякай бруднай працы!

Тата: (Апускае газету) У гэта я ніколі не паверу!

Якаб: Так-так, аніякай. Таму што мама заўсёды ўсё робіць, ніхто нават не заўважае, калі яна гэта робіць! Ты заўважаеш?

Тата: Н-не. Чакай, дай мне падумаць... Абутак!

Якаб: Абутак?

Тата: Наш абутак, у якім мы хадзілі ў лес, учора быў такі брудны, увесь у зямлі, па якой мы хадзілі. Мы паставілі яго каля дому, каб ён прасох.

Якаб: Я магу яго пачысьціць. Ю-ху!

Тата: Я табе дапамагу!

(Абодва прыходзяць у захапленьне. Тата і Якаб каля дому азіраюцца ў пошуках абутку – дарэмна)

Якаб: Зьнік! У абед абутак яшчэ стаяў тут. Я гэта дакладна ведаю! Я амаль што ня ўпаў, калі зачапіўся. Цяпер яго няма!

Тата: Напэўна, яго мама пачысьціла.

Якаб: Шкода. Гэта была б сапраўдная брудная праца. Мама заўсёды так хутка ўсё робіць... Яна робіць усю брудную працу.

Тата: (Энэргічна) Але ў гэтым доме павінна быць яшчэ

нейкая праца, якую мы абодва маглі б зрабіць !!! – Прапылесосіць?

Якаб: Памыць вокны? (Яны разглядаюць вокны)

Тата: (З палёгкай) Ужо трохі брудныя, так?

Якаб: (З уздымам) Страшэнна брудныя !!!

(Яны кідаюцца ў дом)

Якаб і брудная праца

Насуперак дэкляраванай у грамадстве роўнасьці, жанчына, звычайна, у сямейнай сферы вельмі часта застаецца прыслужніцай усёй сям'і. Праца па хатняй гаспадарцы застаецца незаўважанай астатнімі членамі сям'і, якія не бяруць у ёй удзел, і не ўсьведамляецца імі. У выніку такога выхаваньня, менавіта сыны пераўтвараюцца ў трутняў. Калі ж яны дапамагаюць па хатняй гаспадарцы, дык гэта лічыцца тады нейкай асаблівай і незвычайнай якасьцю мужчынскай паловы. Менавіта таму, калі справа заходзіць пра нешта бруднае, напрыклад, мыцьцё посуду, чыстка абутку, прыбіраньне туалета, мыцьцё падлогі альбо чыстка вокнаў, зрэдку можна ўбачыць так званых «паноў творчасьці».

У такіх абставінах вельмі рана пачынае закладацца неўсьведамляльны, але глыбока ўкаранелы мужчынскі менталітэт. Ён выступае насуперак партнёрскім адносінам і арганізацыі сумеснага жыцьця. Некаторыя лічаць, што дзеці перагружаныя школай. Часам для мамы прасьцей зрабіць усё самой, калі ёй пры гэтым ніхто не перашкаджае, чым прасіць дзяцей, таму што дапамога дзяцей часта патрабуе дадатковай працы і нерваў. Але тым самым мамы пазбаўляюць дзяцей шанцу прыняць удзел у яе працы па хатняй гаспадарцы, шанцаў браць на сябе адказнасьць, суразьмерную з узростам, і рабіць нешта самім. Калі дзеці ўжо падрастуць

і прызвычаяцца да таго, што побач усё адбываецца бяз іх, тады вельмі цяжка будзе прыдумаць матывацыю для іхняй дапамогі. Агульнае абмеркаваньне неабходнай для выкананьня працы, «абмеркаваньне дзяжурстваў», на якім выпрацоўваецца «план дзяжурстваў», дапамагае дзецям зразумець неабходнасьць таго, што кожны ў сям'і павінен выконваць свае абавязкі, – як, напрыклад, у нашай гісторыі, тата, які з дапамогаю Якаба пачынае разумець гэта і падштурхоўваецца сынам да дзеяньняў. На пачатку гісторыі пошука бруднай працы ідзе біблейская гісторыя, падчас знаёмства з якой Ісус становіцца для Якаба ўвасабленьнем і прыкладам новага братэрства, клопату пра бліжняга. Якаб падштурхоўваецца да таго, каб самому выканаць якую-небудзь працу. У той самы час вельмі ясна паказана, як шмат з біблейскіх апавяданьняў сёньня здаецца дзецям чужым і незнаёмым і адкрывае свой сэнс толькі з дапамогаю дарослых. Біблейскія гісторыі, напісаныя для дарослых, у сваім тыповым, прынятым перакладзе застаюцца незразумелымі дзецям. Падчас апавяданьня такіх біблейскіх гісторый, трэба улічваць дзіцячы узрост і апавядаць як мага больш даступней. Напрыклад, перад тым, як апавядаць гісторыю пра тое, як Ісус абмыў ногі сваім вучням, трэба растлумачыць дзецям, што раней існавалі такія звычаі, але цяпер гэта не ўжываецца ў нашым жыцьці, хоць і ёсьць людзі, якія выказваюць свае брацкія пачуцьці у адносінах да іншых людзей на свой уласны манер і спосаб.

У большасьці дзіцячых кніг Ісус вельмі часта паказваецца так, нібы Ён жыве у баку ад рэальнага сьвету, нібы лунае над рэчаіснасьцю, усё ведае і усё можа, чалавечая прырода якога, аднак, не ўспрымаецца сур'ёзна. Гэтая біблейская гісторыя дапамагае нам убачыць Ісуса як чалавека – прыклад і штуршок для братэрскіх адносінаў да іншых, гатоўнасьці любіць бліжніх і служыць ім.

Якаб грае ролю сьвятога Марціна

(Якаб і Каці гуляюць у сваім пакоі. Якаб сядзіць верхам на Флёкі і робіць выгляд, нібыта скача. Тата зазірае ў дзьверы.)

Якаб: Пасьпяшайся, мой коню, каб мы хутчэй дабраліся дамоў!

Каці: Гэй-гэй, мне так холадна, я хачу есьці, добрыя людзі, дапамажыце.

Тата: Ах, вы гуляеце – тады я ня буду перашкаджаць.

Якаб: Можаш сабе застацца і паглядзець. Нам усё роўна патрэбныя гледачы, якія будуць пляскаць у ладкі.

Тата: Ага, гэта будзе сьпектакль? Добра, пагляджу... Тады я можа трохі ачомаюся. Старая пані Свабода зноў злавіла мяне на вуліцы і расказала палову свайго жыцьця. Як той млын. Што ў яе нікога няма, хто б яе слухаў, што сваякі не клапоцяцца пра яе, гэта проста жахліва. Але добра. І як называецца сьпектакль?

Каці: Марцін і жабрак. Я – жабрак.

Якаб: А я сьвяты Марцін, а Флёкі – мой конь.

Тата: Флёкі, ах ты, Божачка.

Якаб: Я толькі раблю выгляд, нібыта скачу. Не па-сапраўднаму.

Тата: Добранька. Тады працягвайце.

Каці: Заўтра ў дзіцячым садку спектакль.

Якаб: Марцін з новага дому, ты ведаеш, ён быў у шпіталі, у яго быў апендыцыт, і ён заўтра толькі першы раз ідзе ў сад, і яму нельга рэзка рухацца.

Каці: Таму мы будзем граць для яго сьпектакль, каб суцешыць. Сьвяты Марцін яго патрон, таму што яго

завуць гэтаксама.

Тата: А той жаўнер у шынялі.

Якаб: Гэта не шынель, гэта накідка, такая як у мамы.

Тата: Кавалерыйскі плашч – зразумела.

Якаб: Строі мы атрымаем толькі заўтра. Уяві сабе, татачка, у мяне яшчэ будзе плашч і меч.

Тата: Так-так, магу сабе ўявіць.

Каці: Я сяджу перад брамаю і жабрую: «Аё-ёй, мне так холадна, я амаль што замёрз. Людзі, дапамажыце маёй бядзе».

Якаб: «Што бачу я тут каля брамы? Беднага жабрака. Усе праходзяць каля яго. Ніхто нічога не падасьць яму. Вось якія кепскія. Усім на яго наплявaць. Разумееш, Флёкі?»

Флёкі: Брэх!

Якаб: Я таксама не разумею. Гэта вышэй усялякага разуменьня, што ніхто пра яго не клапоціцца. Ведаеш што, я падумаў, што гэты жабрак трапіў мне спецыяльна. Я павінен клапаціцца аб ім. Усё цяпер зразумела. Божачка спецыяльна паслаў яго мне, таму што гэты жабрак мог дастацца каму іншаму. Флёкі, мой коню, хутчэй наперад!

Каці: Коньнік, зьмілуйся, не праязджай каля беднага чалавека!

Якаб: Чакай, у мяне штосьці ёсьць для цябе! А-ёй, дзе ж мае грошы? Ужо ўсе параздаваў. Гэй ты, жабрак, ведаеш, я падару табе што-небудзь цёплае ўкутацца. Палову майго плашча. Яго хопіць нам абодвум. Дзе мой меч – вось так, раз-два (расьсякае плашч на дзве столкі) Вось табе частка, трымай, можаш завярнуцца ў яе.

Каці: Вялікі дзякуй табе, добры чалавек.

Якаб: Калі ласка, калі ласка. Няма за што. (Зьвяртаец-

ца да таты) Як, табе падабаецца?

Тата: Брава, жабрача! Брава, сьвяты Марцін! Брава, Флёкі!

Каці: Мне здаецца, заўтра ўсё атрымаецца. Я сёньня вечарам яшчэ раз парэпетую разам з мамай. Хадзем, Флёкі. Да пабачэньня!

Тата: Да пабачэньня, Каці!

Якаб: Пакуль!

(Каці з сабакам адыходзяць)

Якаб: (Сядае каля таты) Ведаеш, што мне больш за ўсё падабаецца? Тое, што сьвяты Марцін здагадаўся, што жабрак быў прызначаны спецыяльна для яго. Яго яму паслаў Божачка. Як ты думаеш, ён пашле мне калі-небудзь таксама такога жабрака?

Тата: Гэта можа быць не абавязкова жабрак.

Якаб: Так, проста той, пра каго можна было б клапаціцца. Як, напрыклад, Божачка заўсёды дасылае пані Свабоду, каб было каму яе выслухаць.

Тата: (Уздрыгвае) Пані Свабода – ведаеш...

Элізабэт: (Крычыць з вуліцы) Тата, Якаб! (пасьпешліва ўваходзіць) Мама хоча, каб я зьбегала ў краму на рагу па блакітны шоўк, але пані з той крамы заўсёды злуецца, калі нехта прыходзіць перад самым закрыцьцём. Тата, можа ты за мяне сходзіш?

Тата: Цяпер, калі я толькі-толькі прыйшоў дамоў. І наогул, шоўк – гэта не мая справа. Я яшчэ прынясу ня тое, што трэба – ёсьць безліч адценьняў аднаго колеру, ты сама ведаеш – не, я, праўда, не магу. (Адыходзіць)

Якаб: Ну так, калі ўжо няма з каго выбіраць... – добра, я схаджу з табою.

Якаб грае ролю сьвятога Марціна

Кожны час патрабуе свайго ўзору, свайго прыкладу. Ня дзеля таго, каб іх можна было сьлепа капіраваць, якія б зьбіралі вакол сябе натоўпы фанатыкаў. Не, яны зьяўляюцца на сьвет як кантрастная супрацьлегласьць свайму часу, свайму асяроддзю. Адным з такіх узораў свайго часу быў Марцін Турскі, сьвяты, які пражыў усё жыцьцё ў складаных адносінах са сваімі сучасьнікамі. Сын вайсковага камандзіра, ён атрымаў імя ў гонар бога вайны Марса. Потым, калі ён навярнуўся да веры, ён адмовіўся ад прадугледжанай на яго жыцьцёвым шляху ваеннай кар'еры. Людзі былі так уражаны ягоным жыцьцём, якое ён веў пустэльнікам пад мурамі горада, што запрасілі яго стаць іхнім біскупам. Ён згадзіўся, але з той ўмоваю, што будзе працягваць сваё простае пустэльніцкае жыцьцё каля гарадскіх муроў. Нават у прысутнасьці імператара ён не зьвяртаў аніякай увагі на цэрыманіял і становішча прысутных па рангу.

Сёньня яшчэ дзе-нідзе ёсьць звычай, калі пастух, які знаходзіцца ў самым нізе сялянскай сацыяльнай лесьвіцы, 11 лістапада дае жывёле бласлаўленьне сьвятога Марціна. У дадзеным выпадку праяўляецца адхіленьне ад агульнапрынятага складу мышленьня, якое павінна адпавядаць грамадскаму становішчу. Напэўна, сьвяты Марцін, як і Францішак Азізскі, адкрываецца для людзей як «альтэрнатыўны» сьвяты. Яго бясстрашныя выступленьні супраць уладароў уражвалі ня толькі яго сучасьнікаў.

Гэты сьвяты вядомы таксама дзякуючы «гусю сьвятога Марціна» – цэнтральнаму пункту ў сьвяткаваньні старадаўняга пышнага сьвята ўраджая, якое сьвяткуецца 11 лістапада, перад пачаткам старога шасьцітыднёвага вялікага посту і зьвязаных з ім пастоў.

Легенда пра сустрэчу з жабраком зьяўляецца сапраўдным эпізодам з жыцьця сьвятога Марціна. Сьвяты Марцін быў крануты нястачаю жабрака і дзейнічаў у адпаведнасьці са сваімі ўласнымі магчымасьцямі. Як мы бачым на прыкладзе Ісуса ў гісторыі з бедным самаранінам, бліжні – гэта чалавек, якому патрэбны менавіта **я**: «Мне падабаецца тое, што сьвяты Марцін зразумеў, што жабрак быў пасланы сьпецыяльна для яго.» Легенды могуць адкрыць дзецям вочы на разуменьне патрэбаў жыцьця і падштурхнуць іх да дзеяньняў. «Мець каго-небудзь, пра каго можна было б клапаціцца.» Тым самым дзіцяці прышчапляюцца сьвядомыя маральныя ўчынкі, якія ніколі нельга прышчапіць пакараньнем альбо ўзнагародаю.

Якаб раўнуе

(Якаб гуляе з Флёкі каля дому. Выходзіць тата, Флёкі абнюхвае яго.)

Тата: Добры, добры Флёкі.

Якаб: Каці дала мне яго пагуляць да вечара.

Тата: Як міла. Якаб, калі прыйдзе мама, скажы ёй, што я пайшоў па Элізабэт. У яе якраз павінен скончыцца ўрок музыкі. Мы трохі пагуляем па горадзе, можа трохі прыпозьнімся. (Адыходзіць)

Якаб: (Глядзіць яму ўсьлед) Ах вось як!

Флёкі: Брэх!

Якаб: Ніколі ён не спытае, ці не хачу я таксама пайсьці разам...

Флёкі: Брэх?

Якаб: Магчыма, яны пойдуць яшчэ па марожанае ці ў кандытарскую – але без мяне. Мне так сумна, Флёкі.

Флёкі: Брэх, брэх, брэх.

Якаб: Сапраўды, вельмі сумна.

Мама: (Вяртаецца з кошыкам, з якім хадзіла ў краму) Якаб, ты ўсё сядзіш адзін.

Якаб: Не, разам з Флёкі – ён мяне суцяшае – тата пайшоў па Элізабэт.

Мама: Добра.

Якаб: Потым яны яшчэ трохі пагуляюць – так сказаў тата.

Мама: Напэўна, яны добра прабавяць час. (Зьбіраецца адыйсьці)

Якаб: Тата любіць Элізабэт больш за мяне, праўда?

Мама: Як ты сказаў?

Якаб: Тата любіць Элізабэт больш за мяне.

Мама: Чаму ты так падумаў?

Якаб: Ён забірае яе з музыкі, і потым яны ідуць есьці марожанае і наогул.

Мама: Якаб, мы з татам па чарзе забіраем Элізабэт, каб яна не хадзіла ўвечары адна.

Якаб: Але тата заўсёды так мітусіцца каля Элізабэт. Ёй дазваляецца болей за мяне. Напрыклад, пазьней класьціся спаць.

Мама: Але яна трохі старэйшая за цябе, праўда?

Якаб: І калі яна пішчыць на сваёй флейце, тады тата ў захапленьні. У мяне вушы баляць, калі яна так грае. А яму нічога.

Мама: Ведаеш, тата любіць музыку, і ён спадзяецца, што некалі і Элізабэт музыка таксама будзе прыносіць задавальненьне. Таму ён яе натхняе і падтрымлівае.

Якаб: Мяне ён ніколі не падтрымлівае, калі я граю на бубне.

Флокі: Брэх!

Мама: Якаб, мне падаецца, што ты раўнуеш.

Якаб: Ён не павінен любіць Элізабэт болей за мяне!

Мама: (Сядае на лаву) Якаб.

Якаб: Ён павінен любіць нас аднолькава.

Мама: Ведаеш, Якаб, я нават ня ведаю – ці можна наогул любіць усіх аднолькава. Напрыклад, торт можна падзяліць на роўныя кавалкі, калі пастарацца. Але калі мы гаворым пра любоў, дык немагчыма быць гэткім жа дакладным. Я ўзгадваю, калі цётка Штэфі і я былі малымі, дык бабуля нас таксама часам любіла па-рознаму: часам мяне болей, часам Штэфі. Любоў нельга дакладна вымераць, каму і колькі яе трэба даваць. А любіць усіх аднолькава, па справядлівасьці, можа наогул толькі адзін Божачка.

Якаб: Ён можа так усіх любіць?

Мама: Так, Ён можа. Ён любіць кожнага чалавека, усё-роўна, які той: разумны альбо дурны, прыгожы альбо брыдкі, добры альбо агідны.

Якаб: Але кепскіх людзей Ён ня любіць, так?

Мама: Не, Якаб, Ён любіць нават і кепскіх, але яны часам ня хочуць у гэта верыць.

Якаб: А хіба Божачка ня можа зрабіць так, каб усе бацькі любілі сваіх дзяцей аднолькава?

Мама: Не, Ён нікога ня можа прымусіць, таму што любоў аддаецца дабраахвотна. Ты ня можаш указваць кожнаму чалавеку, як моцна ён павінен цябе любіць. Можа хто-небудзь, напрыклад, загадаць Каці, каб яна любіла Рудзі болей за цябе?

Якаб: Не, не, Каці ніколі не пагадзіцца на гэта!

Флёкі: Брэх!

Мама: І табе таксама ніхто ня можа загадаць, каго ты павінен любіць болей за ўсіх. Гэта толькі твая ўласная справа.

Якаб: Я шмат каго люблю. Людзей і зьвяроў (гладзіць Флёкі), і сябе самога я таксама люблю!

Мама: Тады ў цябе ўсё ў парадку, праўда?

Якаб: Так!

Флёкі: Брэх!

Якаб раўнуе

Рэўнасьць – гэта хвароба, нездаровае пачуцьцё. Яна асьляпляе, даводзіць да шаленства, робіць залежным, разьядае чалавека, можа нават забіць. Рэўнасьць можа цалкам зьмяніць чалавека і адолець яго. Карані рэўнасьці трэба шукаць у страху быць абдзеленым: патрэба ***цалкам*** валодаць усёй увагай і немагчымасцю падзяліцца ёй з некім іншым. Таксама і ён, Якаб, як многія дзеці, якія маюць браціка альбо сястрычку, раўнуе. Тата любіць Элізабэт больш за Якаба, і яму горка адчуваць гэта. Мама не адмаўляе гэтага, але і не суцяшае Якаба з дапамогаю агульнапрынятых фармулёвак, такіх як: «У цябе ёсьць я», «Не ўспрымай гэта так трагічна» – яна ня кажа ўсяго гэтага, а патрабуе ад Якаба проста перажыць гэта як факт, які нельга зьмяніць. Яна падбадзёрвае яго, каб ён з дапамогаю гэтай сітуацыі стаў больш сталым.

Яе словы пра Бога не павінны былі замяніць Якабу ўвагу таты, а мелі на мэце пашырыць ягоны кругагляд і веданьне жыцьця ды іншых людзей. Якаб, пачуў пра тое, што Бог сапраўды любіць людзей без аніякіх умоваў і пачынае задаваць свае пытаньні: ці не залежыць любоў Божачкі ад таго, наколькі чалавек варты гэтай любові? Ці ня трэба яе спачатку заслужыць сваімі паводзінамі? «Ён ня любіць злых людзей, так?» Мама тлумачыць Якабу: Бог любіць чалавека не тады, калі той заслужыў гэта сваімі паводзінамі. Ён любіць чалавека ад самага пачатку, без аніякіх умоваў. «Ён любіць таксама і злых, але яны часам ня хочуць у гэта верыць». Любоў Божачкі нельга і ня трэба заслугоўваць, яна ўжо падорана кожнаму.

Якаб зразумеў, што нельга прымусіць іншага чалавека любіць сябе, «таму што любоў – гэта справа дабраахвотная». Цяпер, калі ён канстатуе сваю здольнасьць любіць

іншых і сябе самога, больш не застаецца месца для рэўнасьці: «Я шмат каго люблю. І сябе самога я таксама люблю!» Калі б у Якаба не было пачуцьця ўласнай годнасьці і здольнасьці да самааддачы, тады ён ня здолеў бы пераадолець сваю рэўнасьць. У гэтай сітуацыі мама была яму натхняльным суразмоўцам. І Якаб больш не баіцца стаць абдзеленым.

Бубен для Божачкі

(Дзіцячы пакой. Пасярэдзіне стаіць бубен, зроблены з пакунку ад пральнага парашку. Элізабэт б'е ў яго рукамі. Якаб таньчыць ў такт.)

Якаб: Шкода, што мама пайшла на шпацыр. Заўсёды, калі мы выпрабоўваем наш новы бубен, яна зьбягае. Яна магла б таксама патаньчыць разам.

Элізабэт: Мне здаецца, гэта мой самы лепшы бубен. Самы лепшы з тых сямі, што я ўжо зрабіла раней. Калі мне мама дасьць яшчэ адзін пакунак ад пральнага парашка, дык я зраблю яшчэ адзін бубен.

Якаб: Ты сапраўдная майстрыха па бубнах, Элізабэт.

Элізабэт: Так, у мяне ўжо ёсьць вопыт, праўда?

Якаб: Так. А гэты бубен ты таксама падорыш?

Элізабэт: Магчыма. Мне дастаткова аднаго.

Якаб: Каму ты яго падорыш?

Элізабэт: Яшчэ ня ведаю.

Якаб: Каці?

Элізабэт: Чаму менавіта Каці?

Якаб: У яе яшчэ няма ніводнага бубна. Яна, напэўна, таксама хацела б мець такі.

Элізабэт: Можна падумаць, як раз для Каці.

Якаб: Ці можа падорыш мне?

Элізабэт: Табе? Без аніякай прычыны – ні дзень нараджэньня, ні імяніны – проста так узяць і падарыць?

Якаб: Проста так!

Элізабэт: Ты сабе хоць уяўляеш, колькі трэба папрацаваць, каб зрабіць такі бубен? – Вяроўкі, скура, фарбы – давесьці ўсё да ладу, а потым чакаць, пакуль усё высахне. Апроч таго, гэта сапраўды мой самы прыгожы, самы любімы бубен.

Якаб: Каму б ты хацела яго падарыць?

Элізабэт: Гэта павінен быць вельмі адметны чалавек.

Якаб: Я ведаю, хто гэта. Падары гэты бубен Божачку.

Элізабэт: Божачку? Больш ты нічога ня мог прыдумаць, Якаб?

Якаб: Не, падары яго Божачку, і тады Ён дасьць яго мне.

Элізабэт: Што ты выдумляеш!

Якаб: Нічога, Божачка даў бы яго мне, таму што Ён ведае, як моцна я гэтага хачу. Божачка нікому не зайздросьціць. Ён будзе толькі радавацца, калі Ягоны бубен будзе прыносіць мне задавальненьне.

Элізабэт: Заўсёды ты нешта прыдумляеш.

Якаб: А тады б я перадаў бубен далей, напрыклад, Каці. Чым больш будуць цешыцца з бубна дзеці, тым больш задаволены будзе сам Божачка. Гарантую. (Б'е ў бубен) Гэта сапраўды вельмі добры бубен.

Элізабэт: Але, калі ён табе так падабаецца – бяры яго.

Якаб: Ты мне толькі даеш ім пакарыстацца, Элізабэт.

Элізабэт: Мне ўсё роўна.

Якаб: Ю-ху! (Крычыць з вакна) Каці! Каці! Хадзі сюды! Разам з Флёкі!

(Якаб і Элізабэт б'юць у бубен разам)

Каці: (Уваходзіць) Ого! Весела ў вас!

Флёкі: Брэх, брэх! (Цешыцца)

Каці: Ух ты, які прыгожы ў вас бубен – можна мне паспрабаваць?

Якаб: Калі ласка. Ён належыць Божачку, каб ты ведала. Але Ён дазваляе і мне, і табе ім карыстацца. Можаш узяць яго нават дахаты.

Каці: Заўсёды марыла мець такі бубен.

Якаб: (Да Элізабэт) Што я табе казаў.

(Флёкі брэша, дзеці б'юць і таньчаць)

Бубен для Божачкі

З-за чаго толькі ня сварацца дзеці! Асабліва калі адно з іх мае менавіта тое, што проста необходна атрымаць іншаму. Вельмі часта здараецца так: дзеці гуляюць, усё ціхамірна, пакуль раптам не пачынаецца сварка. Так і ў гэтым выпадку: Элізабэт зрабіла вельмі прыгожы бубен. Гонар за свой уласны твор мацнейшы за жаданьне прынесьці радасьць іншым. Насьпявае канфлікт.

Адныя бацькі сказалі б: «Яна павінна аддаць бубен». Іншыя пярэчылі б: «Калі ня хоча, можа пакінуць бубен сабе, зрэшты яна сама яго зрабіла» Але ніводная з парадаў не прыносіць аптымальнага рашэньня абодвум бакам, таму што перамагчы можа толькі нехта адзін, іншы застаецца ў пройгрышы. Аніводная з прыведзеных вышэй парадаў не ўзбагачае бакі, не дапамагае будаваць далейшыя адносіны, а толькі перашкаджае ім і нават зьяўляецца небясьпечнай. Першая парада недаацэньвае Элізабэт у яе славалюбстве як майстра-творцу (у бубен укладзены кавалачак яе самой), іншая парада пагражае супольнаму жыцьцю, да правілаў якога адносіцца запаведзь дзяліцца з бліжнімі. Ці дапамагло

б, калі б мы нагадалі Элізабэт пра гэтую запаведзь і пра Бога? Не, таму што такая спасылка ідзе звонку і толькі перашкодзіла б у дадзенай сітуацыі. Гаворка пра Бога толькі узмацніла б патрабаваньне аддаць бубен, але ці зьмяніла б Элізабэт свае погляды, калі ёй цяжка разьвітацца з бубнам?

Аднак, у нашай сітуацыі ідзе гаворка пра Бога не як пра таго, хто аддае загады, праводзіць мяжу, вылучае патрабаваньні. Не, Бог – гэта той, хто адкрывае новыя магчымасьці да кампрамісаў і пошуку неабходных рашэньняў. «Падары яго Божачку». Ашаламляльная ідэя, але геніяльная па сваёй сутнасьці. І толькі тады, калі ў дзеяньне ўступае Бог, сітуацыя мяняецца. Не таму, што Ён умешваецца чароўным чынам, а таму што погляд на Яго ўказвае патрэбны шлях: Бог хоча, каб ладзілася сумеснае жыцьцё людзей, Ён клапоціцца, Ён падтрымлівае, Ён дапамагае, таксама і Ягоная заслуга ў тым, што ўзаемаадносіны паміж людзьмі ладзяцца. Пры гэтым любоў да бліжняга – гэта ня Божая «запаведзь». Тады б мы разумелі Бога хутчэй як уладара, які стаіць на варце захаваньня сваіх загадаў і ўказаньняў. «Чым больш будуць цешыцца з яго дзеці, тым большае задавальненьне ён будзе прыносіць Божачку», – кажа Якаб, таму што ён ведае: Божачка дорыць нам гэтую радасьць і моц любіць нашых бліжніх, і радуецца, калі мы дорым радасьць адно другому.

Я умею гэта рабіць
Кампетэнтны вопыт

Радасьць дзіцяці ад здольнасьці рабіць тое, чаму яно толькі што навучылася, можа быць невымерная. Тым самым яно здабывае яшчэ адну частку тых здольнасьцяў, якія неабходныя ў нашым жыцьці. У заваёве сьвету ляжыць мэта

дзіцячых імкненьняў. Гэта патрабуе таго, каб вакол дзіцяці была створана атмасфера абароненасьці і здаровага пачуцця ўласнай годнасьці. Бацькі павінныя верыць у здольнасьці сваіх дзяцей і даручаць ім выкананьне пэўных спраўваў. Дзіця таксама мае патрэбу ў даверы да сябе з боку бацькоў. Прыхаваная няўпэўненасьць можа мець свае негатыўныя наступствы, няўпэўненасьць, якой спрыяе асяроддзе, ніколі не дазволіць зьдзейсьніць мужныя ўчынкі.

Фізічныя здольнасьці дзіцяці вельмі доўга могуць знаходзіцца на першым плане. Яны закранаюць вельмі важны асьпект у развіцьці дзіцяці на шляху яго станаўленьня як чалавека. Іх ня трэба недаацэньваць. Фізічная рухавасьць і набыцьцё адпаведных здольнасьцяў зьяўляюцца падставай і стымулятарам духоўна-псіхічнага развіцьця. Таму, таксама, абумоўлены зьнешнімі жыцьцёвымі абставінамі і папрокамі дарослых: «Сядзі ціха», «Што за дзіця – ані хвіліны спакою», вымушаны недахоп рухаў, зьяўляецца вялікай небясьпекай для фізічна-псіхічнага здароўя дзяцей.

Да вопыту: «Я ўмею гэта рабіць, я станаўлюся абазнаным у тых сферах жыцьця, якія мяне акаляюць», належыць таксама развіцьцё здольнасьці ствараць і фармаваць адносіны з акаляючымі людзьмі. Пры гэтым трэба памятаць, што ў дзяцей дашкольнага ўзросту ёсьць прыродны абгрунтаваны і неабходны эгацэнтрызм – здольнасьць прыймаць усё на свой рахунак, разумець усё ў адносінах да сябе і сваіх патрэбаў.

Таму, было б памылковым імкнуцца «выбіць» з дзіцяці ягоны эгацэнтрызм ці ацэньваць яго сыходзячы з маральных нормаў. Таксама як было б памылковым пазбаўляць дзіця магчымасьці выстаўляць свае абгрунтаваныя патрабаваньні, настойваць на сваім. Толькі тых дзяцей, якія могуць дамагацца свайго, можна падштурхнуць адмовіцца ад уласных патрабаваньняў. Тады гэтая прапанова ня будзе

ўспрымацца як пагроза, небяспека ці нейкае абмежаванне. У адваротным выпадку, застанецца незразумелым, чым была выклікана адмова ад уласных правоў: велікадушнасьцю альбо баязьлівасьцю. На груньце баязьлівасьці немагчыма стварыць раўнапраўныя адносіны. Таму ў рэлігійным выхаваньні нельга канцэнтравацца толькі на выхаваньні «самаахвярнасьці», альбо толькі на «самарэалізацыі» дзяцей.

Задачаю бацькоў зьяўляецца натхненьне сваіх дзяцей да зьбліжэньня з іншымі людзьмі. Там, дзе дзіцяці ўдаецца вырашыць канфлікт, сфармаваць адносіны, яно дазнаецца: жыцьцё разам з іншымі ўзбагачае і нічым не пагражае; яно пазнае сваю дасьведчанасьць у фармаваньні сумеснага жыцьця з іншымі, нават калі пры гэтым сустаракаюцца і расчараваньні. Тактоўная і стымулюючая размова пра Бога ў дадзеным выпадку можа падтрымаць дзіця і дапамагчы яму не губляць мужнасьці нават пры напатканых расчараваньнях і пры сутыкненьні з негатыўнымі ў гэтым плане сітуацыямі. Дзіця, якое стымулююць да пазітыўных адносінаў з іншымі, у сваю чаргу таксама можа паставіць бацькоў перад праблемай, калі іхнія ўласныя паводзіны не адпавядаюць іхнім ўласным патрабаваньням. Калі гэта здараецца, тады, як правіла, адбываецца размова паміж бацькамі і дзецьмі, таму што апошнія ня проста аддадзеныя пад бацькоўскую апеку, бяз права голасу, а таксама маюць права на сваё ўласнае меркаваньне. Шмат што ад дзіцячай упартасьці, задзірыстасьці выклікана перажытым пачуцьцём свайго бяссільля, якое яшчэ больш узмацняецца дарослымі, калі яны пачынаюць змагацца з негатыўнымі рэакцыямі сваіх дзяцей, а па-сутнасьці – з самімі дзецьмі.

Таму кожны перажыты дзецьмі вопыт дасьведчанасьці і кампетэнтнасьці ў адносінах да іншых расплюшчвае ім вочы на іх саміх і прадухіляе зьяўленьне такіх сітуацый, у

якіх дзеці адчувалі б сябе бясьсільнымі што-небудзь зрабіць і паўплываць на агульны вынік справы.

Элізабэт адважваецца

(Каля дому. Тата з скрынкай з інструментамі. Ён у роспачы шукае нешта і потым злуецца.)

Тата: Нічога ня знойдзеш! Нічога ня знойдзеш! Усё раскідана! Зноў нехта пакорпаўся! Зразумела, нават мяне не спытаўшы! – (Ідзе да вакна) Якаб! Якаб!

Якаб: (Выглядае з вакна) Так!

Тата: (Рэзкавата) Я шукаю гаечны ключ і пласкагубцы!

Якаб: Можа яны ў тваёй скрынцы з інструментам?

Тата: Не! Я толькі што глядзеў!

Якаб: Можа ты пакінуў іх у склепе?

Тата: Калі гэта спыніцца! **Я** іх пакінуў? Хто заўсёды бярэ мой інструмент, раскідае абы дзе і пакідае паўсюль, дзе толькі можна?

Якаб: Я заўсёды кладу ўсё назад!

Тата: Тады б я напэўна знайшоў! Але пласкагубцы зьнікліе бяз сьледу! Гаечны ключ таксама! Таму што бесперапынна нешта павінна будавацца: сабачыя будыі, чаўны і да таго падобнае глупства! Калі ж трэба працаваць – няма інструменту!

Якаб: Але сабачая буда – гэта ня глупства!

Тата: Я забараняю табе раз і назаўсёды корпацца ў маёй скрынцы з інструментам, зразумела?!

Якаб: Але тата...

Тата: Нічога больш не жадаю слухаць! І неадкладна знайдзі мае пласкагубцы! Пашукай у сваім хлудзе!

Якаб: (Зьнікае з вакна)

Тата: (Вяртаецца да скрынкі з інструментам) Неахай-

насьць без канца і краю – трэба адвучыць Якаба ад гэтай неахайнасьці.

Элізабэт: (Выходзіць з дому і ідзе да таты) Тата...

Тата: Што, знайшліся пласкагубцы?

Элізабэт: Ты зараз вельмі пакрыўдзіў Якаба, тата!

Тата: Ці знайшліся нарэшце гаечны ключ і пласкагубцы?!

Элізабэт: Не. Паслухай, Якаб...

Тата: Ён цяпер мяне не цікавіць.

Элізабэт: Але ён не вінаваты ў тым, што няма пласкагубцаў. Ты сам аддаў пласкагубцы і гаечны ключ пану Хуберу. Хіба ты ня памятаеш?

Тата: Пану Хуберу?!

Элізабэт: На мінулым тыдні ты пасылаў мяне з пласкагубцамі і гаечным ключом да пана Хубера. Я гэта добра памятаю.

Тата: Слушна! Добра, што ты згадала! Зразумела, у пана Хубера! Зьбегай да яго і спытайся – але ветліва, глядзі – ці яны яму яшчэ патрэбны!

Элізабэт: Добра. А ты ідзі тым часам да Якаба і папрасі прабачэньня...

Тата: Што-што ты сказала?

Элізабэт: Ты накрычаў на яго, а ён быў не вінаваты. Цяпер ён сядзіць там і крыўдуе, што ты яму ня верыш.

Тата: Хай гэтым не пераймаецца.

Элізабэт: Але калі мы з Якабам пасварымся, вы заўсёды хочаце, каб мы памірыліся.

Тата: Цяпер і яна пачынае нахабнічаць і будзе мне ўказваць, што мне трэба рабіць.

Элізабэт: Але я не нахабнічаю. Я толькі табе нагадала, каб ты папрасіў у Якаба прабачэньня.

Тата: Ну вось, калі-некалі ты сапраўды як неадвязная блыха. (Ідзе ў дом)

У пакоі. (Якаб сумны сядзіць з сваімі цацкамі. Уваходзіць тата)

Тата: Інструмент пазычыў пан Хубер. Элізабэт мне пра гэта нагадала.

Якаб: Вось!

Тата: Якаб, зразумела, ты можаш карыстацца маім інструментам, калі табе будзе патрэбна. Ведаеш, я сказаў тое, калі быў не ў настроі. Вельмі шкадую.

Якаб: Я б вельмі хацеў змайстраваць сабе ветраны млын.

Тата: Ветраны млын – гм – трэба паглядзець, ці ёсць такі ў кнізе па канструяваньню.

Якаб: Ці мы самі накрэсьлім.

Тата: Таксама добра.

Элізабэт адважваецца

Вельмі часта здараецца так, што бацькі, нават бяз кепскіх намераў, абыходзяцца са сваімі дзецьмі несправядліва. Ёсць таксама і тыя, хто робіць гэта нормай штодзённага жыцьця і лічыць, што дзяцей трэба вельмі рана прывучыць перажываць несправядлівае абыходжаньне, таму што ў дарослым жыцьці ім гэтага ўсё роўна не пазьбегнуць. «Здаровая загартоўка неабходная для будучай барацьбы за існаваньне». Магчыма, такія людзі дзейнічаюць так, таму што самі ў дзяцінстве перанесьлі шмат несправядлівасьцяў, ці, верагодна, тут адыгрывае сваю ролю няўпэўненасьць бацькоў і іх страх згубіць сваё аблічча перад дзецьмі, калі яны прызнаюць сваю памылку. Але ў кожным з гэтых двух выпадкаў ёсць свае наступствы. Яны пазбаўляюць дзяцей упэўненасьці ў сабе. Яны ставяць пад сумненьне веру дзяцей у надзейнасьць бацькоў. Апроч таго, такія адносіны, якія патрабуюць ад дзіцяці моўчкі выносіць нічым не аб-

грунтаваную несправядлівасьць, прыводзяць да адпаведных чаканьняў ад Бога, які, па іх меркаваньню, зьяўляецца несправядлівым, непрадказальным і бессардэчным.

Як цяжка бывае дарослым папрасіць у сваіх дзяцей прабачэньня, выразна паказвае нашая гісторыя. Нешматлікія, але шчырыя словы бацькі дапамаглі аднавіць адносіны і зрабіць іх больш надзейнымі, вера дзяцей у сваіх бацькоў узмацнілася. Пры гэтым дзеці самі маглі павучыцца таму, як трэба прызнаваць свае памылкі і рабіць першы крок насустрач таму, што традыцыйна называецца «пакаяньне і навяртаньне». Яны могуць таксама павучыцца словам і рухам прымірэньня. Вельмі часта той, хто становіцца сьведкаю несправядлівага абыходжаньня з іншымі, сам атрымлівае штуршок да дзеяньняў. У нашай гісторыі прыклад Элізабэт можа натхніць дзяцей заступацца за іншых. Гэта ня так лёгка, таму што трэба быць мужным, упартым, каб дамагацца свайго, ніколі нельга адступаць.

Нашая гісторыя сьведчыць пра тое, што дзеці не павінныя ва ўсім прыстасоўвацца да дарослых і бацькоў, але таксама павінныя ўносіць ва ўзаемаадносіны ўласнае разуменьне каштоўнасьцяў жыцьця.

Якаб-міратворца

(Дзіцячы пакой. Элізабэт з лялечным вазком, Каці і Якаб каля паліцы, на якой стаіць эскіз ветранога млына, накрэсьленага Якабам. Флёкі ўважліва слухае.)

Якаб: Гэты красьлюнак я сам зрабіў. Перад тым як што-небудзь зрабіць, заўсёды трэба спачатку накрэсьліць красьлюнак.

Каці: Па гэтых кручках ты зьбіраешся што-небудзь зрабіць?

Якаб: Гэта не кручкі, а мой вятрак!

Каці: Так-так!

Якаб: Хіба не падобны?

Каці: Толькі тады, калі ты сам сказаў, што гэта вятрак.

Якаб: Нават Флёкі і той бачыць, што гэта вятрак. Праўда, Флёкі?

Флёкі: Брэх!

Якаб: Вось бачыш!

Каці: А гэта што за лыжка?

Якаб: Гэта ня лыжка, гэта мах ад млына!

Каці: А гэтыя рысачкі?

Якаб: Гэта каб я ведаў, колькі будзе частак і колькі дрэва патрэбна.

Элізабэт: Увогуле гэта толькі накід будучай працы – красьлюнак будзе зроблены пазьней.

Каці: Твае сапраўдныя красьлюнкі падабаюцца мне больш, чым гэтыя накіды і кручкі.

Якаб: (Міралюбна) Ты мала што разумееш у гэтым – але нічога.

Каці: Што? Я нічога не разумею? Ты такі часам брыдкі, Якаб. Ты не павінен мяне крыўдзіць, толькі таму, што мне не падабаюцца твае красьлюнкі. І ня вельмі ганарыся... Не такія яны прыгожыя, як табе падаецца...

Якаб: Гатовы млын будзе нашмат прыгажэйшым. Але калі табе не падабаюцца красьлюнкі, дык і ня трэба.

Каці: Калі табе ўсё роўна, што я пра гэта думаю... дык табе і так ня ўдасца мяне пакрыўдзіць. Флёкі, хадзем! (адыходзяць).

Флёкі: (некалькі разоў азіраецца, але Каці цягне яго сілком).

Элізабэт: Каці проста згубіла раўнавагу.

Якаб: Так.

Элізабэт: Ты так цярпліва зносіў усе папрокі.

Якаб: Так.

Элізабэт: Калі б гэта была мая сяброўка, дык я адчувала б сябе вельмі пакрыўджанай.

Якаб: Гм!

Элізабэт: Я б не хацела з ёй больш гуляць.

Якаб: Яна, напэўна, хутка вернецца і скажа, што не хацела са мною сварыцца.

Элізабэт: Ты сапраўды так мяркуеш?

Якаб: Гарантую.

Элізабэт: Добра, пабачым.

(Прыкрая паўза, Элізабэт гуляе далей, Якаб ходзіць па пакоі і пасьвіствае.)

Элізабэт: Калі б яна надумала прыйсьці, дык ужо прыйшла б.

Якаб: Яна яшчэ прыйдзе.

Элізабэт: Ты будзеш вельмі расчараваны, калі яна ня прыйдзе.

(Невялікая пауза, потым Якаб хутка выходзіць і з ганку сочыць за Каці.)

Якаб: Ага, вось яна там стаіць. Каля плоту. Напэўна, не хапае духу падыйсьці. (Ідзе да арэляў) Прывітаньне, Флёкі!

Флёкі: Брэх!

Якаб: (Гушкаецца) Каці, мне так прыкра ад таго, што ты сказала, што ў мяне не атрымаецца цябе пакрыўдзіць. Мне так не хацелася б гэтага.

Каці: (Робіць выгляд, што ня чуе)

Якаб: Табе ня хочацца спытацца ў мяне, ці я злуюся ці не?

Каці: (Павольна падыходзіць бліжэй)

Флёкі: (Падбадзёрліва падштурхоўвае яе) Брэх, брэх!

Каці: Якаб, мне вельмі шкада, што я цябе пакрыўдзіла.

Я не хачу, каб ты смуткаваў. Як ты лічыш, гэтая гушкалка вытрымае нас абодвух?

Якаб: Вядома!

(Яны гушкаюцца разам, Флёкі задаволена брэша)

Якаб-міратворца

Пачатковая сітуацыя ў нашай гісторыі ўзятая, так бы мовіць, са штодзённага жыцьця. Адно з дзяцей распрацоўвае якую-небудзь ідэю і, каб выказаць свае думкі на паперы, робіць красьлюнак. Але для іншых дзяцей, узрост якіх яшчэ не дазваляе разабрацца ў такіх рэчах, гэта застаецца незразумелым і вельмі часта становіцца падставаю для крытычных меркаваньняў. Сам генератар ідэі, які адчувае момант, выкарыстоўвае сітуацыю, каб падкрэсьліць сваю перавагу. У выніку, спрэчка адбываецца па самых лепшых узорах. Агрэсар са зьняважаным выглядам пакрыўджана адыходзіць, трэці бок (Элізабэт) яшчэ больш падлівае алею ў агонь і абвастрае сітуацыю. Якабу спатрэбілася шмат цяплівасьці і адчуваньня ўласнай годнасьці, каб не згубіць у такой сітуацыі вытрымкі. Якаб не жадае Каці нічога дрэннага і ня верыць, што яна можа жадаць яму нечага кепскага. «Яна хутка вернецца і скажа, што не хацела са мною сварыцца».

Напэўна, шмат хто з дарослых у такім выпадку спытае: «А хто пачаў сварку?», нібыта дасьледваньне: «Хто вінаваты?» дапаможа аднавіць парушаныя адносіны. Напэўна, у кожнага з бакоў знайшліся б словы апраўданьня. Але ці ўбачыць кожны з іх сваю віну ў тым, што адбылося?

Якаб пачынае новыя адносіны з Каці. Ён ні ў чым не вінаваціць яе, і, як бы цяжка не было, абыходзіць тое, што здарылася. Ён кажа: «Мне вельмі прыкра». Ён не выстаўляе

ніякіх патрабаваньняў, не дамагаецца сваёй перамогі: «Табе ня хочацца спытацца ў мяне, ці я злуюся ці не?» Ён запрашае Каці пачаць усё наноў. Яна можа нарэшце сказаць: «Мне вельмі шкада». Прапанова Якаба аб прымірэньні дапамагае ёй пераадолець пачуцьцё віны, уздыхнуць і супакоіцца. Адчуваньне віны – гэта ня вынік чужога выроку: «Яна вінаватая», гэта вынік уласных унутраных перажываньняў. «Я не хацеў гэтага» «Мне вельмі шкада» «Мне ня трэба было гэтага рабіць».

Усе спробы знайсьці патрэбныя адгаворкі, ў выніку, могуць перашкодзіць кожнаму з бакоў адчуць сваю віну і прывесьці толькі да азлабленьня. Прапанова аб прымірэньні без аніякіх умоваў і выключэньняў дапаможа кожнаму годна захаваць сваё аблічча. Ня трэба імкнуцца неяк прыхаваць пачуцьці віны і шкадаваньня за тое, што адбылося: іх трэба толькі перажыць, каб зноў ісьці далей.

У такіх сітуацыях вельмі патрэбны канкрэтныя прапановы, каб даць новы накірунак сапсаваным адносінам. Ды і самі бацькі ў адносінах са сваімі дзецьмі павінныя на прыкладзе вырашаных канфліктаў даць зразумець дзецям, што галоўнае ў такіх сітуацыях – не шукаць злачынцу і ахвяру, а імкнуцца знайсьці шляхі і захады па ўсталяваньню новых адносінаў. І толькі тады дзеці змогуць зразумець словы Божачкі аб прабачэньні і прымірэньні, якое не патрабуе ніякіх умоваў.

Якаб можа далёка пайсьці

(Каля дому. Якаб у роздуме сядзіць на лаве. Раптам ён ускоквае, узьбіраецца на лаву і заглядае ў пакой)

Якаб: Тата!
(Голас таты) Так?

Якаб: Я хачу табе нешта сказаць!

Тата: (Зьяўляецца ў вакне) Гэта так тэрмінова?

Якаб: Так! Адгадай, кім я буду, калі вырасту!

Тата: (Ледзь стрымваецца) Якаб, мне здаецца, усяму свой час! Таму, калі ласка, не перашкаджай. Я сьпецыяльна прынёс паперы з працы дамоў, каб папрацаваць. І таму прашу мне не перашкаджаць.

Якаб: І цябе не цікавіць, кім я буду?

Тата: Мы пагаворым пра гэта трохі пазьней – калі скончу працаваць (зьнікае).

Якаб: Пазьней, пазьней...

(Голас Флёкі) Брэх, брэх!

Якаб: Каці і Флёкі! Як раз, што мне і трэба! (Радасна ідзе ім насустрач) Як добра, што вы прыйшлі.

Флёкі: (Шпацыруе да сваёй візітнай буды)

Каці: Я так хачу пагушкацца!

Якаб: Калі ласка! (Штурхае гушкалку) Слухай, Каці (яна гушкаецца трохі павольней), адгадай, кім я стану! Я маю на ўвазе, калі вырасту.

Каці: Можа гоншчыкам Формулы-1?

Якаб: (адмоўна) Не.

Каці: Сабакаводам? Я дам табе свайго Флёкі.

Якаб: Не, можа толькі ў вольны час. Але ў асноўны...

Каці: Можа факірам, які глытае шаблі?

Якаб: М-м. Мне здаецца, я буду цесьляром. Каб так гладзенька абцёсваць краі сталоў, каб ніхто не параніўся.

Каці: Таксама можна.

Якаб: Ці кандуктарам у трамваі, які ведае, калі і дзе трэба выходзіць.

Каці: Таксама някепска.

Якаб: Ці можа блазнам у цырку, ці на тэлевізіі. Уяўляеш мяне ў такіх вялікіх калёшах, як я буду сьмяшыць людзей. (Ён паказвае)

Каці: З цябе атрымаўся б першакласны блазен, Якаб!

Якаб: Так, я шмат кім мог бы стаць.

Каці: Ведаеш, я ўпэўненая толькі ў адным – ты будзеш вельмі адметным чалавекам.

Якаб: Цікава, якім гэта?

Каці: Сказаць табе на вуха?

Якаб: (Набліжаецца бліжэй да яе. Яна ледзь прыкметна гушкаецца) Так?

Каці: (Флёкі брэша, каб яе падтрымаць) Ты шмат кім мог бы стаць, Якаб. Па-першае, тым, хто можа выслухаць і паспачуваць. Хто не сьмяецца, калі я плачу. Хто не раскрые іншым мае таямніцы. Хто дапаможа, калі мне патрэбна тэрміновая дапамога. Калі ты будзеш проста «любым Якабам», дык мне ўсё роўна, хто з цябе атрымаецца яшчэ.

Якаб: Гм! Ты думаеш, у мяне атрымаецца?

Каці: Пэўна што так!

Якаб: Хіба можа тады, калі ты мяне будзеш падтрымліваць.

Каці: Добра, я заўсёды буду думаць пра гэта. Я буду падбадзёрваць цябе – гэта звычайна дапамагае.

Якаб: (У роздуме) Гм! (Ідзе да вакна) Тата, тата! Гэта сапраўды тэрмінова, можна цябе на хвілінку?

Тата: (Уздыхаючы, зьяўляецца ў вакне) Так, што гэтым разам?

Якаб: Я хачу сказаць табе нешта. Калі мы ўсе будзем цябе падбадзёрваць і падтрымліваць, дык ты можаш шмат кім стаць.

Тата: Што-што?!

Якаб: Напрыклад, ты мог бы стаць апавядальнікам казак, кухарам альбо футбалістам, ва ўсялякім выпадку тым, хто мае час пазабаўляцца і павесяліцца. (Ідзе да Каці)

Тата: Так, сапраўды. (Чухае патыліцу)

Якаб можа далёка пайсьці

Выбар прафесіі, безумоўна, зьяўляецца самым цяжкім і адказным выпрабаваньнем для моладзі і іх бацькоў. Трохі лягчэй, калі прафесія не выбіраецца раз і на ўсё жыцьцё – тады застаецца шанц некалі выправіць становішча. Але калі такі выбар ужо зроблены раз і назаўсёды і пры гэтым ня лепшым чынам, дык гэта вядзе проста да жыцьцёвага тупіка, пра што сьведчыць вялікая колькасьць маладых беспрацоўных людзей.

Некаторыя лічаць, што пры выбары прафесіі галоўную ролю адыгрывае добрая адукацыя, а потым ужо ўсё астатняе. І таму нават выходныя дні прысьвечаныя ўрокам і падручнікам. Наданьне завышанага значэньня школе і адукацыі ідзе толькі ад імкненьня абавязкова некім стаць, каб потым ня быць выкінутым за борт жыцьцёвага карабля, ня быць абыйдзеным на жыцьцёвай дыстанцыі, і, як вынік, выхаваньня **чалавека** не адбываецца. Шмат для каго слушны выбар прафесіі замяняе іх станаўленьне ў чыста чалавечым плане. «Я буду банкаўскім служачым» – І больш нічога. Гэтай адзінай, як здаецца, сапраўднай і важнай мэце падпарадкоўваецца ўсё жыцьцё.

Таленты і здольнасьці, якія аказваюцца непатрэбнымі для абранага накірунку жыцьця, так і застаюцца неадкрытымі. Яны проста не заўважаюцца і не разьвіваюцца. Канцэнтраваньне ўвагі на адной адзінай будучай прафесіі, канкрэтнай сферы, як правіла, прыводзіць да звужэньня жыцьцёвых даляглядаў.

Сацыяльны партрэт сапраўднага мужчыны, які склаўся ў нашым грамадстве, пры ўсіх ягоных пазітыўных якасьцях (сіла, мужнасьць, сьмеласьць і г.д.) вызначаецца беднасьцю агульначалавечых якасьцяў. Для яго адначасова характэрны

дэфіцыт пачуццяў, беднасьць адносінаў, якія абмяжоўваюцца прафесійнай сьферай, страх, што заўтра знойдзецца нехта іншы – мацнейшы, разумнейшы, спрытнейшы, ды зноў і зноў прыдзецца даказваць сваю кампетэнтнасьць. «Калі мы будзем цябе падбадзёрваць і падтрымліваць, тады ты можаш шмат кім стаць». Якаб інтуітыўна закрануў балючую рану таты, прафесійныя абавязкі якога абмяжоўваюць ягонае раскрыццё як чалавека.

Адкрыццё, што станаўленьне асобы як чалавека мае першаснасьць ва ўсім працэсе выхаваньня, робіць Каці: «Калі ты станеш проста любым Якабам, тады мне ўсё роўна, кім ты станеш». Інакш усё ў жыцьці будзе марным і без патрэбы. Працэс станаўленьня ксжнага дзіцяці як чалавека, як асобы – гэта працэс цяжкай, напружанай працы бацькоў і выхавальнікаў. Але калі самі дзеці будуць аддаваць перавагу чалавечым, а не прафесійным якасьцям, тады можна будзе спадзявацца, што і сваё будучае жыцьцё яны будуць ствараць сыходзячы з агульначалавечых каштоўнасьцяў, таму што, як казаў Божачка, які, дарэчы, стаў чалавекам, не цесьляром, «...шукайце найперш валадарства Божае, а ўсё астатняе вам прыкладзецца».

Каці не паддаецца дрэсіроўцы

(Каля дому. Пад лаўкаю ляжаць мячык і інструменты Якаба. Трохі далей, у садзе – пачаты човен, які будуецца з рэшткаў дошак. Каці сядзіць на лаўцы, боўтае нагамі і глядзіць, як Якаб гуляе з Флёкі.)

Якаб: (Гладзіць Флёкі) Добры, добры Флёкі. У цябе такі добры сабака, Каці.

Каці: Так. І ён такі разумны, мой Флёкі. (Флёкі згодна брэша)

Якаб: Ён усё разумее, пра што мы гаворым. Давай, я буду яго дрэсіраваць. Флёкі, сядзь! Флёкі, да нагі. Ты толькі паглядзі, як ён усё добра робіць.

Каці: Скажы яму, каб ён прынёс мяч. (Падкідае мячык убок)

Якаб: Флёкі, мячык! (Флёкі бяжыць і прыносіць мячык у зубах) Малайчына, Флёкі! Разумны Флёкі! З табою можна было б нават выступаць у цырку. Слухай, Каці, гэта вельмі добрая ідэя. Выступленьне разам з Флёкі!

Каці: Як гэта?

Якаб: (Ставіць некалькі скрынак) Флёкі, гоп! Гоп! Цяпер яшчэ раз, гоп! (Флёкі скача праз скрынкі)

Каці: (Пляскае ў ладкі) Брава, брава!

Якаб: Я буду дрэсіроўшчыкам у цырку – буду дрэсіраваць тыграў і львоў! Трэба пачынаць вучыцца ўжо цяпер (прыносіць абруч і ставіць яго перад Флёкі) Флёкі, гоп! Скачы, Флёкі, гоп! Скачы праз абруч! (Флёкі ня хоча) Флёкі ня хоча скакаць – ён стаміўся. Каці, хадзі сюды, скокні праз абруч.

Каці: Што? Я? Мне скакаць праз абруч?

Якаб: Так, мне патрэбны леў, каб дрэсіраваць. Хадзі сюды, будзеш маім ільвом. Каці, гоп!

Каці: Я не хачу, каб мяне дрэсіравалі.

Якаб: Але гоп!

Каці: Не, не хачу!

Якаб: Ня ўпарцься, гоп!

Каці: Не! Я ня Флёкі! Я твая сяброўка! Я не хачу, каб мяне дрэсіравалі. (Устае з лавы і сядае на прыступкі каля дому.)

Якаб: Што за глупства! (Сядае на край лавы)

Каці: (Зьвяртаецца да Флёкі, які лашчыцца да яе) І выдумае сабе гэты Якаб, праўда, Флёкі? Ён хоча мяне

дрэсіраваць. Ён не разумее, што я Каці, а ня Флёкі... (Флёкі віляе хвастом і бяжыць да Якаба)

Якаб: Ну і цаца, гэтая твая Каці, Флёкі, скажы ёй пра гэта (Флёкі бяжыць назад да Каці)

Каці: Якаб вельмі добры, калі яму не прыходзяць у галаву розныя глупыя ідэі, скажы яму, Флёкі (Флёкі вяртаецца да Якаба)

Якаб: (Устае, ідзе да свайго чоўна і ўважліва разглядае яго) Скажы, Флёкі, праўда, човен, што я раблю, прыгожы?

Каці: (З цікавасьцю паварочваецца ў той бок)

Якаб: Каці, хочаш паглядзець на мой карабель?

Каці: (Ня ўпарціцца, адразу падыходзіць да Якаба) Так, хачу.

Якаб: Бачыш, я раблю яго з адных рэшткаў.

Каці: Ён выглядае як сапраўдны карабель. Куды ты на ім паплывеш?

Якаб: Знойдзем якую-небудзь лужыну.

Каці: **Мы** знойдзем?

Якаб: Так, ты, Флёкі і я. Ці ты думаеш, што я раблю яго толькі сабе аднаму? (Залазіць у човен і пачынае майстраваць)

Каці: Калі мы ня знойдзем аніякай лужыны, тады проста пагуляем у мора...

Якаб: Патрэбна яшчэ адна дошка.

Каці: Я зараз прынясу.

Якаб: Там, каля плоту, ляжыць ворах дошак. (Каці бяжыць і прыносіць дошку) А дзе мой малаток? Каці, прынясі, ён там, каля лавы.

Каці: Ужо нясу.

Якаб: Патрымай, калі ласка, гэтую дошку, вось тут, так...

Каці: Якаб, ты такі добры майстра!

Якаб: А ты памочнік!

Каці: Так, я люблю табе дапамагаць!
(Флёкі згодна брэша)

Каці ня хоча, каб яе дрэсіравалі

«Калі мне ўсе навокал здрадзяць, тады толькі мой сабака застанецца мне адданым». Такое выказваньне любові да жывёлаў, якія ўспрымаюцца больш надзейнымі за людзей і за стасункі з імі, сьведчыць толькі пра мізэрнасьць і ўбогасьць чалавечага існаваньня. За гэтымі словамі хаваецца няздольнасьць да ўстанаўленьня стасункаў з іншымі людзьмі, няздольнасьць прыймаць на сябе рызыку гэтых стасункаў, якую надае ім жыцьцё, і таксама багаты вопыт расчараваньняў, несьці які, часам, не пад сілу асобным людзям. Для іх такая эгацэнтрычная любоў да жывёлаў павінна замяшчаць недахоп любові з боку блізкіх людзей.

Прыстасаваньне навакольнага свету да задавальненьня сваіх патрэбаў, імкненьне ўзяць ад сабачкі альбо птушачкі тое, што яны ня могуць атрымаць ад акаляючых – такія мэты ляжаць у аснове дзеяньняў маленькіх дзяцей, якія ня могуць звыкнуцца з тым, што ім аддаецца меньш увагі, чым за першыя гады іх жыцьця. Гэта адбываецца, калі іх дзіцячыя патрэбы ва ўвазе, добрых адносінах да сябе і прызнаньні, доўгі час не задавальняюцца, альбо калі празьмернасьць атрыманай увагі і расьпешчанасьць перашкаджаюць асэнсаваньню і перажываньню жыцьцёвых расчараваньняў.

«Я б вельмі хацела завесьці маленькага коціка альбо сабачку, каб каля мяне заўсёды была жывая душа». Ад гэтага шчырага прызнаньня вее поўнай няздольнасьцю ўсталяваньня адносінаў і сумеснага жыцьця з іншымі людзьмі. Але гаворка ідзе не пра тое, што жывёлы разглядаюцца ў цалкам падпарадкаваным чалавеку стане – у гэтым плане еўрапейцы вызначаюцца панскімі, уладарніцкімі звычкамі

ў адносінах да жывёлаў, ім трэба павучыцца адносінам і абыходжаньню з жывёламі ў жыхароў Індыі альбо Азіі. Не, гаворка ідзе пра тое, што чалавек па сваёй прыродзе схільны да адносінаў менавіта з людзьмі, і гэтыя адносіны вельмі адрозніваюцца ад адносінаў з жывёламі. І таму нельга разглядаць іншых людзей толькі як сродак да выкананьня ўласных мэтаў і абыходзіцца з імі ў адпаведнасьці з уласнымі меркаваньнямі. Чалавечыя стасункі могуць разьвівацца толькі пры ўмове ўзаемнай павагі і свабоды. Талеранцыя выхавальніка ў адносінах да дзяцей мае свае межы і павінна заканчвацца там, дзе пад пагрозу ставяцца годнасьць і свабода іншых дзяцей.

Усё гэта можна прадэманстраваць на прыкладзе нашай гісторыі, у якой Якаб, у захапленьні ад здольнасьцяў Флёкі, перастае бачыць «чалавечнасьць» сваёй сяброўкі Каці: «Так, мне патрэбен леў, каб яго дрэсіраваць». Каці паказвае яму розьніцу паміж сабою і Якабам: «Я ня Флёкі. Я твая сяброўка Каці!» Усё мае свае межы.

Далей, калі дзеці сумесна пачынаюць будаваць карабель, мы бачым, што адносіны – гэта той самы выпадак, калі адзін з бакоў (у нашым выпадку майстар Якаб) можа прыймаць на сябе кіруючую ролю, а іншы бок (Каці) без аніякай пагрозы для ўласнай годнасьці можа сказаць: «Мне падабаецца табе дапамагаць.»

Якаб набіраецца сьмеласьці

(Дзіцячы пакой. Элізабэт з лялькамі зьбіраецца на шпацыр. Якаб утыркнуў дзьве пярыны ў валасы і гуляе ў індэйцаў.)

Якаб: (Крадзецца паўзком праз пакой) Арлінае Вока знайшоў сьлед (аглядаецца наўкол, прыстаўляе далонь да вачэй) – Вось ён -уууу – такі вялікі!

(Раптам мяняе голас) Элізабэт, ты нават ня можаш сабе ўявіць, які я цяпер сьмелы!

Элізабэт: Так? І які?

Якаб: Я мужны, як тры індэйцы. Бачыш вось там таго вялікага рудога мядзьведзя?

Элізабэт: Дзе?!

Якаб: Там, у куце. Ты павінна сабе ўявіць гэта...

Элізабэт: Зразумела.

Якаб: Бачыш нарэшце? Добра, зараз я праганю яго – каб ён табе не зрабіў нічога благога. Вось які я сьмелы (Да ўяўнага мядзьведзя) – Пайшоў прэч, не палохай маю сястру! Ідзі ў сваю бярлогу! Што, ня хочаш? Ну, пачакай! Хрась, хрась... Досыць, ён ужо зьбег. Праўда, я добры паляўнічы? Бачыш, нават бяз стрэльбы, адагнаў яго голымі рукамі. Вось які я сьмелы.

Элізабэт: Я таксама сьмелая змагацца з выдуманым мядзьведзем. Тут багата розуму ня трэба. Трэба быць сьмелым па-сапраўднаму!

Якаб: Гм... па-сапраўднаму... Па-сапраўднаму я таксама сьмелы. Я ніколі не баюся. Нават у цемры.

Элізабэт: Так-так...

Якаб: Ты ня верыш? Даказаць, які я сьмелы? Чакай... Я прынясу што-небудзь з каморы – ня буду нават запальваць сьвятло, хочаш? (Зьнікае)

Элізабэт: Паглядзім!

(Расчыняюцца дзьверы, з цёмнай каморы чуваць голас Якаба.)

Якаб: Слова гонару, сьвятло я не запальваў.

Элізабэт: Я табе веру, Якаб...

Якаб: (Вяртаецца з вазай цёткі Штэфі ў руках) Цікава, на што гэта я натрапіў у цемры?

Элізабэт: Гэта ваза, якую цётка Штэфі падарыла маме на дзень нараджэньня.

Якаб: (Ставіць вазу на стол) Бачыш цяпер, які я сьмелы? Усё было ў суцэльнай цемры, толькі вузенькая шчылінка ў дзьвярах. Цемра – проста жах! Але я быў сьмелы. (разглядае вазу) Элізабэт, табе падабаецца гэтая ваза?

Элізабэт: Шчыра кажучы, ня вельмі. Маме, напэўна, яна таксама не падабаецца. Яна ставіць гэтую вазу, толькі калі прыходзіць цётка Штэфі.

Якаб: (Абыходзіць вазу наўкол) Напэўна, калі б гэта была ня ваза, а штосьці іншае... напрыклад, акварыум... было б шмат лепш. Так, для акварыума яна як раз бы прыдалася.

Элізабэт: (Зьбіраецца адыходзіць са сваімі ляльками) Акварыум бяз рыбаў?

Якаб: Я ўкіну сюды сваіх пласмасавых рыбак. (Кідае іх у ваду) Трэба яшчэ даліць вады.

Элізабэт: Па-сапраўднаму?

Якаб: Ты дзе-небудзь бачыла акварыум без вады? (Ідзе па ваду)

Элізабэт: Калі ты толькі хочаш паплёскацца ў вадзе – тады я лепей пайду ў сад...

Якаб: (Вяртаецца з палівачкаю) Я прыйду, калі злаўлю самую вялікую акулу. Цяпер я буду лавіць рыбу! (Бярэ вуду) Я самы сьмелы рыбак з усіх, што ёсьць. Ух ты, якая вялікая рыба, трэба паспрабаваць яе выцягнуць (Вуда ўзьлятае ўгору, ваза падае на падлогу, аскабалкі ляцяць ва ўсе бакі)

(Каля дому. Элізабэт з вазком каля лавы)

Якаб: (Асьцярожна выглядае з дому) Элізабэт...

Элізабэт: (Глядзіць на яго) Што, што-небудзь здарылася?

Якаб: Са мною нічога, але з вазаю цёткі Штэфі... Там усё ў вадзе і аскабалках...

Элізабэт: А-ёй, калі мама ўбачыць...

Якаб: Што мы скажам маме, калі яна вернецца! Дапамажы мне, Элізабэт! Давай што-небудзь прыдумаем... Я ёй скажу... што прыходзіла Каці... (ажыўляецца) Так... разам з Флёкі, і Флёкі як скокне – як заўсёды, гэты брыдкі Флёкі – і ваза...

Элізабэт: І Флёкі прынёс з каморы вазу і наліў у яе вады?

Якаб: Гм...

Элізабэт: Сорам, Якаб, ты заўсёды хочаш быць сьмелым, а тут пачынаеш штосьці прыдумляць...

Якаб: Так, а што яшчэ можна сказаць маме?

Элізабэт: Проста раскажы, як усё здарылася.

Якаб: Тады мне трэба быць сьмелым як дзесяць індэйцаў.

Элізабэт: Я буду трымаць за цябе кулакі. Калі ты зрабіў шкоду, дык трэба набрацца сьмеласьці і прызнацца. Чакай, там, здаецца, прыйшла мама.

Якаб: А-ёй, што цяпер будзе!

Мама: (Уваходзіць з поўным кошыкам пакупак) Вось і я! Добра пагулялі без мяне?

Якаб: Мама, мне трэба нешта ў цябе спытаць...

Мама: І што?

Якаб: Калі б ваза цёткі Штэфі разьбілася, ты б вельмі засмуцілася?

Мама: Ваза цёткі Штэфі... (Раптам падазрона глядзіць на Якаба) А чаму ты пытаеш?

Якаб: Я табе ўсё раскажу – хадзем сюды – мне так шкада – я табе абавязкова дапамагу ўсё прыбраць... (ідзе з мамаю ў дом)

Элізабэт: (Уздыхае з палёгкаю) Усё ж такі ён сьмелы, наш Якаб.

Якаб набіраецца сьмеласьці

Дэманстрацыя ўласнай сьмеласьці ў сітуацыях, часам небясьпечных для жыцьця, зьяўляецца важнай і папулярнай часткай дзіцячых гульняў, якія часта прыймаюць проста нечаканы паварот – пэўна дзеля таго, каб заглушыць той страх, які жыве ў душы дзяцей. Вельмі страшна пайсьці ў цёмную камору, куды не прабіваецца нават праменьчык сьвятла, але хіба не страшней расказаць маме пра разьбітую вазу? Гэта патрабуе вялікай сьмеласьці. «Я так баюся, калі мама на мяне крычыць». Дзеці застаюцца адныя са сваімі страхамі – з сярэдзіны ідзе шкадаваньне і пачуцьцё віны за зробленае, звонку – маміныя пагрозы. У дадзенай сітуацыі ёсьць два выйсьця – прызнаць сваю віну, падпарадкавацца, альбо не падпарадкавацца, што вядзе да жорсткасьці абодвух бакоў. Але ніводны з абодвух варыянтаў не дае дзецям магчымасьці асэнсаваць сваю віну і выправіць зробленае.

Дзеці могуць быць сьмелымі – тады калі мама дае ім шанц выправіць шкоду, калі каля іх ёсьць людзі, якія вераць ім і падтрымліваюць іх у самую адказную хвіліну. «Я павінны быць сьмелым, як дзесяць індэйцаў». І Элізабэт не бяжыць паклёпнічаць і даносіць, а кажа: «Я патрымаю за цябе кулакі».

Ня нейкая чужая вымова ці спасылка на нормы паводзінаў кіруюць Якабам у выпраўленьні шкоды, а ягонае ўнутранае асэнсаваньне, што ён не хацеў рабіць гэтага. І таму ягоны першы крок да прымірэньня – гэта ня шлях у Каноссу, поўны пакорлівасьці, а крок да прымірэньня, у якое ўжо сам Якаб можа таксама ўнесьці свой уклад: «Я дапамагу табе выцерці падлогу».

Падчас інсцэніроўкі гэтай гісторыі, напэўна, нехта з дзяцей скажа: «Так, калі мы гэта інсцэніруем, дык вельмі

проста падыйсьці і папрасіць прабачэньня, але чаму ў сапраўдным жыцьці гэта даецца нашмат цяжэй?» Напэўна, таму, што дзецям проста не хапае сьмеласьці. Ім патрэбныя такія бацькі, якія вераць ім і ўмеюць прабачаць. І, у адпаведнасьці з боскім запаветам аб прымірэньні і прабачэньні, у чалавека заўсёды павінна заставацца права і магчымасьць навяртаньня і пакаяньня.

Заўтра я зноў пайду яго шукаць
Бог у нашым жыцьці

На фармаваньне дзіцячых уяўленьняў пра Бога накладае свой адбітак характар адносінаў паміж бацькамі і дзецьмі, таму што мадэль гэтых адносінаў пераносіцца на адпаведныя чаканьні ў адносінах да Бога. Калі гэта сям'я патрыярхальнага складу, тады Бога дзеці ўяўляюць як патрыярха, ад якога залежыць усё, і які патрабуе безумоўнага падпарадкаваньня. Калі дзецям не хапае, ці ў іх у недастатковай ступені разьвітае пачуцьцё ўласнай годнасьці, тады гэтыя адносіны паміж дзецьмі і Богам вызначаюцца пачуцьцём віны і боязьзю перад пакараньнем. Згодна з гэтым, Бог пагражае, а не аказвае жыцьцясьцьвярджальнага ўзьдзеяньня.

Спасылкі на Божачку, які толькі і робіць, як прыдумвае новыя пакараньні для грэшнікаў, якія пацьвярджаюцца словамі тыпа: «Цяпер Божачка злуецца, Яму гэта не падабаецца», разам з недастаткова разьвітым падставовым даверам, спрыяюць толькі большай боязі з боку дзяцей.

І зусім іншая справа, калі выхавальнікі пазьбягаюць выклікаць у душах дзяцей такія пачуцьці, а ўмацоўваюць іх пачуцьцё ўласнай годнасьці і імнуцца данесьці да іх, што Бог – гэта той, каму можна бясконца давяраць і на каго заўсёды можна спадзявацца.

Дзеці, асноўныя патрэбы якіх у любові, прызнаньні, пяшчоце не задавальняюцца, якія цалкам падаўляюцца залішне суровым выхаваньнем бацькоў у такой самай ступені, як і тыя, хто выхоўваецца расьпешчаным і не навучыўся адмаўляцца ад сваіх жаданьняў, схільны да канцэнтраваньня толькі на сваіх уласных патрэбах. І калі бацькі ўвесь час кажуць пра Божачку, які нам заўсёды і паўсюль дапамае, дык можна ўявіць сабе Божачку як хлопчыка на пасылках, асноўнае прызначэньне якога – выконваць усе нашыя пажаданьні. Як вынік, такія дзеці аказваюцца няздольнымі да самаахвярнасьці і ня ўмеюць усталёўваць адносіны з іншымі людзьмі.

І наадварот, выхаваньне, якое не засяроджвае увагу на падарунках, атрыманых ад Бога, якое спрыяе разьвіццю пачуццяў адказнасьці, самакрытычнасьці і самаадданасьці, дазваляе дзецям зразумець, што Бог – гэта мера і прыклад нашых паводзінаў, у першую чаргу любові да нашых бліжніх. Нельга дазваляць дзецям ускладаць пэўныя матэрыяльныя чаканьні на Бога, які нібыта чароўная палачка павінен іх выконваць, таму што тады на сьвет зьяўляецца малітва-просьба і ўмацоўваюцца «дзелавыя адносіны» з Богам, якія ў больш сталым узросьце могуць быць разарваныя дзеля недахопу «матэрыяльных дабротаў».

Малітва-просьба – гэта хутчэй адкрыты і поўны даверу дыялог, у якім дзеці могуць выказаць усе свае турботы, страхі, расчараваньні, пажаданьні і просьбы Божачку пра сілу, сьмеласьць, разважнасьць, сапраўдны дух.

У той самы час, чым больш вузкім і абмежаваным будзе ўяўленьне пра Божачку, тым большай будзе небясьпека таго, што які-небудзь асьпект нашага ўяўленьня будзе ўзьведзены да абсалюта: «Бог-суддзя» «Любы Божачка» і г.д. Напрыклад, апошняе скажэньне да «Любага Божачкі» – гэта ні што іншае, як адваротны бок тугі па абароненасьці, па

незямным сьвеце, дзе заўсёды сьветла і радасна. Пры гэтым забываецца, што Бог ня проста любы і мілы, але ёсьць рэчы боскай сутнасьці, якія вельмі цяжка зразумець. І таму трэба імкнуцца, каб дзіцячыя ўяўленьні пра Бога-Айца, Бога-Сына, Сьвятога Духа былі поўнымі і асэнсаванымі.

Цяпер засталося яшчэ адно пытаньне – калі трэба пачынаць расказваць дзецям пра Ісуса? Найбольш мэтазгодна было б пачынаць гутаркі тады, калі дзеці ўжо маюць нейкі рэлігійны вопыт. Гаворачы словамі Бернхарда Грома, гэта павінны быць «удзячнасьць, давер і любоў да сваіх блізкіх». І далей, што датычыцца асобы Ісуса: «Ісус мае для нас вырашальнае значэньне, дзякуючы сваім адносінам да Бога-Айца, якога Ён называў «абба» («татачка»). І таму дзяцей спачатку трэба пазнаёміць з Богам-Айцом і толькі потым падводзіць да знаёмства з Ісусам, нашым прыкладам братэрскіх адносінаў да людзей, удзячнасьці... і даверу да нашых блізкіх».

Калі мы пачынаем расказваць пра Ісуса, у цэнтры нашай увагі павінен знаходзіцца не немаўлятка Ісус, не Ісус, які рабіў цуды, не Ісус-пакутнік альбо прыкладны хлопчык – не, мы павінны пачынаць з Ісуса-чалавека, які паходзіў з Назарэту. Адзінства Сына і Бога-Айца павінна тлумачыцца дзецям у адпаведнасьці з іх узростам, як і тое, што Ісус-чалавек адначасова зьяўляецца Сынам Божым.

Падзел Бога-Айца і Бога-Сына можа ўнесьці блытаніну ў дзіцячае разуменьне сутнасьці Бога і, як вынік, можа ўзьнікнуць «трохбожжа». Гэты момант патрабуе свайго дакладнага тлумачэньня, і трэба імкнуцца, каб Ісус служыў нам прыкладам любові да Бога-Айца, які, у сваю чаргу, адорвае нас сваім Сьвятым Духам.

На шматбаковасьць успрыманьня вобраза Ісуса ўказваў Вальтэр Кэтлер: Ісус сьмяецца і гневаецца, Ісус стомлены і ў смутку, Ісус плача і баіцца. Але Ён таксама можа быць вясёлым, сьмелым і пяшчотным, і таксама можа адчуваць

сябе бяздомным, калі ня мае свайго кутка. Калі дзеці зразумеюць, што Ісус быў чалавекам, хадзіў па зямлі, тады ня трэба будзе баяцца, што вобраз Бога закасьцянее ў сваёй «боскай» сутнасьці.

Якаб чакае Божага Нараджэньня

(На стале ў дзіцячым пакоі ляжыць вяночак з хвоі, упрыгожаны чатырма сьвечкамі. Гарыць адна сьвечка, уся сям'я сядзіць за сталом. Элізабэт грае на флейце.)

Тата: Які прыгожы вяночак.

Мама: Мы з Элізабэт яго зрабілі, а Якаб упрыгожыў.

Элізабэт: (Грае на флейце)

Якаб: Я так люблю глядзець, як гараць сьвечкі. У наступную нядзелю будзе гарэць ужо дзьве свечкі, потым – тры, потым – усе чатыры. Мамачка, чаму Божага Нараджэньня трэба так доўга чакаць – аж цэлых чатыры сьвечкі?

Мама: Усё самае лепшае, самае прыгожае трэба доўга чакаць, Якаб. Таму што яму патрэбны час, каб вырасьці і дасьпець. Напрыклад, кветцы. Пакуль з маленькай цыбулінкі вырасьце прыгожы гіяцынт, пройдуць тыдні.

Тата: А пакуль на яблыньцы высьпеюць першыя яблычкі, трэба чакаць яшчэ больш, некалькі гадоў.

Мама: Дзіцятку таксама патрэбны час, пакуль яно народзіцца на сьвет. Яно пачынае расьці з маленькай клетачкі, і толькі тады, калі яно дастаткова вырасьце, можа нарадзіцца.

Элізабэт: (Наігрывае на флейце мелодыю «Марыя ішла праз цярновы лес»)

Мама: Тады, шмат гадоў таму, калі яшчэ не было Божа-

га Нараджэньня, людзі вельмі чакалі нараджэньня дзіцяткі Ісуса. Калі Ён нарэшце прыйдзе, – пыталіся яны. Марыя таксама шмат месяцаў павінна была чакаць, пакуль народзіць Ісуса.

Якаб: І Ён нарадзіўся ў хляве, у яслях, і побач стаялі аслікі і быкі і глядзелі на яго...

Элізабэт: (Грае далей.)

Якаб: Мамачка, я хачу нешта спытаць. Ты таксама столькі чакала, пакуль я нарадзіўся, як і Марыя, пакуль нарадзіўся Ісус?

Мама: Так. Мы з татам чакалі дзевяць месяцаў.

Элізабэт: Я таксама цябе чакала, Якаб.

Якаб: І вы вельмі цешыліся, калі я зьявіўся?

Мама: Так. Мы вельмі гэтаму цешыліся.

Якаб: (Глядзіць на сьвечку) Чакаць разам з іншымі – гэта ня так страшна.

Якаб чакае Божага Нараджэньня

Напэўна, мамы і таты вельмі часта чуюць ад сваіх дзяцей аднолькавае пытаньне: «Колькі яшчэ трэба чакаць? Колькі дзён (начэй) застаецца?» Чаканьне само па сабе даецца вельмі цяжка, а калі браць пад увагу час, у якім мы жывем, дык гэта, часам, здаецца проста немагчымым і непатрэбным. Сам склад еўрапейскага жыцьця скіраваны на задавальненьне жаданьняў у той самы момант, калі яны зьяўляюцца. Навошта чакаць на тое, што можна атрымаць сёньня? Пры гэтым нікога не хвалюе, колькі рэсурсаў застаецца для будучых пакаленьняў – праблема толькі ў тым, каб вызначыць, колькі чаго мне спатрэбіцца для задавальненьня маіх наяўных і будучых патрэбаў.

Усе накірункі развіцьця грамадства сьведчаць пра імкненьне як мага болей скараціць час чаканьня. І таму перад

выхавальнікамі паўстае складаная задача, як у гэтых абставінах закласьці дзецям разуменьне паняцьця «чаканьне» – «прадчаканьне».

Цяжарная жанчына ня проста чакае, пакуль народзіцца яе дзіця, але яна жыве ў прадчаканьні гэтага. І гэты час падрыхтоўкі да зьяўленьня немаўляці поўны для яе надзеяў, мараў і прадчуваньняў. У нашым штодзённым жыцьці слова «чакаць» азначае «бавіць час, займацца чым-небудзь». Прадчаканьне азначае прыхаваную напружанасьць і сканцэнтраванасьць. Таму час вялікага посту мы называем часам прадчаканьня.

Усё гэта вельмі добра разумелі айцы царквы, калі перад вялікімі сьвятамі ўстанаўлівалі пасты – час падрыхтоўкі і малітваў. Гэты час ськіраваны не на самабічаваньне, а на тую вялікую радасьць, што нясе нам Божае Нараджэньне альбо Вялікдзень. Гэта час да асэнсаваньня жыцьця, ягоных вынікаў, адносінаў паміж людзьмі, асэнсаваньне ахвяры Бога, таго, што па боскіх задумах, павінен быў данесьці да людзей Ісус.

«Чакаць разам з іншымі ня так страшна», – заўважае Якаб. Вядома, як духоўна ўзбагачае дзяцей час агульнай падрыхтоўкі да сьвятаў. Менавіта таму расклад рэлігійных сьвятаў і пастоў мае важнае значэньне ў рэлігійным выхаваньні, і толькі яны дапамагаюць пераўтварыць час чаканьня ў час прадчаканьня. Што і зьяўляецца сутнасьцю нашага жыцьця.

Звон

(У дзіцячым пакоі. Якаб гуляе са сваім караблём, Элізабэт – з лялькамі.)

Якаб: Бачыш, які ў мяне добры карабель. Ту-уууууу!

Элізабэт: Што гэта, Якаб?

Якаб: Гэта калі карабель заходзіць у гавань, дык дае сігнал, каб усе ведалі, што ён вярнуўся. Ту-уууу (Звоніць тэлефон) Элізабэт, падыйдзі да тэлефона!

Элізабэт: Мог бы і ты калі-некалі падысьці, Якаб! (Ідзе да тэлефона.)

Якаб: Я гуляю... Але цяпер можна пагуляць і ў тэлефон. Дзы-ыыыынь. Нікога няма. Дзы-дзынь-дзынь – цяпер занята.

Элізабэт: (Вяртаецца) Цётка Штэфі званіла. Пыталася, ці прыйдзем мы да яе ў нядзелю.

Якаб: Мы з табою?

Элізабэт: Так. Разам з мамаю і татам. І яшчэ яна сказала, каб мы ёй патэлефанавалі і заказалі дэсерт. Што б ты хацеў, Якаб?

Якаб: Клубнічны пудзінг, зразумела. Дзынь-дзынь. Алё? Алё? Калі ласка, клубнічны пудзінг, цётка Штэфі. Шплік. Ту-тууууу-дзынь –дзыыыыыынь.

Элізабэт: Што гэта яшчэ такое?

Якаб: Гэта калі карабель і тэлефон размаўляюць паміж сабою.

Элізабэт: Хопіць, Якаб!

(Званок у дзьверы)

Якаб: Нехта звоніць. Ідзі паглядзі, хто там.

Элізабэт: (Выглядае з вакна) Лістаносец! (Выбягае)

Якаб: Цяпер пагуляем у лістаносца. Дзінь-дзінь. Калі ласка, адчыніце – ніхто не адчыняе. Дзінь-дзінь – напэўна, нікога няма дома.

Элізабэт: Тэрміновы ліст для таты.

Якаб: Ведаеш, у Каці на дзьвярах званок зьвініць так: дзэнь-дзэнь-дзэнь, а ў цёткі Штэфі: бі-бі-бі.

Элізабэт: Вой, як сьмешна (З вуліцы чуваць, як пачынае

званіць царкоўны звон.)

Якаб: Што гэта?

Элізабэт: Гэта царкоўны звон – ён заўсёды пачынае званіць перад службай.

Якаб: Ага. Бім-бам, бім-бам, бім-бам. Увага-увага!

Элізабэт: Але не, Якаб, гэта табе не які-небудзь гучнагаварыльнік. Гэты звон кажа табе нешта іншае.

Якаб: Што ён кажа?

Элізабэт: Гэты звон кажа: Прывітаньне ад Божачкі! Ён думае пра цябе!

Якаб: Ён сапраўды так кажа?

Элізабэт: Ты толькі прыслухайся!

Якаб: Я пайду тады ў сад – адтуль лепей чуваць.

(Стаіць у садзе і прыслухоўваецца, як гучыць звон.)

Якаб: Прывітаньне табе таксама, Божачка!

Звон

У нашым штодзённым жыцьці нам на кожным кроку трапляюць хрысьціянскія сімвалы: малюнкі, скульптуры, крыжы пры дарозе, цэрквы і царкоўны звон, які мы чуем з раніцы і ў вечары. Гэтыя сімвалы выразаныя ў дрэве, застылі ў камяні, выявіліся ў музыцы – яны даносяць да нас веру, што ўвайшла ў нашае жыцьцё і стала з ім непарыўнай. Яны сустракаюць нас кожны дзень і дапамагаюць разумець жыцьцё ў сьвеце веры. У кожнай дэталі адбілася жыцьцё і вопыт мінулых стагоддзяў і пакаленьняў.

Ня ўсё з гэтай спадчыны даступнае нашаму разуменьню. І не таму, што этычныя і эстэтычныя нормы сталі іншымі. Вельмі часта літаратурныя творы апавядаюць пра войны, крывавыя прысуды іншаверцам, жорсткія і жахлівыя падзеі, якія выклікаліся эгаістычнымі памкненьнямі тых ці іншых

асобаў. Усё гэта павінна падштурхнуць нас да разуменьня таго, што ствараць жыцьцё трэба па боскіх запаветах, на боскіх прынцыпах – таму што «Бог заўсёды побач з намі».

Каб даць зразумець гэта дзецям, выхавальнікі павінныя адказваць на ўсе іхнія пытаньні, якія распачынаюць размову пра нашую спадчыну: хто і што намаляваныя на карціне, чыя гэта статуя, што гэта за звычай і калі, з якой прычыны, ён зьявіўся. Вельмі важна праводзіць паралель і знаходзіць сувязь паміж тым, пра што апавядаецца дзецям, і іх штодзённым жыцьцём, каб гэтая атрыманая інфармацыя не засталася ляжаць мёртвым грузам, альбо забылася, каб яна магла асэнсоўвацца і зьвязвацца з назапашаным вопытам.

У нашай гісторыі мы далі некалькі прыкладаў таго, што ўсе розныя гукі маюць адзіную мэту: прыцягнуць увагу людзей, усталяваць кантакт. І калі кожны з нас прыслухаецца, дык гэты кантакт атрымаецца. Толькі так можна зразумець, што нам хоча данесьці царкоўны звон, калі мы чуем ягоныя гукі: «Прывітаньне ад Божачкі. Ён думае пра цябе». Дзеці, якія пачуюць і зразумеюць гэтыя словы, адказваюць вельмі проста, як самую простую малітву: «Прывітаньне Табе таксама, Божачка!»

Якаб шукае Божачку

(Дзіцячы пакой. Элізабэт чытае Якабу кнігу.)

Якаб: Прачытай яшчэ раз гэты сказ.

Элізабэт: Пра Божачку?

Якаб: Так.

Элізабэт: Бог паўсюль. Нават калі я іду цёмнай ноччу, Бог разам са мною...

Якаб: Пра цёмную ноч мне ня трэба. Тое, што перад гэтым.

Элізабэт: Бог паўсюль.

Якаб: Бог паўсюль – як ты думаеш, Элізабэт, гэта сапраўды так?

Элізабэт: Мне здаецца, што так.

Якаб: Бог паўсюль... (Ускоквае) Тады я пайду Яго шукаць.

Элізабэт: Куды ты пойдзеш?

Якаб: Я пайду шукаць Божачку.

Элізабэт: Але, Якаб, Божачку нельга ўбачыць.

Якаб: Я ўсюды пагляджу. Калі Ён ёсьць паўсюль, дык я павінен Яго знайсьці... (Выходзіць)

(У садзе. Якаб пераходзіць ад адной кветкі да іншай, ад аднаго куста да другога і пільна ўглядаецца. Побач пралятае матылёк)

Якаб: Прывітаньне, матылёк.
(Разглядае дрэва) Ты такое прыгожае, дрэва (птушачка пераскоквае з галінкі на галінку і шчабеча) Ага, гэта ты пяеш. Прывітаньне, птушачка. Нехта яшчэ там варушыцца паміж галінак – вось яна, гэта мышка. Якая міленькая. Прывітаньне, ня бойся мяне. Куды ж ты пабегла? (Ідзе праз сад і раптам чуе, як недзе зьвініць піла) Што гэта? Нехта пілуе дровы... У суседнім садзе – можа гэта ў пані Свабоды?
(Бачна, як тата ў садзе пані Свабоды пілуе дровы і гучна сапіць.)

Якаб: А, гэта ты тата! І што гэта ты тут робіш?

Тата: Пілую. Як бачыш. Пілую дровы для пані Свабоды. Але з гэтаю пілою... бачыш, тут патрэбна, каб было два чалавекі.

Якаб: Я таксама хачу паспрабаваць папілаваць. Можна мне?

Тата: Калі ласка, можаш паспрабаваць.

Якаб: Ра-ааз...

Элізабэт: (Зьяўляецца ў вакне) Дзе гэта Якаб падзеўся... Колькі можна чакаць... Якаб! Якаб!

Якаб: Не крычы, я ўжо іду.

Элізабэт: Я павінна хвалявацца за цябе, што ты недзе зьнік.

Якаб: Я хадзіў шукаць Божачку.

Элізабэт: Ужо чула. І ты знайшоў Яго?

Якаб: Гм. Ня ведаю. (Павольна ўздымаецца па прыступках) Але гэта так цікава хадзіць Яго шукаць. Заўтра я зноў пайду.

Якаб шукае Божачку

Бог – гэта не цагліна, існаваньне якой можна заўважыць толькі калі спатыкнешся аб яе, Бога нельга ўбачыць і дакрануцца да Яго рукамі. Адчуць прысутнасьць Бога можа той, хто ўмее бачыць і слухаць, хто можа адарвацца ад марных зямных справаў і ўзьняць вочы да неба, і забыць пра марнасьць зямнога жыцьця. Бог адкрываецца таму, хто як Ізраэль гатовы ўзьняцца і рушыць у абетаваную краіну. Не туга па старых залатых стагоддзях, што адышлі ў нябыт, па сьвятой прастаце, а далягляды і шляхі ў будучыню вядуць да Бога Абрагама, Ісака і Якава, Бога нашых продкаў. Ён заўсёды ўперадзе нас – а мы ўсё сваё зямное жыцьцё ідзем да Яго. Нам прызначана дзень за днём, год за годам, усё жыцьцё адкрываць і адчуваць прысутнасьць Бога. І ўся гісторыя гэтага сьвету і людзей сьведчыць пра Яго блізкасьць да нас і знаходжаньне паміж намі.

«Дзе жыве Бог?» – на гэтае пытаньне можна толькі адказаць «ня ведаю». Якаб ведае гэты адказ таксама, але пошукі Божачкі адкрываюць яму вочы на прыгажосьць навакольнага сьвету. І таму ён кажа ў канцы: «Але гэта было так

цікава Яго шукаць. Заўтра я зноў пайду.» Гэтая гісторыя заканчвае нашыя размовы пра рэлігійнае выхаваньне. Але яна, гісторыя пра пошукі Бога, – гэта пачатак гісторыі кожнага чалавека пра асэнсаваньне, разуменьне і адчуваньне веры ў Бога Ісуса Хрыста.

Якаб на свой уласны страх і рызыку пачынае пошукі Божачкі. Для яго Бог яшчэ ня стаў неабходнай, натуральнай часткай жыцьця. У гэтым сэнсе мэтаю рэлігійнага выхаваньня зьяўляецца выхаваньне трапяткога, жывога ўспрыманьня Бога. Але само рэлігійнае выхаваньне будзе мець фатальныя вынікі, калі станаўленьню маленькіх дзяцей ня будзе спрыяць адпаведная сямейная атмасфера. Для Якаба было б вельмі важна мець спадарожніка, з якім ён мог бы дзяліцца сваімі ўражаньнямі і сваім вопытам. Ці могуць бацькі стаць такімі спадарожнікамі для сваіх дзяцей? Вядома, могуць, калі яны разам крочаць па жыцьці, ствараюць сваю будучыню, калі яны разам са сваімі дзецьмі мараць і складаюць малітвы да Бога.

Кнігі Ленэ Маер-Скуманц, выдадзенныя ў выдавецтве Беларускай Каталіцкай Грамады

1. Ленэ Маер-Скуманц «Калі Ты так думаеш, Божачка...»

Ксаверык сябруе з вінаградарам, чысьціць курнік, бароніць Тоніка ад Рудога, ходзіць у госьці да старой пякаркі, а таксама размаўляе з Божачкам...

Усе гэтыя ды іншыя цікавыя гісторыі, складзеныя вядомай аўстрыйскай дзіцячай аўтаркай Ленэ Маер-Скуманц, можна прачытаць у гэтай кнізе.

Апавяданьні для дзяцей 7-10 год, а таксама для іх бацькоў.

2. Ленэ Маер-Скуманц «Якаб і Катарына»

Жыцьцё Якаба і Катарыны дома і ў школе, іхнія штодзённыя стасункі са сьветам і Божачкам, сьмешныя і павучальныя выпадкі, канфлікты і сьвяты, развагі і розныя думкі дзяцей цікава паказаныя аўтаркай у гэтай кнізе.

Апавяданьні для дзяцей 7-10 год ды іхніх бацькоў.

Рэдактар *Алесь Бяляцкі*

Падпісана да друку 7.07.97 г.
Фармат 60x84 1/16. Друк афсэтны
Наклад 8500. Аб'ём 4,83 друк. арк. Зак. 27

Беларуская Каталіцкая Грамада
220113, Менск, вул. Усходняя, 54-213. Ліцэнзія ЛВ 642

Надрукавана: Białystok, Drukarnia "Alfa".